Літ ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

13 ЛЮТАГА 2004 г. № 7/4244

АНОНС!

Набліжаецца 60-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Установа «Літаратура і Мастацтва» праводзіць агульнанацыянальную акцыю па стварэнні кнігі «Наша Перамога». Запрашаем усіх, хто зацікаўлены, да супрацоўніцтва.

"Нашчадкі скарынаўскай справы" — артыкул Алеся Гаўрона аб праблемах выжывання прыватных выдавецтваў. *(Працяг. Пачатак у № 4)*

Навокал снег і вецер,
І мы з табой адны
У гэтым белым свеце
На сцежцы да вясны.

І ўсмешкаю крылатай
Ты асвятляеш дзень.
І на душы ў нас свята,
Як сонечны прамень.

Святому Валянціну
Мы ўдзячныя з табой
За кожную хвіліну
У светлыні зямной...

ФОТА К. ДРОБАВА

ВІНШАВАЛІ КАЛІНОЎСКАГА

Першы вечар X Міжнароднага джазавага фестывалю, што нядаўна прайшоў у Мінску, быў асабліва ўрачысты. Міністр культуры краіны Л. Гуляка, які ўдзельнічаў у адкрыцці гэтага традыцыйнага зімовага музычнага свята, выканаў пачэсную місію і ўручыў артысту Дзяржаўнага канцэртнага аркестра Беларусі А. Каліноўскаму знак афіцыйнага прызнання яго заслуг у творчасці. Указам Прэзідэнта РБ Аляксандр Каліноўскі адзначаны званнем "Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь" — за значны ўклад у беларускае музычнае мастацтва, высокае выканальніцкае майстэрства.

Дарэчы, ён, вядомы гітарыст, аранжыроўшчык, стваральнік арыгінальных джазавых кампазіцый, неаднойчы саліраваў у праграме таго вечара. Публіка зноў і зноў пераконвалася ў класнасці музыканта, шчодра ганаравала яго апладысментамі.

НА ЗДЫМКУ: заслужаны артыст Беларусі А. КАЛІНОЎСКІ.

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА

У АТАЧЭННІ АБРАЗОЎ

З 6 лютага па 18 сакавіка па пятніцах, а 18-й гадзіне, у сталіцы ладкуюцца адмысловыя канцэрты духоўнай музыкі. Адбываюцца яны ў Нацыянальным мастацкім музеі РБ, у межах выстаўкі "Іканапіс Беларусі XXI стагоддзя".

Сёння, 13 лютага, выступае хор праваслаўнага брацтва ў імя Архістратыга Божага Міхаіла храма Прасвятой Багародзіцы, што ў Крупцах (Мінск, кіраўнік Алена Дзіхціеўская). 20-га — хор Духоўнага вучылішча пры Мінскім епархіяльным упраўленні (кіраўнік — лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне" Таіса Міронава). На афішы 27-га — назва хору "Cantus" сталічнай ДМШ № 9 (кір. Ірына Вараб'ёва).

У сакавіку мае адбыцца яшчэ тры канцэрты. 5-га спявае мінскі Маладзёжны хор Св. Петра-Паўлаўскага сабора (кір. Наталля Мядзведзь). На 12-га замоўлена выступленне ансамбля "Согласие" храма Нараджэння Прасвятой Багародзіцы в.Тарасава (кір. Галіна Шумік). І 18 сакавіка, у дзень закрыцця выстаўкі іканапісу, можна будзе паслухаць хор сталічнага храма ў гонар св. Іова Шматпакутнага і Дома Міласэрнасці (кір. м. Людміла Поўная).

5 лютага адбылося чарговае пасяджэнне літаратурнага аб'яднання-семінара "Літквартал". Як заўсёды на ім прысутнічалі студэнты ВНУ, навучэнцы каледжаў, старшакласнікі, словам, моладзь, якая спрабуе свае сілы ў творчасці. Былі абмеркаваны новыя паэтычныя творы, проза, свае думкі наконт пачутага выказалі кіраўнікі "Літаратурнага квартала". Перад прысутнымі выступіў паэт, наш зямляк з Даўгаўпілса Станіслаў Валодзька. Ён падзяліўся сваім бачаннем творчага працэсу як у Беларусі, так і ў Латвіі.

Пасяджэнні літаб'яднання-семінара "Літквартал" адбываюцца кожны чацвер у 18 гадзін у памяшканні Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва", Захарава, 19. Тэл. 284-66-73.

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

З новага года максімальна скарочана паступленне "ЛіМа" ў розніцу. Адзіная магчымасць застацца нашымі чытачамі — падпісацца на газету!

Кошт індывідуальнай падпіскі:
(Індэкс — 63856)
на 1 месяц — 2600 рублёў;
на 3 месяцы — 7800 рублёў.

Кошт ведамаснай падпіскі:
(Індэкс — 63857)
на 1 месяц — 4100 рублёў;
на 3 месяцы — 12300 рублёў.

ПРАЗ "ПОЛЫМЯ"...

Нехта сказаў, што літаратура з'яўляецца сненнем, якім можна кіраваць. Чалавек часта імкнецца да асэнсавання і тлумачэння сноў.

З мэтай асэнсавання сучаснай літаратуры, яе мастацкай сутнасці і ролі ў грамадскім жыцці 30 студзеня ў памяшканні Інстытута літаратуры НАН Беларусі сабраліся разам навукоўцы і пісьменнікі — супрацоўнікі рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва": дырэктар холдынга Таіса Бондар, галоўны рэдактар часопіса "Маладосць" Раіса Баравікова, галоўны рэдактар часопіса "Нёман" Ніна Чайка, рэдакцыя часопіса "Полымя" на чале з Міколам Мятліцкім і многія іншыя. Тэмай пасяджэння было абмеркаванне і агляд "Полымя" за 2003 год.

Забягаючы наперад, можна сказаць, што гэта першая спроба такога аналітычна-творчага супрацоўніцтва, праведзенага ў форме нязмушанай прыязнай гаворкі, несумненна, аказалася карыснай для абодвух бакоў, мае станоўчыя вынікі, будзе мець плён і далейшы працяг.

Адкрываючы пасяджэнне, дырэктар Інстытута літаратуры **Уладзімір Гніламёдаў** успомніў даўнюю і дарэмна пакінутую традыцыю сяброўскіх сустрэч літаратуразнаўцаў з пісьменнікамі: гасцямі інстытута калісьці былі У.Караткевіч, І. Мележ, М. Стральцоў, І. Чыгрынаў, Я. Брыль. *"А ці можа быць большая раскоша за добрую сяброўскую гаворку, за абмеркаванне кнігі. І для літаратуразнаўца і для пісьменніка гэта вельмі карысна"*, — слушна заўважыў У. Гніламёдаў.

Рэдактар часопіса "Полымя" **Мікола Мятліцкі** адзначыў, што падобныя сустрэчы даюць магчымасць па-сапраўднаму адчуць пульс літаратуры, робяць больш трывалым падмурак агульнага літаратурнага дома. Далей М. Мятліцкі, трымаючы свайго роду справаздачу, сказаў наступнае:

"Аналізуючы мінулы 2003 год, хацелася б падкрэсліць тое, што ўдалося ў гэтым духоўным рэзруху ўтрымаць хоць напалову нашы каштоўнасці, абараніць іх ад многіх спакус. "Полымя" і павінна рабіць гэта больш выразна, тады як "Маладосць" мае права на эксперымент.

Увогуле, я з асцярогай гляджу на філалагічнае пакаленне, якое кінулася ў гульні, забыўшы, што літаратуру ствараюць духоўна чыстыя асобы. Менавіта гэтым прынцыпам мы кіраваліся, калі адбіралі творы дванаццаці аўтараў для "Палымянскага дэбюту". Парадавала і здзівіла тое, што ёсць таленавітыя нефілолагі — студэнты іншых навучальных устаноў, якія па-сапраўднаму горнуцца да літаратуры.

Тая элітарнасць, якая была ў "Полымя", была апраўдана, таму што пакаленне, якое сёння зрабіла ў літаратуры вельмі многае, несла адказную ношу літаратурнага працэсу. Але мы не павінны забывацца на маладых і даваць ім магчымасць далейшага росту. Наш часопіс вельмі адказна ставіцца да гэтага і часам мы даём паслабку нашым аўтарам. Аднак не мы пішам літаратуру — мы яе ілюструем. І нам бы хацелася больш дасканалых мастацкіх твораў, але мы даём у пэўным сэнсе аванс, дзеля таго, каб літаратура набрала дыханне, стала паўнакроўнай.

Часта задаюць пытанне аб цэнзуры. Сёння адна цэнзура — мараль і сумленне. Я ўпэўнены, што прафесійны пісьменнік ніколі не апусціцца да банальнасці і вычурнасці, не стане на бульварныя пазіцыі, не створыць нізкапробныя творы, якімі, дарэчы, ізабілуе сёння наш кніжны рынак, праўда, — і гэта радуе, — што не ў беларускай літаратуры. Таму мы павінны пакланіцца нашай літаратуры за тое, што нашы пісьменнікі ў бальшыні сваёй не спакусіліся на гэту таннасць.

Калі гаварыць канкрэтна, то шэсць раманаў, якія выйшлі ў "Полымі" ў 2003 годзе,— гэта немалы плён. Асабіста для мяне стаў адкрыццём раман Уладзіміра Гніламёдава "Усход", таму што гэта тыя старонкі нашай гісторыі, пра якія сёння дасюль яшчэ ніхто не гаварыў (рух напярэдадні Першай сусветнай вайны). Гэта наша нацыянальная памяць.

З вялікім хваляваннем прачытаў раман Алеся Савіцкага "Пісьмо ў Рай" і ведаю, што права на такі твор меў толькі аўтар, які сам абараняў гэтую зямлю і які сёння абараняе яе ад вандалізму. Такая літаратура — гэта абарончая зброя чалавечнасці. І ў "Полымі" такіх твораў многа.

Завяршыўся год першай часткай рамана Віктара Праўдзіна "Нелюбімыя гінуць". Лічу гэты твор вельмі сур'ёзным. Гэта наша жывая сучаснасць.

Шчыра парадаваўся першым крокам Алены Брава і Ніны Рыбік...

На жаль, не ўсё задуманае ўдалося зрабіць у мінулым годзе. Але гэта не ўдалося не толькі нам, а і ўсёй нашай літаратуры, якая знаходзіцца зараз у стане разгубленасці і пісьменнікі адчуваюць сябе незапатрабаванымі.

Сёння не вельмі спрыяльныя ўмовы з падпіскай і, больш таго, чуюцца такія галасы, нават сярод пісьменнікаў, што часопісы сябе як бы вычарпалі. Творы тых, хто хоча сур'ёзна ісці ў літаратуру, будуць ісці да чытача на першую сваю сустрэчу са старонак часопісаў, а потым ужо стануць кнігамі".

Часопіс "Полымя" прадстаўляе на сваіх старонках асноўныя літаратурныя жанры. Аналіз яго публікацый таксама меў жанрава-тэматычны падзел.

Васіль Жураўлёў засяродзіўся на міфалагічнай і сімволіка-алегарычнай тэндэнцыі, уласцівай палымянскай прозе (гэта фантасмагорыя Таісы Бондар "Пусты п'едэстал", Анатоля Бароўскага "Спакушэнне", раман Зінаіды Дудзюк "Кола Сварога" і інш.). Даследчык адзначыў, што такая літаратура *"Уключае не толькі духоўныя фактары, але і эканамічныя і дзяржаўныя спектры".*

У чым плюсы і мінусы сімвалічна-алегарычнай тэндэнцыі? Найбольш значным яму бачыцца шырокая пастаноўка філасофскай праблематыкі і палеміка з ранейшай прозай мележаўскага стылю. Мінусы — у паўтарэнні Оруэла і Маркеса, у агульнай сюжэтнай схематызацыі. Хацелася б большай шырыні і шматфарбнасці думкі.

Між іншым В.Жураўлёў сказаў, што яму вельмі спадабалася лімаўская дыскусія Таццяны Андрэйчанкі і Леаніда Галубовіча наконт рамана А.Наварыча "Літоўскі воўк". А, што датычыць сустрэчы з "Полымем", то, на яго думку, яна вельмі патрэбная і неабходная. *"Зараз сапраўды складаны час, калі хуткацечнае і вечнае знаходзяцца ў такіх стасунках, што адно спрабуе выцесніць другое. Мастацкая літаратура павінна рабіць так, каб у гэтым дыялогу была разумная і мудрая аснова, суразмоўнасць".*

"Якая літаратура, такія і кнігі,— адзначыў **Серафім Андраюк**, — *і калі з гэтай крытычнай пазіцыі падысці да часопіса, то не вазьму на сябе смеласць сказаць, што там змешчаны выдатныя творы. Але ж у самой літаратуры дзе яны — такія, як "Людзі на балоце", "Трэцяя ракета", "Каласы пад сярпом тваім"? Я такіх не назаву. У гэтым сэнсе часопіс сапраўды адлюстроўвае літаратурны працэс — тое, што робіцца ў літаратуры. Таму галоўнае пажаданне — спакойна ісці насустрач адзін аднаму, прыцягваць і пашыраць кола літаратараў. Гэта, канечне, не проста".*

І на самай справе мы часта хвалімся вялікай колькасцю новых аўтараў, новых твораў, але чамусьці забываем, што галоўнае не колькасць, а якасць. Пасля мы скрушліва адзначаем, што наш літаратурны працэс ужо амаль не жывы, што беларуская літаратура незапатрабаваная. А між тым, калі сапраўды глыбока пранікнемся праблемай, то ці не ўбачым сябе, як частку ці асноўную прычыну гэтай праблемы?

"Тым не менш, — працягнуў сваю думку **С. Андраюк**, — *з цікавасцю для сябе прачытаў творы І. Шамякіна, А. Савіцкага, Ю. Станкевіча, Я. Сіпакова. Добра, што ў "Полымі" ёсць "Дэбют"; выдатнае спалучэнне сучаснага і мінулага ў "Спадчыне"; радуе, што шырока прадстаўлены пераклады, але тут ёсць пэўны перакос у бок славянскіх паэтаў — можна было б пашырыць кола неславянскіх аўтараў. Крытыка, на жаль, мае вельмі мала рэцэнзій — усяго толькі пяць за год".*

Аналізуючы палымянскую раманістыку, **Дзіна Дудзінская** ўзняла пытанне навізны: *"Часцей за ўсё навізна ўзнікае тады, калі новы погляд не ўкладваецца ў папярэдні. Пры гэтым ён не абвяргае стары, а расцягвае, паскарае, дапамагае ўзнікненню нечага новага ў вобразах. Між тым, зараз у нас навізна ідзе малымі крокамі..."*

У сувязі з гэтым паўстае пытанне сусветнасці літаратуры, бо многія аўтары, імкнучыся да яе, пераносяць у нашу літаратуру іншаземныя вобразы і манеру пісьма, тады як трэба кіравацца сваім, нацыянальным, не такім, як у іншых. Тады і атрымаецца — *"чым унікальней, непаўторней, тым сусветней".*

З даследчыцай нельга не пагадзіцца, бо "Нацыянальны мастак арганізуе фантазію нацыі, як нацыянальны палітык арганізуе сілы дзяржавы" (Ц.Норвід).

Зыходзячы з падобных меркаванняў, з часопісных раманаў Д. Дудзінская вылучыла "Кола Сварога" Зінаіды Дудзюк як твор, які адлюстроўвае наш менталітэт. У гэтым плане адрозніваецца, на думку даследчыцы, раман В. Праўдзіна "Нелюбімыя гінуць", як твор не скіраваны на стварэнне вобраза нацыянальнай ментальнасці. *"Тут ствараецца вобраз нацыянальнай рэакцыі на падзеі і ёсць шэраг спрэчных момантаў".*

Ігар Шаладонаў прааналізаваў палымянскія апавяданні, адзначыўшы жанравую разнастайнасць твораў: навелы, прыпавесці, замалёўкі і г.д. *"Сапраўдны творца не павінен паўтараць класікаў, а асноўным мастацкім прынцыпам павінна быць імкненне сказаць праўду",* — заўважыў даследчык і ў якасці найбольш удалых твораў назваў апавяданні "Дзед" Адама Глобуса і "Хата" Уладзіміра Міхно. Апавяданням Міхася Куляша "Сын" і "Дарога", на яго думку, не хапае псіхалагізму; творам С.Сцяпана "Рэчка Геракліта" і "Востраў слёз" бракуе матывіроўкі ўчынкаў герояў.

З аналізам палымянскіх дэбютаў выступіла **Юлія Масарэнка**, як даследчыца маладой літаратуры. *"Некалі "Першацвет" меў на мэце адкрыццё новых аўтараў. Цяпер гэту функцыю цалкам узялі на сябе "Маладосць" і "Палымянскі дэбют", у якім адлюстроўваецца сённяшні літаратурны працэс і ў маладой літаратуры. Але засмучае, што там няма прозы — адна паэзія".*

Сярод паэтаў, якія парадавалі сваёй творчасцю, Ю.Масарэнка назвала Святлану Варонік, Таццяну Будовіч, Ігара Клепікава; у ліку маладых творцаў, якія пакуль што яшчэ не дапрацоўваюць, дапускаюць значныя хібы, былі ўзгаданы Сяргей Патаранскі і Міхась Южык.

У адрас часопіса прагучала таксама слушная заўвага наконт недастатковай выверанасці тэкстаў : *"Полымя" — гэта вышыня, узровень, і хацелася б каб праца рэдактара паэзіі адчувалася больш значна".*

Пра крытыку і літаратуразнаўства "Полымя" гаварыў **Міхась Мушынскі:** *"Пераважная большасць публікацый належыць вядомым аўтарам, якія маюць высокі статус, прафесійны ўзровень: Д. Бугаёву, В. Жураўлёву, А. Марціновічу, С. Андраюку, К. Камейшу, В. Максімовічу, Т. Дасаевай, З. Дразд*овай, *В. Локун, Т. Голуб, А. Мельнікавай, С. Явар, Г. Запартыцы і інш". Было заўважана, што перавага аддаецца гісторыка-літаратурнай праблематыцы." Гэтым артыкулам характэрна грунтоўнасць, прадуманасць, добрае адчуванне адметнасці стылю. Матэрыялы чытэльныя, змястоўныя, праблемныя, насычаныя канкрэтыкай".*

М.Мушынскі даў таксама шэраг слушных парад наконт абнаўлення палымянскай крытыкі, а менавіта параіў: асвятляць сам стан літаратурнай крытыкі, жанрава разнастаіць яе, уводзіць палеміку, аналітычна-аглядныя артыкулы — *"хацелася б аналітычнай, доказна абгрунтаванай крытыкі".*

З вуснаў даследчыка прагучала таксама цікавая думка наконт так званай "калідорнай" крытыкі, да якой мы пакуль не дараслі і ў якой гаворыцца ўсё, што думаецца, без цэнзурнай аглядкі, без боязі некага пакрыўдзіць. Думку падхапіла **Раіса Баравікова**. Яна выдзвінула ідэю стварэння такой рубрыкі ў часопісе "Маладосць", дзе пры жаданні можна будзе пісаць пад псеўданімам, але ўсю, нават самую непрыглядную праўду.

Час пакажа, наколькі гэта магчыма, але ці не ператворыцца такая крытыка ў звычайнае кулуарнае пляткарства? Сапраўды, ці дараслі мы да таго, каб інтэлігентна, без хамства і пастаяннага пераходу з ацэнкі літаратурнага твора на асобу аўтара гаварыць усё, што думаем? А суддзі хто? Безумоўна, тут ёсць над чым паразважаць і гэта тэма заслугоўвае асобнай гаворкі.

Напрыканцы сустрэчы агульную рысу падвяла **Таіса Бондар**. Пісьменніца выказала падзяку за цікавую і змястоўную гутарку, упэўненасць у тым, што *"падобныя пасяджэнні — справа патрэбная, і варта будзе праводзіць іх і з іншымі выданнямі. Гэта прынясе сапраўдны плён".* Закрануўшы агульналітаратурныя праблемы, у прыватнасці цяжкасці выдання кніг і складаную сітуацыю з падпіскай, Т. Бондар адзначыла: *"Яшчэ будзе цяжка, пакуль мы ўсе разам не будзем абараняць сваю прафесію, паважаць адзін аднаго, не баяцца нестандартнага мыслення і, калі ёсць за што пахваліць, трэба абавязкова выказваць станоўчыя меркаванні..."*

Пасля яшчэ ўзяў слова М. Мятліцкі, які аптымістычна запэўніў:*"Сёння адбылося роднаснае паяднанне душ. Наша літаратура будзе існаваць, бо ёсць таленты і ёсць сумленне".*

Наталля ДЗЯНІСАВА
Фота Кастуся ДРОБАВА

АБСЯГІ

ГРОДЗЕНШЧЫНА

З ЖЫЦЦЯ КАЛЕДЖА

У Наваградскім аграрным каледжы яшчэ задоўга да ўрачыстасцей святкавання 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ўжо актыўна вядзецца падрыхтоўка да гэтых памятных падзей.

Арганізатары гэтай работы сярод студэнцкай моладзі — куратары і актывісты груп навучэнцаў. Распрацаваны план агляду-конкурсу "60-годдзю Вялікай Перамогі — дастойную сустрэчу".

Пад кіраўніцтвам выкладчыкаў каледжа М.Руновіча і Р.Кулеш праводзяцца цікавыя мерапрыемствы — выхаваўчыя гадзіны, удзельнікі мастацкай самадзейнасці рыхтуюць змястоўную святочную канцэртную праграму.

У каледжы створаны ўсе ўмовы для арганізацыі баўлення часу навучэнцаў: дзве актавыя залы, спортзала, спортпляцоўка. Любімым месцам падрыхтоўкі да заняткаў з'яўляецца бібліятэка, кніжны фонд якой — каля ста тысяч экземпляраў вучэбнай, навуковай, энцыклапедычнай і мастацкай літаратуры. Наведвальнікі маюць магчымасць пазнаёміцца з навінамі жыцця ў перыядычных газетах, часопісах. Тут працуюць кваліфікаваныя, вопытныя спецыялісты бібліятэчнай справы, якія дапамагаюць наведвальнікам падабраць патрэбную літаратуру ці даведачны матэрыял.

Па ініцыятыве і з дапамогай кіраўніцтва каледжа перыядычна выпускаецца газета "Студэнцкі кур'ер", які адлюстроўвае жыццё студэнцкай моладзі. Яго тэмы і праблемы хвалююць не толькі студэнтаў, але і выкладчыкаў.

А.Краснабаева, сацыяльны педагог, — рэдактар газеты. Ёй дапамагаюць актывісты-карэспандэнты: яны адлюстроўваюць і станоўчае, і адмоўнае з жыцця ўстановы. Гэта, канечне, прыносіць добры вынік у выхаваўчай рабоце сярод моладзі.

Яўген ЛАПЦЕЎ

ГОМЕЛЬШЧЫНА

"ПЕРАПАЛОХ"

Так называецца новая камедыя пісьменніка Васіля Ткачова, прэм'ера спектакля па якой адбылася на сцэне Гомельскага абласнога драматычнага тэатра. Гэта, дарэчы, трэцяя пастаноўка ў творчасці вядомага аўтара на мясцовай сцэне — раней тут знайшлі ўвасабленне ягоныя творы "Вокны" і "Усміхаўся месяц белай вішні".

Прэм'ера прайшла з вялікім поспехам. Гэтаму садзейнічаў не толькі востра закручаны сюжэт камедыі, але і яркая гульня акцёраў — заслужаных артыстаў рэспублікі Фёдара Іванова і Віктара Чэпелева, артыстаў Аляксандра Рубцова, Сяргея Юрэвіча, Галіны Вевер, Эльвіры Бацянковай, Алы Маслоўскай і іншых.

Ажыццявіў пастаноўку спектакля мінскі рэжысёр Рыгор Баравік, сцэнаграфія Уладзіміра Ціханава.

Ягор ЛЯСНЫ

МАГІЛЁЎШЧЫНА

БАБРУЙСК АТРЫМАЕ СІМВАЛ

Бабруйскі гарвыканкам абвясціў конкурс праектаў скульптуры сімвалу горада — бабра. Прапанаваны на выбар два месцы будучай магчымай устаноўкі скульптуры: прывакзальная плошча станцыі "Бабруйск" і пешаходная зона на вуліцы Сацыялістычнай. Не выключаецца магчымасць таго, што аўтары праектаў прапануюць свой варыянт размяшчэння сімвалу горада.

БАЦЬКА З ДАЧКОЙ — ФОТАМАСТАКІ

Вядомы магілёўскі фотамастак Мірон Шчудло паўдзельнічаў больш чым у 250 міжнародных выставах. Яго творчасць адзначана 14 залатымі, 2 срэбнымі, 6 бронзавымі медалямі, дыпломамі. Некалькі дзесяткаў каляровых фотаздымкаў знаходзяцца ў музеях Аўстрыі, Іспаніі, Англіі, Францыі, Кітая, Японіі, прыватных калекцыях. Таленавіты магілёвец уганараваны званнямі заслужанага мастака Еўрапейскай асацыяцыі фотамастацтва, асацыяцыі фотамастацтва Амерыкі, Азіі і Іспаніі.

Не так даўно ён удзельнічаў у трэцяй міжнароднай мастацкай фотавыставе, што адбылася ў Францыі. Залатым медалём адзначаны яго каляровы здымак "Алеся". Поспехам завяршыўся ўдзел у гэтай самай выставе і для яго дачкі — васьмікласніцы Юлі Шчудло. Фотаздымак дзяўчынкі "За мір" уганараваны прызам першай ступені.

Міхась КАРПЕЧАНКА

ПЕРАМОГА... НЕ ПРЫВАТЫЗУЕЦЦА

Як вядома нашым чытачам, ды і не толькі ім, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва" да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а таксама з нагоды 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне мяркуе выдаць кнігу "Наша Перамога" з серыі "Мы — беларусы". Праца над выданнем вядзецца, як кажуць, поўным ходам, і жадаючых прыняць у ёй удзел, а дакладней, тых, хто працуе ўжо над кнігай шмат.

Да нас, маецца на ўвазе тых, хто непасрэдна працуе над "Нашай Перамогай", з матэрыяламі (дакументы, успаміны, часопісныя і газетныя публікацыі розных гадоў і г.д.) звяртаюцца, вядома, найперш удзельнікі таго ўсенароднага змагання за Радзіму. Воіны і партызаны, падпольшчыкі, працаўнікі тылу, вязні (у тым ліку і малалетнія) фашысцкіх канцлагераў...

Што датычыць названых нашых грамадзян, то, несумненна, тут усё зразумела: такое асабіста перажытае — не забываецца. І жаданне сказаць сваю праўду аб мінулым нашчадкам, іх абавязак. Так, святы і зразумелы абавязак сказаць тым, хто нарадзіўся пасля Перамогі, што дзеля будучыні, сённяшняга жыцця мільёны людзей самых розных нацыянальнасцей у 1941—1945 гадах загінулі, змагаючыся з фашызмам. Паведаць, што быў час, калі ад кожнага патрабавалася мужнасць супрацьстаяць фашызму, і што не кожнаму гэта было пад сілу. А таксама сказаць тое, што менавіта ад самога чалавека, трапіўшага ў неймаверна цяжкія ўмовы залежыць: узвысіцца ён духам, нават загінуўшы, або стане здраднікам, "падшым", за кошт чаго застанецца жыць... І тут, як сцвярджаюць ветэраны, не трэба прыхарошванняў, не трэба ўяўнага гераізму, пахвальбы і г.д., не трэба выдзяляць у кнізе пра вайну герояў у залежнасці ад вайсковых і партызанскіх званняў і пасад. Але варта падкрэсліць: салдатамі Айчыны былі ўсе: радавы і маршал... Звычайны партызанскі разведчык і камандзір злучэння... Падпольшчык і вясковая бабуля, якая перавязвала воінаў, што прабіваліся з акружэння, парванай на бінты бялізнай мужа, або сыноў, якія пайшлі на фронт... Дарослыя працаўнікі тылу і юныя мсціўцы... І калі так, то салдатам быў кожны, хто хоць як змагаўся з ворагам.

Усім ім, хто азваўся на акцыю РВУ "Літаратура і Мастацтва" па стварэнні гэтай кнігі, і тым салдатам Айчыны, хто пра акцыю нічога не ведае, хто жыве ў горадзе і вёсцы ад Брэста і да Курыл (палітыкі, адкінем штучна вамі ўзведзеныя між народамі былой вялікай краіны межы, яны — не змагарам з фашызмам!) — наш нізкі паклон. А найперш — успомнім тых, хто навек застаўся ў тым часе...

На акцыю таксама азваліся не толькі многія і многія жыхары нашай рэспублікі, але і з так званага блізкага і нават далёкага замежжа. І не толькі ветэраны. А і тыя, хто ў вайну па ўзросце не мог прымаць удзел у змаганні, і тыя, хто нарадзіўся пасля Перамогі, і зусім юныя грамадзяне. Рабочыя, навукоўцы, настаўнікі, журналісты, пісьменнікі і інш. і інш., а таксама — дзеці, унукі і праўнукі змагароў за Айчыну. (Апошняе — дык найбольш натхняе: памяць сапраўды моцная толькі тады, калі жыве ў пакаленнях).

І што характэрна: ніхто з пералічаных катэгорый нашых грамадзян (няхай чытачы даруюць мне гэты афіцыёз), тых, хто меў дачыненне да вайны, і хто — не, нават словам не абмовіўся наконт таго, што ён будзе з гэтага мець. У матэрыяльным плане. Усе яны лічаць, падкрэслю, сваім чалавечым абавязкам удзел у гэтай акцыі. Вядома ж, яна не "замыкаецца" толькі старонкамі кнігі, а ахоплівае незалежна ад нас выдаўцоў кнігі, гарады і вёскі, прадпрыемствы, школы і г.д. і г.д., стане сапраўднай усенароднай акцыяй святкавання перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. І таму на гэтым фоне асаблівым кашчунствам выглядаюць памкненні асобных, як нашых, так і чужых "дзеячаў" перагледзець мінулае на свой капыл, прынізіць подзвіг воінаў, партызан, падпольшчыкаў і працаўнікоў тылу ў Вялікай Айчыннай, абылгаць ветэранаў, а то і абразіць увесь народ, які змагаўся з ворагам на сваёй зямлі. І між іншым, памкненні такія "запускаюцца" час ад часу, як у так званыя незалежныя СМІ (чыталі), так і ў дзяржаўныя.

Я не буду аналізаваць першыя — гэта на сумленні гаспадароў тых выданняў і выканаўцаў іх волі, якія падобнае друкуюць (гісторыкі і іншыя даследчыкі тут, упэўнены, скажуць сваё слова), а каб не быць галаслоўным у адносінах да дзяржаўных СМІ, нагадаю выпадак з уласнай журналісцкай практыкі.

Дык вось, неяк мне на стол адзін з маіх былых начальнікаў (а было іх нямала) паклаў матэрыял адной калялітаратурнай "дамочки" з тых, хто "кормятся" нібыта дэмакратыяй, у якім было сказана, што "ўсе свядомыя беларусы ў 1944 годзе паехалі на Захад з адыходзячымі нямецкімі войскамі".

Мільёны ж тых, хто загінуў на фронце і ў партызанах, хто быў жывым спалены ў сотнях нашых хатыняў, каго фашысты закатавалі, як патрыётаў сваёй Айчыны, сотні тысяч памерлых ад хвароб і голаду, ды тысячы абяскроўленых дзяцей, у якіх ворагі забралі кроў і адабралі жыццё — і іншыя, іншыя, іншыя — аказваецца, "несвядомыя беларусы".

Вядома, у дзяржаўным выданні артыкул той "свядомай", не прайшоў, нягледзячы на крыкі яе патронаў аб свабодзе слова і цэнзуры. Затое, як нам паведаміў з бязмежным абурэннем адзін чытач, быў надрукаваны ў кнізе аўтаркі, выдадзенай за замежны кошт на нашай шматпакутнай зямлі...

Але, мабыць, кніга тая выйшла таму, што за падобнае ў нас ніхто не нясе ніякай рэальнай адказнасці, а маральная адказнасць для такіх "дзеячаў" не існуе.

Зрэшты не мной першым заўважана, і не ў мяне першага выклікае абурэнне, што і на нашай зямлі, народ якой па сутнасці пацярпеў больш за іншых (хаця, мабыць, так нельга параўноўваць) знаходзяцца людзі, сярод іх — нават нашчадкі тых, хто ваяваў, якія спрабуюць гандляваць памяццю змагароў за Айчыну.

Паглядзіце падшыўкі некаторых тых жа "свободных изданий", і вы заўважыце прыватныя аб'явы, накшталт "куплю награды дорого..." Як сцвярджаюць тыя, хто ведае, існуюць дакладна вызначаныя цэны на ўсе баявыя ўзнагароды нашых дзядоў і бацькоў, разгорнуты адпаведны бізнес. (Дзякуй Богу, дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі такога кашчунства пазбеглі).

Канечне, за ўсім гэтым стаяць канкрэтныя людзі, за кожнай названай праявай — канкрэтны чалавек, у якога былі або ёсць канкрэтныя бацькі (можа, і ўдзельнікі вайны), канкрэтная школа, інстытут, сябры і г.д.

І зноў жа — "закіды" гэтыя перш за ўсё маюць маральны аспект, гэта праява адпаведнай псіхалогіі, і калі мне кажуць, маўляў, справа асабістая, дык запярэчым: далёка не так, калі абражаюцца пакаленні, народ...

Я ўжо казаў, што ў рабоце над кнігай "Наша Перамога" прымаюць удзел многія журналісты, падкрэслю, дзяржаўных газет. Гэта найперш былы ваенны журналіст, падпалкоўнік у адстаўцы Міхаіл Кадзет, які шмат гадоў сваёй творчай працы прысвяціў тэме гераічнага подзвігу народа ў Вялікай Айчыннай, і які сабраў унікальнейшыя матэрыялы аб тых, хто ваяваў. Дарэчы, Міхаіл Фёдаравіч стаў адным з укладальнікаў кнігі, далучыў да працы над ёй многіх ветэранаў, а таксама калектыў журналістаў з газеты беларускіх вайскоўцаў "Во славу Родины".

З намі таксама плённа працуюць супрацоўнік газеты "Звязда", кандыдат гістарычных навук, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Анатоль Мяснікоў, журналіст, кандыдат гістарычных навук, выкладчык БДПУ імя Танка Віталь Сцяпанавіч Лукін, супрацоўніца "Чырвонай змены" Наталля Карпенка, галоўны рэдактар Жыткавіцкай раённай газеты "Новае Палессе" Уладзімір Гаўрыловіч, журналіст Усевалад Грыняк і многія іншыя. Усе яны перадаюць бязвыплатна і свае ўласныя матэрыялы і матэрыялы, якія дасталіся ім ад ветэранаў, герояў іх публікацый, а таксама копіі шматлікіх дакументаў, якія яны ў свой час зрабілі ў дзяржаўных архівах і музеях, маючы туды доступ як работнікі друку.

Але, зноў жа маральны аспект, ёсць і іншы "прыклад" адносін калег па пяру, пра які нібы і гаварыць сорамна, ды патрэбна...

Мы адмовілі ў супрацоўніцтве аднаму вядомаму журналісту, які мае даволі рэдкія фотаздымкі і матэрыялы аб вайне. Іх ён у свой час "пачэрпнуў" з аднаго дзяржаўнага архіва, маючы туды доступ. Сталася так, што адбылася "прыватызацыя" многіх матэрыялаў, што павінны належаць усім, "собственник" па яго прызнанні "сбрасывает их за еврики на Запад". На пытанне: "Сколько вы мне заплатите" адказу яму мы не далі. Вядома, заплацілі б па дзяржаўных стаўках, але ж...

Не сталі мы працаваць і яшчэ з тым-сім з такіх жа "прыватызатараў" з дзяржархіваў. І яны наш зварот успрынялі як запрашэнне да гандлю памяццю народа. У дадатак захацелі выкарыстаць кнігу для рэкламы свайго журналісцкага "величия и важности" — фальшывая "бронза" звычайна вельмі хутка раз'ядаецца ржой.

Адмовіліся мы і ад паслуг аднаго дзяржаўнага музея, супрацоўнікі якога таксама далі згоду прадаставіць нам матэрыялы за плату...

Канечне, фармальна іх зразумець можна: фонды павінны "працаваць", ёсць інструкцыі і правілы іх выкарыстання, вызначаны формы "договоров", іх "предметы", "цены работ и порядок оплаты" і г.д., але ж, мабыць, у нашым выпадку і нас зразумець трэба было б: ствараецца кніга, без перабольшання, дзяржаўнай, агульнанароднай значнасці, установа вельмі ашчаджае тыя небагатыя сродкі, якія ў яе ёсць. І калі ўжо так — працуем без усялякай аплаты — ведаюць жа...

Прыкра таксама, што ў такіх музеях (і не толькі ў згаданым, а і ў некаторых іншых), як вядома, даўно пасяляюцца розныя камерцыйныя структуры. Мала таго, што пасяляюцца, але ж яны выцясняюць экспазіцыі з пакояў і залаў, у якіх размяшчаліся матэрыялы аб усенароднай барацьбе з ворагам у гады Вялікай Айчыннай вайны. І многія матэрыялы, рэдкасныя дакументы знікаюць бясследна. Што да самой камерцыі — мабыць, месца сваё трэба ведаць.

Ну што ж! Не — дык не. Справімся самі. Зрэшты, кніга на такую тэму, які б вялікі яе аб'ём ні быў, усё адно ўсяго не ахопіць. І наогул — тэма невычарпальная, і нават усё, што да нас выдавалася энцыклапедычнае, мемуарнае, мастацкае — кропля ў моры ад таго, што павінна быць. І калі да гэтай кроплі далучаецца наша...

Затое мы, стваральнікі кнігі "Наша Перамога" з удзячнасцю прынялі прапанову кіраўніцтва і ўсіх работнікаў установы "Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў", што ў Дзяржынску, якія самі звярнуліся да нас з прапановай да супрацоўніцтва. Яе дырэктар Віктар Васільевіч Баландзін, намеснік дырэктара Алена Грыневіч і загадчыца аддзела Таццяна Рахманько — разам з намі. (Архіў нярэдка наведваюць немцы, без усялякай выгады для сябе перадаюць матэрыялы часоў вайны).

Акрамя ўжо названых людзей, якія вызваліся працаваць над кнігай "Наша Перамога", трэба назваць іншых, тых, хто даўно і асабліва плённа працуе з намі. Гэта пісьменнікі Алесь Савіцкі, Уладзімір Федасеенка, Валянцін Лукша, Васіль Макарэвіч, Уладзімір Скарынкін, Уладзімір Ліпскі, Павел Місько, Анатоль Дзялендзік, Уладзімір Паўлаў, Анатоль Сульянаў, Анатоль Бутэвіч, Генрых Далідовіч, Казімір Камейша, Алесь Марціновіч, Васіль Гурскі, Навум Гальпяровіч, Уладзімір Мацвеенка і іншыя. (Дарэчы, у гады вайны на фронце і ў партызанах загінулі па некаторых звестках 22 беларускія пісьменнікі. Непасрэдна ж удзельнікамі вайны з'яўляецца пераважная большасць пісьменнікаў таго пакалення. Многія працавалі ў вайсковым друку або ў тыле).

Нам прадаставілі свае матэрыялы кандыдат гістарычных навук, даследчык тэмы вайны і дзяцей Уладзімір Паўлаў, дачка легендарнага партызанскага кіраўніка В.І. Казлова Вольга Васільеўна Казлова, сын Героя Савецкага Саюза А.С. Хмялеўскага настаўнік Сяргей Аркадзьевіч Хмялеўскі, настаўніца Валянціна Пятроўна Герасімава (аб воінах, якія вызвалялі Магілёўшчыну), вучаніца адной з мінскіх школ Вольга Лешчанка (аб поглядзе сучаснай моладзі на вайну), студэнтка факультэта журналістыкі БДУ Алёна Гардзей (аб партызанах зямлі яе бацькоў і многія іншыя). Асаблівае спадзяванне ў нас на самае цеснае супрацоўніцтва з ветэранскімі арганізацыямі. Нашым аўтарам і адным з кансультантаў будзе старшыня Рэспубліканскага савета беларускага аб'яднання ветэранаў, генерал-лейтэнант А. М. Новікаў. Анатоль Мікалаевіч вельмі добра ведае матэрыял, яго згода да супрацоўніцтва радуе.

Праект часткова фінансуе дзяржава. Яна не ўмешваецца ў фарміраванне кнігі. Напэўна, так і павінна быць, калі аўтар — народ. Канечне, як казаў, выданне не можа прэтэндаваць на ўсёабдымнасць. Бо, несумненна, усе ўдзельнікі вайны заслугоўваюць пашаны. І мы ўпэўнены: усе з іх маюць права на асобную кнігу. А паколькі гэта немагчыма — прысвяцім "Нашу Перамогу" ўсім, хто змагаўся з ворагам, хто загінуў і каму выпала жыць. Памятаючы, што салдатамі Айчыны былі ўсе змагары за яе свабоду.

Уладзімір САЛАМАХА

Жабрацтва ды інваліднасць у сваёй большасці — гэта псіхалогія, адсутнасць духу, а не часткі цела. А інвалід не той, у каго няма рукі, а той, хто стогне, чакаючы абавязковага спачування ад людзей. А людзі на кожным кроку звыкліся ўжо сутыкацца са звычайнай хлуснёй: прыдуманым калецтвам, "хваробай блізкіх", "згубленымі грашыма", "спаленай хатай" і да т.п. Каму ж хочацца ўвесь час дзяліцца заробленым рублём з тымі, хто не імкнецца працаваць дзеля сябе, не кажучы ўжо пра карысць для радзімы.
Вядома, ахвяраваць альбо не — справа асабістая, бо кожны гаспадар свайго лёсу. І ўсё ж паспрабуем у тым-сім разабрацца ў пастаўленай праблеме.

ЦІ НА КАРЫСЦЬ — АХВЯРАВАННЕ?

Сацыяльная абарона насельніцтва. Гучыць слушна. А калі прыгледзецца да рэчаіснасці, то, амаль як і ўсюды, ёсць свае адметнасці і недахопы. Дзяржава клапоціцца пра малазабяспечаных грамадзян, пенсіянераў, вынаходзіць дадатковыя сродкі для дапамогі. Але ж бюджэт, як вядома, не гумовы: і хацелася б пенсіі, стыпендыі і іншыя грашовыя выплаты зрабіць больш існымі, ды адным хаценнем не абыдзешся. Вось тут і пачынаецца раздзяленне жыццядзейнасці вышэйназваных катэгорый грамадзян нашай краіны.

Пенсіянеры скардзяцца, што на жыццё іх пенсій, можа, і хапала б, але большую частку трэба аддаць за камунальныя паслугі, з лекаў можна набыць самыя танныя, а астатнія грошы ідуць на харчаванне. Для некаторых страва з мяса раз на тыдзень — ужо няблага.

Крыху лепшае становішча назіраецца ў раённых цэнтрах і вёсках, дзе ёсць магчымасць і ўмовы жыхарам самім пра сябе паклапаціцца. Большасць з іх трымаюць гаспадарку і маюць шкварку, яечню і бульбіну на стале, нават і дзецям сваім дапамагаюць. А для некаторых бацькоўскія пенсіі — амаль асноўны сродак існавання. Але ёсць і такія, што жывуць па прынцыпе "Бог дасць дзень, дасць і ежу", ды толькі, як прыходзіць новы дзень, па ежу ідуць не да таго, хто гэты дзень дае, а да суседзяў-гаспадароў.

Адна мая знаёмая расказвала пра сваю бабулю, якая жыве ў вёсцы. Старой ужо 74 гады, атрымлівае пенсію ў 80 тысяч рублёў. Нягледзячы на высокі ціск, у яе гіпертанія, яна трымае гаспадарку: карову, парсючка, куранят, садзіць бульбу і яшчэ тое-сёе каля хаты. Некаторыя ж суседзі, маладзейшыя і здаравейшыя, такім клопатам свае галовы не тлумяць. У іх адзіная мэта — дзе прыдбаць чарговую пляшку гарэлкі. Ведаюць, што бабулька, калі папрасіць малака, гуркоў ці кавалак сала, ніколі не адмовіць і не папракне. Ну добрае ў яе сэрца, што тут паробіш, і гультаі-абібокі гэтым карыстаюцца. А бабулі проста шкада іхніх дзетак, што жывуць нібы сіраты пры жывых бацьках. Дзяржаўная дапамога (так званыя "дзіцячыя") ператвараецца ў "хуткую" дапамогу для набыцця дарослымі бутэлек з "жывой вадою", без розніцы якой: празрыстай, каляровай заводскай ці самаробнай, толькі б "палячыцца" і, як вынік, зноўку атрымаць пахмельную хваробу. Вось і атрымліваецца, як у дзіцячай казцы: "біты нябітага вязе", толькі з удзелам сталых людзей.

Не зусім добрае становішча назіраецца і ў сферы дзейнасці сацыяльных службаў. Пра гэта я ведаю дакладна, бо сястра працуе сацыяльным работнікам у адным з райцэнтраў Магілёўскай вобласці. Дапамагае яна некалькім бабулям (так, бабулям, бо гаспадары іх даўно паўміралі, ды і статыстыка сведчыць, што "дужая" палова чалавецтва значна не дацягвае да сярэдняй працягласці жыцця жанчын) з вакольных вёсак, якім цяжка самім хадзіць у горад (каля чатырох кіламетраў) — ніякіх крамаў, не кажучы ўжо пра аптэкі, у іх вёсцы няма, як і няма прыгараднага транспарту. У старых кабет запатрабаванні не вялікія: прынесці што-небудзь з прадуктаў, ці то цукар, гарбату, макароны і муку альбо пральны парашок, лекі. А не так даўно ўсім тым, каму дапамагаюць, за тую ці іншую паслугу прыходзіцца плаціць грошы, нават спіс склалі — што колькі каштуе. Прычым, калі ў старых ёсць дзеці, якія жывуць хай хоць у абласным цэнтры, ім усё роўна трэба аплачваць сацыяльнае абслугоўванне. Маўляў, сын ці дачка жывуць не так ужо і далёка, таму могуць паклапаціцца пра сваіх бацькоў. Так, яны прыязджаюць, клапоцяцца (адны з поўнымі торбамі ў вёску, а іншыя — з вёскі). Але той жа вады са студні, якая знаходзіцца на значнай адлегласці ад некаторых хат, трэба прынесці калі не кожны дзень, то разоў чатыры-пяць на тыдзень. Ды ці мала спраў у сельскіх жыхароў, у дадатак — старыя жывуць воддаль ад даброт цывілізацыі? Вось некаторыя з іх і вымушаны былі адмовіцца ад такой "дапамогі": не могуць яны дазволіць сабе аплачваць такую паслугу. Людзям, адпрацаваўшым усё жыццё ў калгасе, крыўдна, што пад старасць ім ніхто за "дзякуй" не дапаможа, нават прызначаныя для гэтага службы. Пераязджаць у горад да дзяцей яны таксама адмаўляюцца. Па-першае, каб не замінаць ім, а па-другое, яны выраслі на зямлі і без яе проста не ўяўляюць свайго існавання. Што ім рабіць, кажуць бабулі, у шматпавярховіку, у чатырох сцянах? Лепей на свежым паветры ў агародчыку пакорпацца, па якой-ніякой гаспадарцы што-небудзь зрабіць, глядзіш — і хвароб ужо не заўважаеш, і настрой добры з'яўляецца. А што тычыцца сацыяльнай службы, то можна час ад часу папрасіць купіць, што патрэбна, каго з аднавяскоўцаў, хто збіраецца на калёсах у горад на базар ці па якой іншай справе. Вось і атрымліваецца, як у дзіцячай казцы: пакуль сіла ёсць — ты патрэбны, састарэў — ціхутка маўчы...

Вялікі горад, напрыклад Мінск, спрыяе найбольш рознабаковай дзейнасці пэўных грамадзян. Каб папоўніць свой бюджэт, яны не цураюцца анічым. Адны збіраюць паперу, кардонныя скрыні (асабліва на рынках) і адносяць або адвозяць у пункты прыёму макулатуры. Іншыя збіраюць пустыя бутэлькі. На іх карысць (і на шкоду нацыі) у наш час зашмат юнакоў і дзяўчат п'юць піва. Зімовыя маразы ім не перашкаджаюць, а ўлетку дык увогуле, куды ні зірні: у парках і скверах, у кафэ на праспектах і вулачках, каля пад'ездаў, — усюды сядзіць моладзь з бутэлькамі гэтага бурштынавага напоя.

"Шкляны" бізнес — справа сур'ёзная, "тэрыторыі" ўжо даўно падзелены. Чужынцаў там не церпяць. Колькі разоў быў сведкам, калі спрэчкі з-за яшчэ не дапітай кім-небудзь бутэлькі з гэтай нагоды пераходзілі ў бойку.

Як бы там ні было, але тыя, хто збірае макулатуру ці тару з-пад піва, сумленна зарабляюць грошы ды яшчэ ў дадатак ачышчаюць горад ад смецця. Поруч з імі "працуе" іншая катэгорыя грамадзян. Іх можна бачыць дзе заўгодна: у прыгарадных электрычках, падземных пешаходных пераходах, розных бойкіх месцах. Больш псіхалагічна выбрана-выверанае месца для жабрацтва — каля падыходаў да храмаў і касцёлаў. Просячыя падаянне ўпэўнены, што чалавек, які ідзе ў царкву, абавязкова пакладзе ў торбачку ці пакецік грашовую паперку — ад пачуцця сваёй віны перад імі, каб замаліць грахі або проста ад спачування. Навошта ім працаваць, можна і так прыдбаць грошы, як кажуць, не сыходзячы з месца.

Некаторыя наадварот, каб "зарабіць", павінны пастаянна мяняць месца дзейнасці. Аднойчы, калі ехаў у метро, у вагон зайшла маладзавая жанчына і ўкаціла інвалідную каляску, у якой сядзела дзяўчынка гадоў шасці і, здавалася, была ў летаргічным сне. Кабета звярнулася да людзей са звычайнай для гэтага выпадку прамовай. Маўляў, дзіця вельмі хворае, патрэбна тэрмінова зрабіць аперацыю, якая дорага каштуе, карацей, дайце, каму колькі не шкада. На канцавой станцыі жанчына выкаціла каляску з дзяўчынкай і скіравалася да прыступак, каб выйсці з метро. Каля першай прыступкі дзяўчо жвавенька скокнула з каляскі, як усё роўна спачуванне людзей у вагоне імгненна адшаптала ўсе хваробы, і абедзве так спрытна падняліся наверх, што і не кожны здаровы зробіць такое з каляскай у руках. Не цяжка здагадацца, якім чынам будзе зарабляць на жыццё тое дзіця, калі вырасце, бо ўжо з маленства яе маці асабістым прыкладам (тэорыяй і практыкай) навучае тонкасцям свайго рамяства. Вось і атрымліваецца, як у дзіцячай казцы, калі воўк, каб без турбот здабыць сабе абед і паласавацца, "апранае кажух".

Віктар КАВАЛЁЎ

РОЎНАСЦЬ МОЎ — ПРАЗ СУД

Як паведамілі з прэс-цэнтра Канстытуцыйнага суда РБ, на нядаўнім пасяджэнні было разгледжана пытанне аб роўнасці рускай і беларускай моў.

Нагадаем, што з заявай разгледзець гэтае пытанне ў суд звярнулася грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны". Пры гэтым указваліся факты парушэння роўнасці моў. Тады як згодна арт.17 Канстытуцыі дзяржаўнымі ў нашай краіне з'яўляюцца беларуская і руская мовы. І ў адпаведнасці з арт.2 Закона "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь", краіна павінна забяспечваць усебаковае развіццё і функцыянаванне дзвюх моў ва ўсіх сферах грамадскага жыцця. Праўда, на практыцы, і гэтае ж сцвярджалі члены ТБМ, усё выглядае далёка не так. Да прыкладу, роднай мовай не пішуцца ні страхавыя дакументы, ані чыгуначныя білеты, ані банкаўскія пластыкавыя карткі і да т.п. Факт таго, што баланс выкарыстання беларускай і рускай моў на практыцы не выконваецца, падкрэсліў і Канстытуцыйны суд. І звярнуўся ў Палату прадстаўнікоў НС РБ з прапановай разгледзець гэтую праблему і ўнесці змены ў Закон "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" і іншыя заканадаўчыя акты, каб насамрэч забяспечыць фактычную роўнасць дзяржаўных моў.

ЯНЫ ГАНАРАЦЦА АЙЧЫНАЙ

20-га студзеня г.г. скончыўся першы этап Усерасійскага конкурсу журналісцкіх і пісьменніцкіх твораў. Ён праходзіць у адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай "Патрыятычнае выхаванне грамадзян Расійскай Федэрацыі на 2001—2005 гады" пад дэвізам "Мы ганарымся сваёй айчынай".

Усе работы будуць ацэньвацца па розных намінацыях, сярод якіх: Цэнтральнае, рэгіянальнае тэлебачанне, цэнтральныя, рэгіянальныя часопісы і газеты, дакументалістыка, кнігі і фотаальбомы, літаратурныя работы студэнтаў і навучэнцаў школ і г.д. Пры гэтым першы этап праходзіць у суб'ектах РФ, а таксама ў федэральных міністэрствах і ведамствах. Другі — у Маскве. Ён працягнецца з 1 лютага па 31 сакавіка 2004 г.

ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ КІНО Ў ПАШАНЕ

Нядаўняя цырымонія расійскай нацыянальнай прэміі "ЛАВР" за дасягненні ў галіне дакументальнага кіно сабрала ўсіх лепшых кінадакументалістаў краіны. Удзельнікі і члены журы пры гэтым адзначылі, што канкурэнцыя стала больш жорсткай, а ў некаторых намінацыях спаборнічалі нават некалькі дзесяткаў работ.

Прызы былі размеркаваныя наступным чынам: лепшы кароткаметражны фільм — "Падзенне Ікара" (аўтар сцэнарыя і рэж. Ю. Шылер), лепшы поўнаметражны фільм — "Фрэскі" (аўтар сцэнарыя сумесна з С. Літвяком і рэж. А. Гутман), лепшы навукова-папулярны фільм — "Гіпербалоід інжынера Шухава" (рэж. Ю. Малюгін), лепшы дакументальны серыял — "Расійская імперыя. Мікалай II" (аўтары сцэнарыя — Л. Парфёнаў, А. Шылаў, рэж. — А. Папоў, С. Сідараў і інш.). Дырэктар прэстыжнай штогадовай прэміі Святлана Развушкіна з прыемнасцю адзначыла, што шмат выдатных фільмаў, зробленых маладымі аўтарамі, прыйшлі з расійскай глыбінкі. І яшчэ — усе прысутныя на святочнай цырымоніі сцвердзілі, што нарэшце дакументальнае кіно запатрабаванае айчынным тэлебачаннем. Што пацвярджае і наяўнасць першых спецыялізаваных тэлеканалаў, на якіх дэманструецца толькі дакументалістыка.

Рубрыку вядзе ВІКа

ЗАХАРАВА, 19

РЭДАКЦЫЙНА-ВЫДАВЕЦКАЯ ЎСТАНОВА «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

прымае да разгляду:

выдавецкія праекты самай шырокай тэматыкі;
выканае ўвесь спектр рэдакцыйна-выдавецкіх паслуг (ад рэдагавання рукапісу да выдання і распаўсюджвання кніжнай прадукцыі);
арганізуе рэкламу і прэзентацыю выданняў.

Вул. Захарава, 19, тэл.: 284-85-25.

Выдавецкая ліцэнзія — ЛВ № 570 ад 23 кастрычніка 2002 года, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Пішыце на адрас: 220005, Мінск, вул. Захарава, 19, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"; e-mail: minsk@lim.by

Кнігі "Мы — беларусы", "Беларусь мая, Песня мая...", "Чарнобыльская рана" і "Чырвоную кнігу для дзяцей" можна набыць у Рэдакцыйна-выдавецкай установе "Літаратура і Мастацтва". Тэлефоны аддзела маркетынгу: 284-66-71; 284-84-62.

ДУША, ЯК ПЕСНЯ, А Ў ПЕСНІ — ДУША

Агульнавядомае сцвярджэнне, што, каб лепей спазнаць паэта, абавязкова трэба пабываць на ягонай радзіме. Нікольні не ставячы пад сумненне падобнае меркаванне, усё ж хачу зазначыць, што часам стае нават і аднаго верша, каб упэўніцца ў чым адметнасць пэўнага творцы. І неабавязкова, каб гэта было найлепшае з напісанага ім. Дастаткова, каб у гэтым вершы абавязкова гучала тое, што дае падставы сцвярджаць аб адметнасці аўтара, яго яркай індывідуальнасці, а значыць і вылучэння сярод іншых, хоць у чымсьці і падобных на яго, калі яны таксама пазначаны пячаткай таленту, адметнасці.

Ёсць падобны твор у Т. Бондар, пры тым з'явіўся ён яшчэ ў 1980 годзе, калі яна па сутнасці толькі ўваходзіла ў літаратуру, паспеўшы выдаць дзве кнігі "Захапленне" і "Акно ў восень", што пабачылі свет адпаведна ў 1974 і 1977 гадах, трэцяя "... І голас набыла душа" датуецца 1980 годам, а значыць, калі прытрымлівацца вызначэння самой Т. Бондар, яе паэтычная душа толькі набывала свой голас, настойліва старалася не заблудзіцца ў дружным шматгалоссі тых, хто раней ці адначасова з паэтэсай пачаў самасцвярджацца ў нацыянальным прыгожым пісьменстве.

Трэба быць справядлівым: дэбют Т. Бондар у якасці аўтара першай кнігі ўсё ж затрымаўся. І прычына не ў тым, што талент яе быў такім, што не адразу звяртаў на сябе ўвагу крытыкаў. Прычына куды больш празаічная, чым падаецца на першы погляд: Т. Бондар пасля заканчэння сярэдняй школы ў родным Рудзенску, а затым Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў жыла ў Малдавіі, выкладала гісторыю мастацтва ў мастацкай школе і працавала мастаком (дарэчы, сёння на яе рахунку шэраг творчых партрэтаў аб беларускіх прадстаўніках гэтай галіны творчай дзейнасці, у свой час апублікаваных у часопісе "Беларусь" і колішнім усесаюзным "Дружба народов", якія даўно "просяцца", каб стаць самастойнай кнігай).

Жывучы ў Малдавіі, яна, зразумела, знаходзілася далёка ад Беларусі, а галоўнае — ад сталічнага Мінска. А сталіца — на тое і сталіца. Каб мець выдавецтвы і ў гэтыя выдавецтвы пускаць "сваіх", а з творчай моладзі толькі тых, хто навідавоку ці, што яшчэ важней, мае вядомых і ўплывовых апекуноў. Што гэта і сапраўды так, змог і я сам добра пераканацца, калі пасля працы ў раённым друку і службы ў арміі, у 1972 годзе асталяваўся ў Мінску.

Таіса Бондар жа вярнулася ў сталіцу яшчэ пазней, у 1977-м. І я на ўласныя вочы бачыў, як ёй спачатку было цяжка "стукацца" нават у дзверы таго ж "ЛіМа", дзе я ўжо працаваў і дзе яна ў 1978 годзе пачала загадваць аддзелам выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі. Каб ужо не вяртацца да біяграфіі Т. Бондар, зазначу, што ў 1981 годзе яна звязала свой лёс з рэдакцыяй часопіса "Беларусь": загадчык аддзела культуры, адказны сакратар, намеснік галоўнага рэдактара, а з 1996 года была галоўным рэдактарам часопіса "Всемирная литература", які, безумоўна, без яе вялікіх арганізатарскіх здольнасцей і той улюбёнасці ў літаратуру, якую інакш як апантанасцю і не назавеш, наўрад ці пачаў бы выдавацца.

Апантанасцю ў самым шырокім значэнні гэтага слова. Той апантанасцю, што, бадай, пачыналася з уласнай паэтычнай, дзейнасці. А верш, які цытуецца, і дае адказ, як гэта пачыналася:

Я не пішу... Я гавару,
Каб словамі не захлынуцца,
Каб хоць адным з іх дакрануцца
Да песенных балючых струн, якія ладзіў дзень

Для смутку і для весялосці, —
Яны маўчаць. Бы песня помсціць
Тым, што не можа памагчы
Падняцца над сабой, шчаслівай,
Каб бегам думкі нецярплівай,
Трывогу — не перамагчы.
Я не пішу! Я гавару,
Я пець хачу, як маці пела,
Рыфмуючы з жыццём няўмела
Рук спрацаваных кожны рух.

"Я пець хачу..." — за словамі гэтымі прагавітае жаданне не проста нешта сказаць, а абавязкова выказацца. Ды так, каб тое, што ў цябе на душы, на сэрцы стала і іншым блізкім і зразумелым, а яно ператворыцца ў падобную існасць толькі пры ўмове, калі будзе надзіва праўдзівым. Але адной праўды яшчэ мала. Неабходна, як вядома, і тая высокая мастацкасць, што дае твору і самому творцу права прэтэндаваць на арыгінальнасць.

У Т. Бондар гэтыя дзве ўзаемадапаўняльныя якасці цесна звязаны між сабой. І гэта тычыцца, як ранніх, так і пазнейшых яе вершаў, у якіх яна звяртаецца да асэнсавання свайго пасляваеннага маленства. А пісаць было і ёсць пра што: ад ран памёр рана бацька, маці адна ставіла дзяцей на ногі.

Гэта тое, што не забываецца. Гэта — тое, што забываць злачынна недаравальна, хоць і знаходзяцца ўжо жадаючыя даводзіць, што Гітлер зусім і не заваявальнікам быў, а Кубэ, калі б яго не забілі падпольшчыкі, дык даўно стварыў бы суверэнную беларускую дзяржаву. Ды, як кажуць, Бог ім суддзя.

Мае яна і права сцвярджаць: "Год нараджэння. Год перамогі...", а гэта адзін з яе вершаў, у якім ёсць і такія радкі: "На прыску, ў дзежках, падыходзіць цеста // Галодных сноў, пасляваенных сноў". Сам па сабе вобраз "цеста ... сноў" настолькі арыгінальны, што, не задумваючыся, можна сказаць: ён — свой, іншымі не прыдуманы. Аднак Т. Бондар з самага пачатку свайго літаратурнага шляху тэмай вайны і пасляваеннага маленства не абмежавалася і хоць напісала нямала цікавых твораў, гэтая праблематыка не стала яе, вобразна кажучы, мастакоўскай візітоўкай. Дый па сутнасці і не магла стаць, бо Т. Бондар не з тых, хто, асядлаўшы надзейнага творчага канька, становіцца яго заложніцай.

Прыгадайма: "Я не пішу. Я гавару..." Гаварыць жа так, каб цябе па-сапраўднаму зразумелі, каб да цябе чуйна прыслухоўваліся, але каб з табой не толькі пагаджаліся, а і нават спрачаліся, можна пры той умове, калі ўдасца закрануць патаемныя струны чытацкай душы. Найперш, канечне, жаночай. Дый мужчынскай таксама. І невыпадкова Таццяна Шамякіна дакладна прыкмеціла, што Т. Бондар — "пісьменніца з рэзка выражаным мужчынскім інтэлектам, але са здзіўляючай жаночай інтуіцыяй". Праўда, гэта было сказана ў дачыненні да яе прозы, а калі канкрэтна — рамана "Ахвяры", ды сутнасць і ў дачыненні да паэзіі не мяняецца.

Лірычная гераіня паэзіі Т. Бондар — наша сучасніца, якая часта адчувае сябе непрыкаянай у гэтым жорсткім і непрадказальным свеце. Не ў апошнюю чаргу і ад таго, што ёй цяжка напаткаць сапраўднае каханне, тое самае каханне, ад усведамлення якога яна магла б адчуваць сябе роўнай з іншымі ў грамадстве ў цэлым і з любімым чалавекам у прыватнасці.

Назва адной з яе кніг — не проста невыпадковая, а шмат у чым і сімптаматычная — "Адна" (1989). Па-свойму характэрны і назвы іншых паэтычных зборнікаў: "Спадчыны боль" (1987), "Хачу назваць цябе каханым" (1991), "Час душы, мой час вячэрні..." (1995). Калі асабліва не ўдавацца ў змест твораў, змешчаных у іх, дык пункцірна яго можна пазначыць так: жанчына і грамадства, жанчына і час, жанчына і ...

А вось сваю палавіну — надзейную, вартую ўвагі, захаплення, усёпаглынальнай любові — яна якраз і не знаходзіць, хоць і настойліва шукае, не баючыся шчыра прызнацца: "Я слабая! Я жанчына і хачу любіць! Хачу, каб мяне любілі!". Падобнае прызнанне, праўда, прагучала ў празаічным "Дзённіку жанчыны", ды, не будзем забываць, што проза Т. Бондар — як бы працяг яе паэзіі, адзін з атожылкаў таго ж інтэлектуальнага дрэва, што настойліва, безупынку ўзрошчваецца ёю.

Валерый Ліпневіч слушна зазначыў, што лірычная гераіня паэзіі Т. Бондар — "жанчына-творца, якая высока нясе сваю чалавечую годнасць ... і такая безабаронная ў сваім жаданні кахаць і быць каханай". А адштурхоўваючыся ад кнігі "Святочны снег" (1981), прыйшоў да высновы, што "па страснасці, адкрытасці, якая даходзіць да гранічнай шчырасці, у беларускай паэзіі яе няма з кім параўнаць".

Паказальна і тое, што Т. Бондар дасягнула значных набыткаў і ў асваенні жанру паэмы (а ён, як вядома, па сіле далёка не кожнаму нават са знакамітых аўтараў), звяртаючыся да каларытных постацяў: "Рагнеда", "Доля" (Еўфрасіння Полацкая), "Белая літара" (Сымон Будны), "Ноч пасля смерці" (Фёдар Дастаеўскі). Але ў гістарычнай праблематыцы яна не замыкаецца толькі на канкрэтных лёсах, а і дае глыбокае асэнсаванне даўніх падзей у іх трыядзінстве, калі выстройваецца трывалы ланцуг, кожнае з асноўных звенняў якога мае сваю часавую прывязанасць: мінулае — сучаснае — будучыня. І нярэдка ў гэтай повязі на першы план зноў жа выступае жанчына, як, прынамсі, у паэме "Гон", у якой даўняе — своеасаблівы экран памяці, які высвечвае тое, што, незалежна ад часу не губляе сваёй актуальнасці, а ў дадзеным выпадку — гэта безабароннасць жанчыны:

Ловы ўдачы... Яна не міне
Тых, хто гоніць — загоніць аленя!
Я ўжо чую яго набліжэнне
Праз гады — праз вякі — да мяне...
Ад пагоні ўцякаю
Я, жанчына, — праз пушчу, вякамі.
Гон не скончаны. Доўжыцца гон.

Праблема гэтай жаночай непрыкаянасці глыбока вырашаецца ў тых творах, у якіх лірычная гераіня шукае свой шлях да Бога. Аднак для Т. Бондар, у адрозненне ад многіх іншых паэтаў, для каго падобная тэматыка ўсяго-наўсяго даніна модзе, гэтыя памкненні — душэўная патрэба і духоўная неабходнасць найлепей самавыявіцца. І выявіць сябе ўжо не ў часе, а ў Сусвеце і, таксама не баючыся прызнаць уласную слабасць, будучы ўпэўненай, што там, у існасць чаго мы толькі здагадваемся, але сутнасць яго ў гэтым сваім жыцці ніколі не ўсвядоміць, будзе іншае існаванне, пазначанае Богам і самім Бязмежжам:

Гады не пакідаюць спадзявання
На шчасце сярод гэткіх жа, як я,
Душа ж смыліць, і з кожным парываннем
Прымервае жыццё да жыція.

Прымервае і верыць, што аднойчы,
Пасля ўсіх мук, пасля ўсіх стрэч з бядой
Пачуе бласлаўленне дня і ночы —
Прасторы, для якой яны — адно.

Адно, закручанае ў рух, бязмежжа,
Дзе ўсё — ва ўсім,
і ўсё ва ўсім ёсць Бог,
Дзе ёй, душы, любы уздых належыць
На ўсім прасцягу незямных дарог.

Нялюба з рамана "Мечаная" ўвогуле адначасова існуе як бы ў двух часавых вымярэннях і калі-нікалі нават няпроста высветліць, дзе яна сама, а дзе яе маці, якая ўжо з гэтага свету трапіла ў той, што знаходзіцца па-за нашай свядомасцю. І ў гэтым нічога дзіўнага, бо Нялюба з тых людзей, якія носяць на сабе асабліва вызначальныя радзімыя знакі. Пра такіх жа ў народзе кажуць, што яны — мечаныя і знаходзяцца пад самай пільнай увагай самога Бога, а мечаныя (Нялюба — не выключэнне) тым і цікавыя, што інтуітыўна адчуваюць тое, вызначыць сутнасць чаго простым смяротным не дадзена.

Гэта відавочна і з такога дыялога:

"— Ты чаго-небудзь баішся?

— А ты — не?!

— Баяцца тыя, хто не чуе ў сабе Бога...

—А - а - а, а вось ты пра што... А ты, вось гэтая, вось гэткая — зямная, як і я! — чым ад думак пра смерць баронішся?

— Я ведаю, што смерці няма.

— Ведаеш? Адкуль? Адкуль ведаеш?..

— Ведаю... Ведаць не азначае памятаць..."

Пэўнае як бы раздвойванне асобы жанчыны бачыцца і ў аповесці "Паветраны замак". Таленавітая мастачка Міхаліна таксама прысутнічае быццам у дзвюх іпастасях, пры тым гэтыя "дзве" Міхаліны далёка не заўсёды прыходзяць між сабой да згоды, а прычына, правільней нават вытокі — тая ж адчужанасць жанчыны ў сучасным грамадстве. Суровая рэальнасць яе гняце, паўсядзённы побыт прыводзіць да душэўнага ачарсцвення, а хочацца чагосьці лепшага, больш узвышанага, таму ўзвядзенне ў марах "паветранага замка" — нішто іншае, як жаданне любой цаной вырвацца, вызваліцца з гэтых путаў, каб цалкам пераканацца, што асноўнае прызванне жанчыны — быць жанчынай і жанчынай заставацца, нягледзячы на ўсе перыпетыі лёсу.

І ў "Паветраным замку", і ў "Дзённіку жанчыны" плынь свядомасці гераінь часам нагадвае звычайны маналог, асноўная мэта якога адказаць на тыя няпростыя пытанні, якіх з кожным пражытым годам не меншае: "Што важней: быць шчаслівай ці прынесці няшчасце іншаму? Чым лячыць балючую душэўную адзіноту? Як не даць згаснуць у душы таму агеньчыку, ля якога абагравацца жыццё? Гэта не толькі мае пытанні, ды запытацца можна толькі ў самой сябе. Толькі ў сябе. Пытанні... Іх становіцца ўсё болей. Яны ўсё больш балючыя. Хоць з гадамі прыходзіць разуменне, што адказаў на іх хутчэй за ўсё папросту няма".

Уяўленне аб Т. Бондар не будзе поўным, калі не ўзгадаць такія яе творы, як — раманы "Спакуса" з пільным поглядам на эпоху, у якой жыла Еўфрасіння Полацкая і пра саму апякунку

Беларусі; "Ахвяры", у якім пісьменніцы ўдалося па-свойму прааналізаваць працэсы, звязаныя са сталінізмам, асэнсаваць таталітарную эпоху не толькі як насілле над чалавекам, а і разбурэнне самога чалавека як асобы. Дый колькасць напісаных аповесцяў не абмяжоўваецца прыведзенымі вышэй.

Ёсць у яе і аповесць "Імем Айца і Сына", эпіграфам да якой узята такое меркаванне М. Бярдзяева: "Апошняя таямніца чалавечая — нараджэнне ў чалавеку Бога. Апошняя таямніца Божая — нараджэнне ў Богу чалавека. І таямніца гэта — адзіная таямніца. Бо не толькі ў чалавека ёсць патрэба ў Богу, але і Богу патрэбен чалавек", што ў пэўнай ступені дае вытлумачэнне ўсіх сённяшніх мастакоўскіх пошукаў пісьменніцы, якая, сама ідучы да Бога, хоча, каб і іншыя абавязкова зразумелі перспектыўнасць гэтага шляху, як адзінага, што дазваляе чалавеку заставацца чалавекам у самым высокім разуменні ягонага прызначэння знаходжання на Зямлі.

...Зімовай парой з'явілася Т. Бондар на свет. Магчыма, таму так і любіць зіму. Ва ўсякім разе ў гэтым добра пераконваюць тыя вершы, у якіх ажываюць блізкія сэрцу вобразы, малюнкі, паўстае такая настраёвасць, што, чытаеш напісанае, а адчуванне, што гэта нарадзілася і ў тваёй свядомасці, хоць ты і не валодаеш паэтычным талентам. Неяк спакваля, непрыкметна пабачанае вылілася ў надзіва пранікнёныя, шчырыя і такія цудоўныя радкі, што іх хочацца паўтараць і паўтараць, спаталяючы сваю смагу аб па-сапраўднаму прыгожым і зямным, на што з-за імклівай хуткасці будняў часта не стае часу:

Зіма. Ну, вось яна й прыйшла!
Мільгаюць белыя афішы —
Усюды, дзе ёсць сколак шкла,
Усюды, дзе намерзла ціша.

Усё пазначана раней:
І гэта ноч, і гэта снежнасць.
Зіма. Вызвоньвае ўва мне
Падораная ёй бязмежнасць.

І, зразумела, любіць паэзію, але не толькі ў яе традыцыйным выяўленні, пішучы вершы, паэмы. Любіць і паэзію, як жыццёвую сутнасць. Як тую паўсядзённую рэальнасць, якую, калі ў цябе вока пільнае, а душа чуйная, талент вялікі, абавязкова заўважыш. Нават тады, калі скрушна і балюча сэрцу, а розум напаўняе смутак расчараванасці і часовай няпэўнасці. І зразумееш: ніколі бяда, гора, зло, людская няўдзячнасць не перамогуць радасць, шчасце, дабро, людскую шчырасць, калі цябе не пакіне вера ў лепшае.

З такой верай і ўпэўненасцю і жыве, працуе паэт, празаік, крытык, публіцыст, мастацтвазнаўца, а да ўсяго і перакладчык і не толькі на беларускую мову (нядаўна ў выдавецтве "Ириада-прес", што знаходзіцца ў горадзе Вышні Валачок у Цвярской вобласці Расіі, выйшла мініяцюрная кніжачка выбранай лірыкі самага любімага паэта Сярэднявечча ў Індыі Кабіра "Песни любви" ў арыгінале, а таксама ў перакладзе на рускую і англійскую мову, дык па-руску ягоныя творы цудоўна пераставрыла Таіса Мікалаеўна) Т. Бондар, якая даўно паставіла перад сабой высакародную мэту "ўласным лёсам спалучыць вякі" і нязменна прытрымліваецца гэтага крэда, упісваючы ўсё новыя і новыя свае старонкі ў гісторыю сучаснай беларускай літаратуры. І сапраўды не проста піша, а прамаўляе, каб знайсці свайго ўдзячнага чытача. І знаходзіць яго.

Больш чым красамоўны факт. Тыя, хто часта наведваецца ў сталічную кнігарню "Веды" — нагадаю, што размяшчаецца яна непадалёку ад будынка купалаўскага тэатра, не мог не заўважыць, які багаты ў ёй выбар букіністычнай літаратуры. І не толькі той, што трапляе пад вызначэнне "легкое чтиво", а і "сур'ёзнай". Што характэрна — у "Ведах" ахвотна прымаюць у продаж і кнігі беларускіх пісьменнікаў. Надоечы напаткаў і зборнік паэзіі Т. Бондар "Хачу назваць цябе каханым".

Адчуваю, як прачытаўшы гэта, сёй-той з тых, у каго адзіная радасць у гэтым свеце з каго-небудзь ці з чаго-небудзь пакпіць, гатовы радасна ўскрыкнуць: "Прадаюць!"

Купляюць, спадарочкі!

Калі праз дні тры зноў завітаў у "Веды", а наведваюся туды рэгулярна, кнігі Т. Бондар ужо не ўбачыў. Адна добрая душа паклапацілася, каб другая добрая душа прачытала. А што можа быць для пісьменніка больш радасным, чым усведамленне запатрабаванасці ягонай творчасці!

Алесь МАРЦІНОВІЧ

У ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫМ ЛАБІРЫНЦЕ

Крытык — гэта чалавек,
які ўмее чытаць
і вучыць гэтаму іншых.
Шарль Сэнт-Бёў

Беларуская крытыка — з'ява даволі супярэчлівая і ў пэўнай меры нават загадкавая. Не маючы яўна выражаных плыняў, накірункаў, школ і не надта цікавячыся крытычным вопытам іншых літаратур, яна ўпэўнена крочыць па ўласна створаным лабірынце да "светлай будучыні" — агульнаеўрапейскага літаратуразнаўчага ўзроўню.

Беларуская крытыка ў цэлым неардынарная, дзякуючы яе стваральнікам: ад высокапрафесійных літаратуразнаўцаў-традыцыяналістаў (Д. Бугаёва, У. Гніламёдава, М. Мушынскага, М. Тычыны і інш.) да стылёва разнастайнага пакалення "новых" крытыкаў (С. Кавалёва, Л. Галубовіча, і інш.). Сярод апошніх вылучаецца, магчыма, неіснуючая ў іншых літаратурах, цэлая плеяда жанчын-крытыкаў (А. Яскевіч, І. Багдановіч, Л. Рублеўская, В. Стральцова, Г. Кісліцына, І. Шаўлякова і інш.). Дарэчы, тэма так званай "жаночай" крытыкі апошнім часам актыўна абмяркоўваецца ў літаратурных колах, але пра гэта павінна быць асобная размова.

Беларуская крытыка абсалютна правамерна разглядае нашу літаратуру ў сусветным кантэксце, што, безумоўна, працуе на карысць і адной і другой. Сведчаннем таму — кніга доктара філалагічных навук, прафесара Івана Штэйнера "Deja vu, або Успамін пра будучыню" (Мн., 2003).

Ужо яе напалову іншамоўны назоў і загалоўкі змешчаных тут артыкулаў гавораць самі за сябе, напрыклад, "Баладныя пошукі Радзімы: "Смаленскі цыкл" Я. Купалы, баладыстыка Т. Траянава і М. Крлежы". Або артыкул "Л. Талстой і А. Адамовіч: урокі жыцця і творчасці", дзе даследчыку "бачыцца нешта агульнае, што аб'ядноўвае вялікіх філосафаў і пісьменнікаў пачатку і канца XX ст. Было нешта агульнае і ў іх душы, у свядомасці, светапоглядзе, што нельга растлумачыць проста запазычваннем класічных ідэй і іх прыстасаваннем да новых гістарычных умоў". Тут І. Штэйнер праводзіць цікавыя біяграфічныя, творчыя, духоўныя паралелі з асабістага і літаратурнага жыцця двух пісьменнікаў.

Пераканаўча праводзіць крытык параўнальны аналіз баладыстыкі У. Караткевіча, А. Разанава, В. Шніпа, М. Мартынайтаса, Ф. Віёна, Б. Лесьмяна ("Новое вино в старых мехах"), у час роздуму над творчасцю А. Наварыча згадвае прозу А. Купрына ("Вяртанне наперад").

У артыкуле "Я покажу тебе страх в горстке праха" І. Штэйнер разважае над тым, што літаратура доўгі час не вельмі хацела заўважаць перавернутасці свету, імкнулася знайсці шлях да ціхага і зразумелага мінулага, жахаючыся небыцця, якое чакае наперадзе. На фоне гэтага творы нашага класіка В. Быкава "ўспрымаюцца як адзіная філасофская прытча аб трагічнай долі беларуса; алегарычнае выяўленне спрадвечнай нацыянальнай трагедыі — родная зямля становіцца шчодрай да сваіх дзяцей толькі тады, калі прымае іх у сваё лона; напамін пра нашу выпадковасць на ёй, няўпэўненасць у сабе, вечную залежнасць ад некага больш моцнага і нахабнага, пра тое, што мы не гаспадары гэтага жыцця". І нечакана даследчык разглядае трагедыйнасць быцця беларусаў у творчасці В. Быкава праз прызму бестселераў "караля жахаў" С. Кінга. Разам з тым ён выказвае слушныя меркаванні наконт таго, чым выклікана адлюстраванне ў мастацкай эстэтыцы свету, заснаванага на "эфектах вульгарнай брутальнасці, алагічнасці, нізкасці". Справа ў тым, лічыць І. Штэйнер, што ў перыяд парушэння традыцыйных устояў, калі перавагу мае грубая сіла, у грамадскай свядомасці разам з расчараваннем і песімізмам "з'яўляецца неабходнасць вытлумачыць існуючае зло біялагічнымі, псіхалагічнымі прычынамі, знайсці вытокі ўсяго бруднага, нізкага не ў грамадскіх умовах, а ў самім чалавеку".

У такіх "экстрэмальных" умовах літаратурна-мастацкага жыцця крытыку, безумоўна, цяжка, бо ён павінен умець не толькі правільна прачытаць сённяшнюю літаратуру, але і навучыць гэтаму нашага капрызнага чытача. І. Штэйнер у артыкуле "De profundis, или Выход из критического лабиринта", аналізуючы крытычную творчасць І. Шаўляковай і прызнаючыся, што яму імпануе імкненне Ірыны спалучыць класічнае літаратуразнаўства з мадэрновымі сродкамі спасціжэння літаратуры, бачыць выйсце з лабірынту ў тым, каб не бегчы наперадзе аўтара і не цягнуцца павольна за ім, а крочыць побач. Пры гэтым трэба заўважаць аўтарскую адметнасць, адчуваць усе рухі яго душы, не замінаць палёту фантазіі, іншымі словамі, крытыка павінна быць люстэркам літаратуры (і, зразумела, не крывым).

Наталля ДЗЯНІСАВА

НА ДОСВІТКУ

Шаноўныя чытачы, вы ўжо знаёміліся з поглядам на зборнік вершаў Міколы Канановіча "І доўжыцца ноч..." у рубрыцы "ЛеТаЛІЗАЦЫЯ".

Аднак ёсць і іншыя погляды на творчасць гэтага паэта. А чаму б і не...

У 2003 годзе выдавецтва "Беларускі кнігазбор" выпусціла ў свет першую кнігу паэта Міколы Канановіча са Слоніма пад назваю "І доўжыцца ноч..."

Аўтар надзелены здольнасцю глыбока адчуваць і пазнаваць жыццё ў такім вымярэнні, як вечнасць. Менавіта да творчасці Міколы Канановіча можна аднесці радкі з Бібліі: "Трымайся вечнага жыцця, да якога ты пакліканы". Погляд на сучаснасць праз прызму вечнасці, настальгія, боль — усё гэта адмыслова занатавана ў вершах, якія ўспрымаюцца чытачом, "як агонь з душы апёкам". Паэту "холадна сярод людзей", холадна жыць "у краі нязбыўных мар". Сучаснікі перажываюць час "апакаліпсісу духу", і гэта вастрэй за іншых людзей адчуваюць паэты, унутраны зрок якіх "абвостраны да рэзі".

Узнёслы светапогляд аўтара не можа існаваць побач з жорсткай рэчаіснасцю, таму рассыпаецца "храм рамантычны ў пустэчы душы" лірычнага героя. Нямогадуша быццам "адзінокі птах, якому вырай толькі сніцца".

Паэзія — гэта пастаяннае аднаўленне духоўнай энергіі, нараджэнне новых думак і пачуццяў. Надзелены талентам, паэт М. Канановіч зноў і зноў адраджаецца, аднак, трагічнасць жыцця вядзе за сабою "жаданне зноў не нараджацца, каб кожны дзень не паміраць". Ды, насуперак усяму, паэт прагне ачышчэння, таму і спальвае сваё сэрца, каб зноў уваскрэснуць:

Ах ты, сэрца, сірата ў Айчыне!
Дзе цяпло і дзе твой Божы дар? —
На марозе двух стагоддзяў стыне...

Кніга М. Канановіча атрымала сімвалічную назву "І доўжыцца ноч..." Ноччу стаіць навокал "чорная глухмень", тады "грэх душою верхаводзіць". У гэты час лірычнаму герою найцяжэй, бо яго пачынаюць адольваць самотныя ўспаміны, "кола самоты" пачынае круціцца з шалёнай хуткасцю, памнажаючы адчай і настальгію. Ночы робяць паэта распятым на крыжы кахання, і ён то моліць у Бога палёгкі, то пакутліва ўзлятае да зор. Успаміны прыносяць боль, вярэдзяць раны душы:

На небе поўня. Лямпа на стале.
Цябе няма. І тут няма мяне.

Паэт перажывае боскае пачуццё, ён паліць сябе на самаахвярным вогнішчы кахання, згарае ў ім, клянецца ў вернасці:

Жанчына з усмешкай мадонны!
Навек я табой паланёны
І данясу да магілы
Нашага шчасця ўспаміны.

Ажываюць начныя прывіды, мроі і сны:

Я плыву ў гавань нашай ночы,
Маякамі — твае мне вочы.

Маленькімі астраўкамі памяркоўна-супакоенага настрою героя з'яўляюцца вершы "Грамніцы", "Юр'еў дзень", "У гасцях"...

Разам з вобразам ночы сімвалічным у зборніку з'яўляецца вобраз восені, якая блізкая паэту сваім болем, паміраннем і пакутай. Асеннія матывы ўзнаўляюць чытачу паганскія погляды беларусаў на свет, калі лірычны герой просіць палёгкі ў міфічных сіл прыроды:

У познюю восень
гадзінаю шарай
Змрочны лясун загукае
мяне...

Значнае месца ў зборніку М. Канановіча адведзена нашаму гораду, які ўяўляе сабою скажонасць каштоўнасцей.

Жыхары горада і вёскі, роднай Беларусі "бяспамяцтвам знявечаны". Паэт бачыць у сваім народзе святую сціпласць, ён кажа:

То чыста беларуская прырода —
Знаходзіць у надзеі суцяшэнне.

Увайшла ў зборнік і паэма М. Канановіча пад назвай "Фрагменты памерлых мар". Гэта лірычная паэма, якая працягвае тэмы, закранутыя ў вершах. Памерлі мары паэта, разбіўшыся аб жорсткую рэчаіснасць, але засталася душа, якую трэба берагчы ад бруду, застаўся герой і антыгераіня (ды ўсё ж жыццёвы пачатак і працяг), засталася матчына хата, цёплая печ, якая вылечыць хваробу паэта — адагрэе шматпакутную душу героя і натоліць яе новай жыццёвай сілай.

Вершы М. Канановіча пішуцца боскасцю душы, якая не памерла, бо пакутуе, а значыць, жыве...

Таццяна ТРАФІМЧЫК

ЮБІЛЕЙНЫ КАЛЯНДАР

◊ 135 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта-дэмакрата, фалькларыста і рэвалюцыянера **Адама ГУРЫНОВІЧА**.

Упершыню яго творы былі апублікаваны (з уступным артыкулам Б. Тарашкевіча) у газеце "Беларускі звон" (1921). У паэзіі быў паслядоўнікам Ф. Багушэвіча і выступаў з пазіцый рэалізму і народнасці. А. Гурынович пісаў таксама пейзажныя і элегічныя вершы, з'яўляўся адным з пачынальнікаў беларускай дзіцячай паэзіі. Ён сабраў цікавы этнаграфічны матэрыял, зрабіў шмат запісаў беларускага фальклору.

На вялікі жаль, значная частка творчай спадчыны Адама Гурыновіча загінула. Сам паэт памёр у ссылцы ў 1893 годзе.

○ Выданне кнігі "Белорусский уголовный розыск", аўтарам-укладальнікам якой з'яўляецца Юрый Кур'яновіч, оперупаўнаважаны па асабліва важных справах Галоўнага ўпраўлення крымінальнага вышуку МУС Беларусі, пабачыла свет у лістападзе мінулага года, якраз напярэдадні 85-годдзя крымінальнага вышуку. На яе старонках упершыню акрэслены асноўныя этапы станаўлення і развіцця службы крымінальнага вышуку, адлюстраваны малавядомыя факты, звязаныя з барацьбой супраць бандытызму і антысавецкіх узброеных фарміраванняў у 20-х і 40-х гадах, прыведзены найбольш важныя звесткі з біяграфій кіраўнікоў крымінальнага вышуку. Дарэчы, з нябыту вернута дзесяць імёнаў начальнікаў гэтай службы, у тым ліку — імя першага начальніка Галоўвышуку Галоўнага ўпраўлення рабоча-сялянскай міліцыі Антона Кавальскага.

З асаблівай цікавасцю чытаюцца нарысы і артыкулы пра аператыўнае становішча ў Беларусі на пачатку 20-х, калі сапраўднай пагрозай для савецкіх работнікаў і супрацоўнікаў новаствоpанай міліцыі былі "партызанскія рэйды" бацькі Булаховіча, пра дзейнасць крымінальнага вышуку ў 1937 годзе і сакрэтную нараду кіраўніцтва службы ў 1946, пра беларусізацыю міліцыі і інш.

— Пры падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі, — расказвае аўтар, — я прытрымліваўся галоўнага — найбольш поўна і аб'ектыўна адлюстраваць старонкі гісторыі службы. Гэта істотна і ў гістарычным аспекце і ў ідэйна-выхаваўчым. На жаль, мала хто з супрацоўнікаў органаў унутраных спраў, у тым ліку і крымінальнага вышуку, ведаюць гісторыю свайго ведамства.

Выданне будзе карысным не толькі для тых, хто працуе ў міліцыі, але і тым, хто цікавіцца гісторыяй праваахоўных органаў Беларусі.

Іосіф ПАЖОГА

Паспытай!

КАЗКІ АД "ЛЯЛЬКІ"

Пераважна музычныя казкі распавядае сваім юным гледачам Беларускі тэатр "Лялька", што працуе ў Віцебску. Да канца лютага (14, 15, 21, 22, 29 раніцай) тут ідуць, адпаведна, "Церам-церамок" С. Маршака, "Казка пра Ямелю" Л. Тарахоўскай, "Папялушка" Я. Шварца, "Адважныя браты" В. Мацвеева, "Воўк і раз, два, тры" Н. Мацяш.

А яшчэ рыхтуецца прэм'ера: казка У. Караткевіча "Забыты скарб". Яе ранішнія і дзённыя паказы абвешчаны на 26, 27, 28 лютага.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па віцебскіх тэлефонах: 36-90-77, 36-29-22.

З КУРЭЙЧЫКАМ І ЧЭХАВЫМ

Сёння і заўтра ў Мінску, на сцэне Купалаўскага тэатра можна паглядзець спектаклі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа.

Віцябляне прывезлі ў сталіцу дзве значныя для сваёй творчай біяграфіі работы: "П'емонцкі звер" А.Курэйчыка ды "Вішнёвы сад" А.Чэхава. Паказ адбудзецца, адпаведна, 13 і 14 лютага.

ПАЭЗІЯ

Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ

ГЭТА ЎСЁ ДЛЯ ЦЯБЕ...

* * *

Калі ты мне ўсміхаешся, тады
Здаецца, што ў асенні поўдзень шэры
Ўзыходзіць сонца і цвітуць сады,
І ў светлы рай адчыненыя дзверы.
І хай на момант здзейсніцца той цуд,
Калі ты — я, а я табою поўны,
Калі для нас з табой вось гэты поўдзень,
Вось гэты свет і любы сэрцу кут.
І я прашу: ты не адводзь вачэй,
Бо ў іх я праўдай і гаючай сілай
Напоўніўся, каб быць з табой яшчэ
І год, і век, пакуль трымаюць крылы.

* * *

Гэта ўсё для цябе — гэты горад і дзень,
І лістоты пажарышча ў парку асеннім.
Гэта ўсё для цябе! Я і тут, і нідзе,
Я і вочы твае, я і гэта імгненне.
Гэты горад, які мне знаёмы да слёз,
Да трымцення душы, да салодкай пакуты,
Я, нібы талісман запаветны, прынёс
Для цябе і для нас у святыя мінуты.
Гэта ўсё для цябе! Зіхацяць купалы,
Сонца лашчыць масіўных крыжоў пазалоту.
Я не ведаю, дзе яшчэ зноў і калі
Я сустрэну такую любоў і пяшчоту.
Я не ведаю, колькі яшчэ мне прайсці,
Толькі б вочы твае мне свяцілі, як зоры!
Гэта ўсё для цябе! Бо не знаю ў жыцці
Даражэй за цябе! І за любы мой горад.

* * *

Калі душа сціскаецца ад суму,
Ад адзіноты, роспачы, тугі,
Хачу знайсці сярод маны і тлуму
Святло вачэй, адзіна дарагіх.
І тонкіх белых пальцаў прахалоду
Адчуць, як недасяжнае святло.
І прамяняць няволю і свабоду
На ўсё, што паміж намі не было.
І патануць, і выплыць, і застацца,
І ўсё сваё жыццё перавярнуць.
І пра узрост у сэрца не пытацца,
І верыць у наступную вясну.

* * *

Я зноў перад табою вінаваты
За сівізну на скронях, за гады,
Што праплылі, як воблака над хатай,
Як вечаровы красавіцкі дым!
За неспакой, за мітусню, за роспач,
За выпадковасць розных дробных спраў.
За цішыню, за часу грозны рокат,
За тое, што цябе я напаткаў.
За тое, што тваю руку трымаю
У спадзяванні шчасця і цяпла,
За тое, што зрабіць з сабой, — не знаю.
Адзінае — каб ты заўжды была!..

* * *

Твой дзень народзін! Шэрань за вакном,
І праз туман мы зноў сябе знаходзім.
І ты бліжэй. І з кожным новым днём —
Твой дзень народзін.
Твая рука зноў у маёй руцэ
Дрыжыць спайманай палахлівай птушкай.
І нам кавярня — як сусвету цэнтр
І залатая стужка.
А я цябе няволіць не хачу,
Хачу, каб ты была са мною вольнай.
Ты загадай — як вецер палячу
Над ціхім полем.
Ну, а пакуль так сэрца зноў шчыміць,
І страшнавата мне пры ўсім народзе
Цябе з пяшчотай да сябе туліць
У дзень народзін.

* * *

А мне не верыцца, не верыцца
Каля знаёмага двара,
Што маладосць мая саперніца,
А сталасць — родная сястра.
Далонь твая птушынкай белаю
Застыне ля маёй шчакі,
І зноў перад табой нясмелы я,
І зноў разгублены такі.
Маё жыццё перавярнулася,
І я цяпер не знаю сам,
Дзе будучае, дзе мінулае,
І дзе я праўду напісаў.
Вось толькі ты — мая апошняя,
Мая таемная віна.
І сэрца зноў тугою поўніцца,
Як келіх цёмнага віна.
Дык вось планіда мне дасталася!..
І хоць прымай ты ўсё, як ёсць,
Калі вяртаецца за сталасцю
На момант дзіўны маладосць.



Мікола ШАБОВІЧ

* * *

Здаецца, мы знаёмыя даўно,
Бо ўсё й без слоў адразу разумелі.
Ты помніш, як, спаткаўшыся адно,
Ад кожнай хвілі блізкасці хмялелі.

Нібы знарок, нас нехта паяднаў
І падказаў сустрэчную дарогу.
І дзякуй Богу, я цябе пазнаў,
І ты мяне пазнала, дзякуй Богу.

О, як жа добра ля тваёй шчакі
Крылаціць мары, поўныя палёту!
Дазволь прыпасці да тваёй рукі,
Лавіць вачэй спагадную пяшчоту.

* * *

Толькі ты разумееш мяне,
Прабачаеш за хвілі няўвагі.
Дні былыя паклаўшы на вагі,
Толькі ты разумееш мяне.

У жыццёвай нямой мітусні,
Дзе гадзіны змяняюць гадзіны,
Твой пагляд супакоіць адзіны, —
У жыццёвай нямой мітусні...

"Толькі ты — мая мара і лёс", —
Як малітву, штоноч прамаўляю
І надзею на стрэчу люляю...
Толькі ты — мая мара і лёс.

* * *

Прычаліць воблака тугі,
З бяроз асыпаўшы лістоту.
Як пажывае твой Другі?
Табе ці дорыць ён пяшчоту?

Пакрыюць белыя снягі
Былыя сцежкі пакрыёма.
Цябе цалуе твой Другі,
Калі вяртаецца дадому?

Няўжо між намі — берагі,
Якія лучаць толькі вершы?
Як пажывае твой Другі?
Ці так, як Першы?

* * *

Не адыходзь так паспешна,
Не адыходзь.
Заўтра пад небам суцешным
Стрэціцца б хоць!

Толькі б убачыць далоняў
Ветлую вязь!
Будзь мне княгіняй да скону.
Я — твой князь!

Будзь мне світальнай усмешкай
Сёння й шматкроць.
Не адыходзь так паспешна,
Не адыходзь.

* * *

Вось і закончыўся лёсам падораны год
Нашай прыгожай, у вершах напісанай драмы,
Поўнай пяшчоты і самых шчаслівых прыгод.
Смутку, і жалю, і болю хапіла таксама.

Мы пастарэлі, ды ўсё ж не старэе душа,
Здольная шчэ летуценіць пра ночы сваволі.
Мы крок за крокам сябе вывучалі спярша,
Каб ні пра што шкадаваць не прыйшлося ніколі.

Сёння святкуем заслужаны свой юбілей.
Сонечны дзень, хоць вятры разгуляліся штосьці.
Моўчкі паходзім ля нашых самотных алей —
Сведак прызнанняў і вуснаў салодкай мілосці.

Колькі пачуццяў сутонь абуджалі не раз,
Колькі лагоды нам зорнае неба дарыла!..
Новы ўжо год распачаўся сягоння для нас
Сонечна-светла і так заварожана-міла.

* * *

Сум-трывогу развозяць аўто,
Граюць сюжы мелодыю тую ж.
І калі не ўратуе ніхто, —
Прыйдзеш ты і мяне ўратуеш.

Ўратуеш ад мройнай журбы,
Ад начэй, што не дораць адхлання,
Чарадзейная фея нібы,
Дзіўнавокая фея кахання...

Не знікай у далеч, у вышынь,
Без цябе зімавейна ў Сусвеце
Гэтых сумных людзей і машын
На падоранай Богам планеце.

АПАВЯДАННІ

ДВА БАНАНЫ

Таццяна ГАРЭЛІКАВА

Вясна была. Весела свяціла сонца, зелянела паўсюль маладая трава, кусты зялёныя, дрэвы. Прасторна. І людзі пасля зімы ажылі, у лёгкім адзенні, вясёлыя ды імклівыя. Дзед таксама нібы памаладзеў. І ад сонца, і ад людзей. Вясна ўсім дае надзею.

Сёння ён зноў купіць ёй два бананы. І можа, калі пашанцуе і падзаробіць, то яшчэ і апельсін. Толькі трэба, відаць, раней пайсці з дому.

Дзед так і зрабіў. Раніцай зварыў сабе аўсянку, зрабіў чай, батон са скрылікам масла. Спакойны, засяроджаны на сваім, паснедаў, памыў посуд, пасля ўзяў сваю карычневую балоневую сумку і пайшоў з дому.

Ён прыйшоў на ўзлесак. Зялёны рай. Узлесак гэты побач са шматпавярховікамі, і тут заўсёды ёсць людзі. Маладыя мамы прагульваюць у калясках сваіх дзетак, моладзь там-сям гойсае, дружна смяецца, сталыя людзі праходку робяць. Але не яны цікавяць старога. Сюды, пад зялёную хвойку, прыходзяць мужчыны выпіць, часта прыходзяць па двое, па трое, і большай кампаніяй. Вып'юць і, гучна размаўляючы, пойдуць. А ён, стары, падбірае за імі пустыя бутэлькі, а тады іх здае і за тыя грошы, што дадуць за бутэлькі, купляе гасцінцы ўнучцы. Пенсія малая, за яе бананы не купіш. А вось бутэлькі... Як калі пашанцуе. Але за дзень-два дзед назбірае іх столькі, што якраз хопіць унучцы на бананы.

Унучка ў яго вялікая. Вучыцца ў апошнім, адзінаццатым класе, лічы, дарослая. Ён і размаўляў з ёй, як з дарослай. Неяк сказаў:

— Ты б зайшла калі да дзеда, га, Яначка? Ты ж знаеш, дзе жыву. Гэта недалёка. Тры прыпынкі на аўтобусе. Прыбегла б калі. Гады два ўжо, як не была.

— Ой, што ты, дзеду! Столькі ўрокаў! Я ўрокі ўсе не паспяваю рабіць, сяджу да паўночы.

Ён і згаджаўся. Апошні год у школе. І праўда, шмат урокаў. Хаця... У нядзелю можна было б... Хай... Сам прыеду...

Стары прыязджаў да школы, дзе яна вучылася, к канцу заняткаў. Стаяў ля школьнай брамкі і чакаў. Згледзіць русявую галоўку сярод дзяцей — і радуецца душа... Уцеха дзеду. Адзіная. Ён жа яе, Яначку, маленькую, помніцца, на руках гушкаў...

Старая дзедава ўжо тры гады хутка будзе, як памерла. І ён цяпер адзін, як слуп. Ва ўсім горадзе. Сын ёсць... Але сын... Сын да бацькі не прыходзіць. І дадому да сябе не кліча. Быў неяк паехаў бацька да яго, на аўтобусе, тут і недалёчка, тры прыпынкі. Зайшоў. Не чакаў яго сын... Не рады яму. Ён і скажа што, і папытае, але сын мыкне, ды і маўчыць. Сядзіць на вузенькім белым табурэціку, высокі, мажны, белабрысы. Пасядзеў-пасядзеў з бацькам на кухні, пазяхнуў ды й кажа:

— Не трэба ты ўжо нікому. Аджыў сваё.

Стары і сціх. А сын зноў пазяхнуў, прыкрыўшы рот рукою. Уключыў радыё, песню паслухаў ды й кажа:

— Добра, бацька, ідзі. Няма мне калі з табой... Думаеш, мне так усё проста. Ты пойдзеш, а жонка будзе даймаць мяне: нашто ты яго клічаш сюды? Стары, хай сядзіць дома. Нада мне сварка гэта ў кватэры? Ну, не любіць яна цябе — дык што я зраблю?

І пайшоў стары. Як ён даехаў дадому... Але даехаў. І з таго часу больш да сына ні нагою.

Але была ў яго ўнучка, Яначка. Яна была школьніцай, і дзеда аднойчы прывяло да яе школы. Паглядзець хоць на яе, Яначку. Ён і ўбачыў яе. Яна ішла ў гурце дзяцей, весела гаманіла з сяброўкамі, шчабятала, падалося дзеду, і ён спярша пасаромеўся паклікаць дзяўчо. Але хоць паглядзеў, убачыў родны тварык — і тое радасць. І пачаў дзед час ад часу наязджаць да гэтае школы. Апошні ўрок, званок, а ён стаіць ужо ля брамкі. Паглядзець на яе. І аднойчы адважыўся, гукнуў. Унучка пачула, зірнула — і падбегла:

— Ой, дзядуля!

От ён і стаў ёй прыносіць гасцінцы. Апошнім часам купляе па два бананы. А калі пашанцуе, дык яшчэ і апельсін.

Сёння і праўда быццам шанцавала. Адразу на ўзлеску натрапіў на трох мужчын, яны ўжо дапівалі другую пляшку, і стары запыніўся недалёчка, за дрэвамі, стаў чакаць, калі яны пойдуць. Ён адчуваў у сабе нейкую сілу і нават рашучасць. Вакол было зялёна-зялёна. І ласкавае сонца. Іншы свет. Ужо ваўсю шугала ўверх трава, трапятала на дрэвах густая лістота. Так лёгка дыхалася. Вольна тут. На сцежцы два галубкі мітусіліся вакол кавалка батона. Шчыраваў большы, а меншага ўсё адганяў. Стары асцярожна, каб не разагнаць галубоў, нахіліўся, разламаў надвое батон і кінуў па кавалачку аднаму галубку і другому. Хай і таму, і таму добра будзе.

Мужчыны пайшлі, і дзед узяў пасля іх пустыя дзве бутэлькі. Потым яшчэ пазбіраў... Гадзінам к дванаццаці ў яго была поўная торба. Цяпер ісці ў прыёмны пункт, вунь у тым дзевяціпавярховіку, скласці ўчарашнія грошы за бутэлькі ды сённяшнія і купіць два бананы. На апельсін наўрад ці хопіць. Але на два добрыя бананы атрымаецца.

Ён так і зрабіў. Праз якую гадзіну стаяў ужо ля школьнай брамкі. Зазваніў неўзабаве званок. Як вераб'і, высыпалі чароткамі дзеці на школьны двор. Але Яначкі штось не бачылася. Даўгавата не было. Школьны двор пусцее ўжо. Вунь яна, вунь яна! Дзяўчына ішла ўдваіх з хлопцам. Тоненькая, у сініх джынсіках, якія прыгожа атулялі яе цела, русявыя валасы на чырвоную кофтачку спадаюць. А ён высакаваты, плячысты хлапец. Да-рос-лыя.

Стары прыціх, замёр, узіраючыся на ўнучку з ласкавай усмешкаю на твары. Чуў сваё цёплае сэрца.

Яна ўбачыла дзеда і спынілася... Потым зірнула ў твар хлопцу, штосЬ сказала яму і хутка пайшла да старога. Падляцела.

— Ты, дзеду... не прыходзь больш... Мне сорамна... — сказала, параўняўшыся. Апусціла светлакосую галаву. А потым падскокнула і пайшла ад яго. Да свайго хлопца, які стаяў наводдаль. І яны ўзяліся за рукі і, не азіраючыся, хутка пайшлі.

У старым затрымцела ўсё і расслабілася. Быў цэлы свет, і ён знік. Дзед нейкі час пазіраў унучцы з хлопцам услед і потым разгублена павярнуўся і, чамусь накульгваючы, пайшоў на прыпынак. Дачакаўся свайго аўтобуса, зайшоў, сеў і неяк даехаў да свайго мікрараёна. Слабка-слабка было ў грудзях.

Прыйшоў дамоў. Не помнячы сябе, выклаў з сумкі на стол два бананы. І ціхая сляза пакацілася па шчацэ. Патаптаўся на кухні, не ведаючы, куды пруткнуць рукі. Хадзіў-хадзіў туды-сюды з пакоя на кухню, з кухні ў пакой, не заўважаючы нічога вакол сябе.

Узяў сумку, у якую збіраў бутэлькі, пайшоў у недалёкі гастраном. Клыпаў між шэрых гмахаў, мінаў знаёмыя пад'езды з кустоўем, і ўсё было, як у смузе. Зайшоў у людны гастраном. Хадзіў там сярод людзей, сярод паліц з прадуктамі бездапаможны, як дзіця. Доўга не разумеў, што яму трэба купіць. Нарэшце, паклаў у магазінны кошык пачак кефіру і батон. Няўважліва стаяў у чарзе ў касу, і потым усё не тыя, што казала касірка, даваў грошы, аж пакуль яна з ветлівым шкадаваннем не ўзяла з яго рук кашалёк і не адлічыла патрэбнае. Пацягнуўся дадому. Пякло ў галаву сонца. Дзесь непадалёк гучна брахаў сабака, так гучна, аж увушшу рэзала.

Ля яго пад'езда стаялі тры мужчыны, ён і бачыў іх — маладзейшыя за яго, яшчэ не на пенсіі, але іншы раз заводзіў з імі размовы і прастойвалі разам па гадзіне. Яны штось сказалі яму ўслед, ён і чуў, але не меў сілы абазвацца ім. Ледзь патрапіў электронным ключом у ямачку на цяжкіх жалезных дзвярах, дзверы ціўкнулі, і ён, напяўшыся, пацягнуў іх на сябе, адчыніў. Зайшоў у пад'езд, у ліфт, вось сёмы паверх. Дзверы. Адамкнуў. Зайшоў у кватэру. Зняў чаравікі, і на кухні выклаў з сумкі на стол пачак кефіру і батон. Там, на стале, ляжалі два бананы.

Ён ціха апусціўся на табурэцік, што быў побач. І сядзеў здранцвелы. Гаварыла радыё, але ён яго не чуў. Рукі ляжалі на каленях. Праз нейкі час падняў вочы: як упершыню ўбачыў на стале нечапаныя пачак кефіру і батон. І два бананы. Гэтыя два бананы. Яны былі залацістыя.

Стары падняўся і, як у сне, пайшоў у пакой. Лёг на канапу. І памёр.

СТО ДОЛАРАЎ

Раніцой яны доўга ляжалі ў пасцелі, падняліся задаволеныя і шчаслівыя, і пасля, як пачалі мыцца-галіцца, было спадзяванне, што такім станецца ўвесь дзень. Увесь выхадны. Два нават.

Ды раптам зноў загрукалі зверху, з чацвёртага паверха. Малаток — грук-грук, і піла — джыг-джыг, і малаток, і малаток... Аж рэха разляталася па кватэры. Гэтак цягнулася ўвесь тыдзень штовечар, а сёння вось зранку.

Вадзім выскачыў з ваннага пакоя і вылаяўся. Штось не заладзілася і ў дачкі Каці.

— Папуля... — прыбегла да яго і прыткнулася да нагі.

— Ну, пачалося, — аказалася побач і жонка, Анжэліка.

— Вось я пайду! Я зараз да іх пайду і скажу! Будзе заява ў міліцыі! — аж пыхцеў Вадзім.

— Якая міліцыя... — вяла запярэчыла Анжэліка. — Яны міліцыі баяцца? Тут жа жывуць... Неблагі раён — але якія людзі? Зайздроснікі! Гатовыя на ўсё... Купілі кватэру і будзем пакутаваць...

А наверсе грукалі...

Учора Вадзім ехаў дахаты з думкамі пра выхадныя. Увесь тыдзень напругаперанапруга, і трэба было ўжо агледзецца, цешыла мара пра выхадныя. Жыццё буяла. Справы ў фірме ладзіліся, было прадчуванне вялікіх грошай і адчуванне свабоды. Праўда, мелася адна закавыка, але і ўпэўненасць, што за выхадныя ён усё прадумае і дадумае. У яго так часта бывае. Жонка гэты яго стан ведае. Ён можа сядзець сам сабе на канапе і думаць, і ніхто з дамашніх яго не зачэпіць. Ці будзе хадзіць моўчкі па кватэры, з пакоя ў пакой. Або з сабакам сядзець. Гладзіць яго, нібы забаўляецца з ім, але сам далёка ў думках сягае, у іншым свеце лунае. А можна, яшчэ адчыніць халадзільнік, вялізны, дзвюхкамерны — пажаваць ды папіць заўсёды ёсць што, халадзільнік повен...

І ўчора ехаў на сваім "Мерседэсе" дадому і ведаў, што гэтыя выхадныя будзе крутня мазгамі. А пасля можна і пакайфаваць. Дома. І вось табе выхадныя... Над галавой грукалі, аж люстры звінелі. Ясна, гэта на ўвесь дзень...

І што ты яму скажаш? Стрэнешся з ім у ліфце — ён не зніякавее перад табой, будзе стаяць, як генерал... Яны ўсе тут упартыя і злосныя...

Яшчэ гэты табурэцік дараблю — і ўсё, больш матэрыялу няма. Мог бы Іван, брат, зноў такога дабра падкінуць, ды штосьці носа не патыкае. Даўгавата не з'яўляўся. Відаць, у вялікіх заробках — быў майстрам на лесапільні, кінуў, будуе людзям дачы. Хай... Мае заробкі бяднейшыя — мо і хопіць адзін раз купіць Ніне лякарства, дужа ж яно дарагое... Пафарбую табурэцікі ды пазваню заўтра заказчыку — няхай забірае... Хапае заказчыкаў, паразвешваў аб'явы па пад'ездах: танныя табурэцікі...

Свет звузіўся вакол яго. Пасля настаўніцкай працы ў школе — занятак у кватэры, гэтыя табурэцікі. Даўняе ўмельства, а во згадзілася. Свет за апошні час неяк звузіўся. Гэта як змярканне. Хочаш — не хочаш, а свет звужаецца. Ён, Аляксей Сцяпанавіч, стаміўся. Не, фізічна не. Штось іншае... Мо таму, што дома няма з кім пагаварыць. Жонку за вясну—лета трэці раз паклаў у бальніцу, во зноў месяц там... Пазваніць дачцэ. Яна і сама часцяком тэлефануе. Дачка... Далёка дачка — аж пад Баранавічамі, замужам за вайскоўцам. У яе сваіх клопатаў пад завязку. Будуюць кватэру — за грошы, двое дзетак малых... І сын далёка — пасля універсітэта ў войску служыць, вясной вернецца... Вялікія ў яго дзеці, дарослыя. А ён ужо стары. Пяцьдзесят шэсць гадоў мінула. Хутка на пенсію. Усё жыццё адпрацаваў у школе, з дзецьмі, настаўнікам па літаратуры. Здаецца, без школы і жыцця няма. І Ніна настаўніца. Пачатковыя класы. Во пайшла на пенсію і захварэла, усё лета па бальніцах. І ён ніяк не можа выцерабіцца з безграшоўя. А тут яшчэ сто-о-олькі заплаці за кватэру. Засталіся ўдваіх у трохпакаёўцы. Ніколі так кепска не было... Выпетрала яго гэтая жончына хвароба: яна хварэе, а яму баліць. Іншы раз думаў: не дай Бог... як ён тады без яе будзе? І не ўяўляў, што так без яе кепска... Хоць два-тры разы яшчэ купіць гэтае нямецкае лякарства, бо ў бальніцы даюць нейкую танную замену... Насталі часы: бальніца — а ўсё там купі, лішнюю кропельніцу задарма не паставяць, халат, каб зайсці ў палату, без грошай не атрымаеш. Колькі плаціць трэба па дробязях...

І зноў ляцелі стружкі, джыгала піла, грукаў малаток...

Званок у дзверы — доўгі, пранізлівы. Хто гэта так? Ён адклаў малаток, выцер аб штаны рукі, пайшоў адчыняць.

Стаяла чарнявая маладая жанчына ў прыгожым зеленаватым халаціку.

— Я вас прашу! Мы не можам адпачываць! Мой муж!.. Не грукайце! Яму трэба адпачынак! — яна гаварыла, стрымліваючы сябе, здалося, зараз закрычыць.

— Прабачце. Калі ласка, прабачце... — разгублена павінаваціўся Аляксей Сцяпанавіч. І, разумеючы, што гэтага мала, шчыра прызнаўся: — Жонка ў бальніцы, няма за што купіць лякарства, во зарабляю...

Ад доўгай маўчанкі ў яго быў глухі голас.

— Не знаю! Але сціхніце! Мой муж! Яму няма спакою!

Яна ўсё не выгаварыла, у ёй яшчэ засталося сем разоў па столькі. Пайшла.

Аляксей Сцяпанавіч зачыніў дзверы і стаў, як слуп. Ну як ты цяпер будзеш рабіць? Уздыхнуў. Дазарабляўся. Трэба прыбраць усё гэта... Пастаяў, паглядзеў на сваю "майстэрню" на кухні. Сеў. Няўважліва вызірнуў у акно — сонечны дзень, людзі, дзяцей шмат, машыны ля пад'ездаў. І школу з акна ўбачыў. Сваю. Як родны дом. Апусцелая сёння. Зрабілі выхадны ў суботу... Кастрычнік, сонца, але яно ўжо не грэе. Уздыхнуў. Хацелася есці. Адчыніў халадзільнік — там толькі два яйкі. Падсмажыў бы — няма алею. І хлеба на адзін кус. Ён з'еў яго так, без нічога. Няма каму зварыць — няма дома гаспадыні. Сеў і доўга сядзеў на кухні. Нейкая млявасць на душы. "Пайду хоць куплю хлеба", — падумаў сам сабе. Хацелася выйсці на вуліцу. Перапрануцца толькі — настаўнік жа...

Анжэліка так не любіла гэтую таўкатню ў гастраноме. Асабліва ў выхадны — процьма людзей. Але муж захацеў мінералкі, і яна пайшла. Дома ўсё ёсць, повен халадзільнік, заязджалі ўчора ў супермаркет, ды забыліся купіць мінералку. Яна не ішла — плыла, адчуваючы ў сабе маладую сілу і радасць. Было нязыркае сонца, рудая лістота на асфальце. І дрэўцаў няшмат, маладзенькія яшчэ, але лістоты наскідалі. Залатая восень. І так хораша ўсё наўкола. Свет зіхацеў і пераліваўся колерамі. Усё хораша. І ў магазіне яна адразу пайшла туды, дзе стаяла мінеральная вада, якраз была такая, якую любіць муж, узяла дзве сінія пластыкавыя бутэлькі. Стала ў касу, уся сама ў сабе, аніяк не зважаючы на гэтую людскую таўкатню вакол. Падумала, што яна ўсё тут можа купіць, і наогул яна можа купіць усё. І на душы было вольна і прыемна. Але надта ж доўгая чарга ў касу. Ну, вось блізка ўжо, пару чалавек наперадзе. І толькі цяпер заўважыла, што перад ёй стаіць сусед, той, што жыве на чацвёртым паверсе. Да якога сёння званіла. Яна падцяла вусны. А той пачаў ужо расплачвацца. Бог ты мой, у кошыку ў яго бохан хлеба і кавалак лівернай...

Колькі стружак, кірсы, драўляных абрэзкаў. Завалена вітальня, кухня. Адзін табурэцік так і застаўся недароблены. Пафарбаваць сёння іх... А пакуль во трохі прыбяру тут. Зноў нехта звоніць у дзверы. Ён выпрастаўся, чуючы млявасць у нагах, пайшоў адчыняць.

— Здрасьце, — сказаў высокі малады мужчына ў белай майцы, сініх джынсах і белых красоўках. З ім на павадку вялікі чорны сабака.

— Добры дзень, — хітнуў яму галавой Аляксей Сцяпанавіч, пазнаўшы суседа знізу, чакаючы, што ён скажа.

Вадзім працягнуў яму зялёную купюру:

— На, бацька, табе грошы, толькі не грукай. Бо мне гэта... — паморшчыўся ён і шмарганўў рукой з павадком сабе па шыі.

— Ну што вы... — разгубіўся Аляксей Сцяпанавіч.

— Вазьміце, вазьміце, — соваў яму ў руку купюру Вадзім. — Я не бедны.

Аляксей Сцяпанавіч неяк няўцямна ўзяў. У яго павільгатнелі вочы. Вадзім тут жа тузануў сабаку за павадок, і чорны кудлаты пястун паслухмяна пайшоў з гаспадаром да ліфта. Быў гэты малады чалавек, і няма яго. Засталіся грошы. Аляксей Сцяпанавіч зачыніў дзверы. У кватэры паглядзеў: стодоларавая купюра. Сто долараў! Сэрца ёкнула: куплю Ніне, куплю... Ён расхваляваўся. Не знаходзіў сабе месца. Так проста ўсё рашылася. У мыйцы з вечара яшчэ стаяла горка талерак, ён ахвотна пачаў іх мыць. Вада дужа гарачая, пякла пальцы, але ён не зважаў. Гэта было неістотна. Нарэшце ён купіць так патрэбныя жонцы лекі, адразу дзве ўпакоўкі, і есці чаго добрага занясе ёй у бальніцу. І сам не будзе дужа эканоміць. Зарплата да таго ж хутка. Павальнела на душы. Свет расхінуўся.

Але нешта яго трывожыла, і ён насцярожыўся, пачаў прыслухоўвацца да сябе і ніяк не мог даўмецца, дзе што не так. Была нейкая далёкая-далёкая трывога. І раптам як хто падштурхнуў яго: а як з суседам гэтым знізу цяпер будзе? Ён узяў поўнае вядро стружак і кірсы, занёс ў смецце-правод. Вярнуўся ў кватэру. Пачаў прыбіраць у вітальні. Выпрастаўся. "Цяпер ты залежыш", — сказаў сам сабе. Ты перад імі... Апускай пры стрэчы галаву, згінай плечы, ліслива ўсміхайся... Згадалася школа, вучні. І ён ужо быў быццам на ўроку, і з ім літаратурныя героі, як жывыя людзі, ён знаў іх і любіў. І вочы дзяцей... Пацёр далонню лоб. Цяпер ты залежыш... І аж халадок між плячэй. Нешта прадаў за сто долараў — тое, што з ім было заўсёды, усё жыццё. Ён узяў са стала тую зялёную паперку, стаяў задуменны. А потым як схамянуўся. Пазваніць Івану, хай памагае Іван. Уссунуў на ногі туфлі, з прыкрасцю кракталнуўшы, пайшоў з кватэры. На трэці паверх. У руцэ была стодоларавая купюра. Вось яна, восемдзесят шостая кватэра. Зараз ён пазвоніць у дзверы. Там, за дзвярыма, забрахаў сабака.

ПАЭТ ФАРТЭПІЯНА

Другі вечар з цыкла "Фрыдэрык Шапэн — паэт фартэпіяна" рыхтуюць пад кіраўніцтвам сваіх педагогаў студэнты Беларускай акадэміі музыкі.

Праграма іх канцэрта, абвешчанага на 19 гадзін 25 лютага, пройдзе пад назвай "Вальсы. Мазуркі. Накцюрны." Вальсаў замоўлена толькі два з агромністай колькасці п'ес, створаных Ф.Шапэнам у гэтым жанры. Але абодва яны перасягнулі межы побытавай танцавальнай мініяцюры і гучаць як яскравыя віртуозныя канцэртныя творы. Паэтам фартэпіяна Ф.Шапэн, бадай, напоўніцу паўстае ў сваіх накцюрнах, якія сёння ўпрыгожваюць рэпертуар піяністаў усяго свету і, вядома ж, будуць прадстаўлены маладымі беларускімі музыкантамі 25 лютага. Ды найбольш рознабакова падаюцца шапэнаўскія мазуркі: мажорныя, мінорныя; жыццярадасныя і драматычна-меланхалічныя; шляхетныя і шчыра-немудрагелістыя, яны ў выкананні ўдзельнікаў праграмы складуць непаўторны вобраз унутранага свету геніяльнага кампазітара-рамантыка.

У праекце (дарэчы, яго аўтар — загадчыца канцэртнага аддзела Беларускай акадэміі музыкі Э.Скуратава, падтрымка — Польскі інстытут у Мінску) удзельнічаюць 9 піяністаў, сярод якіх і лаўрэаты міжнародных конкурсаў Любоў Старычэнка (клас А.Сікорскага), Людміла Канавалава (клас Я.Пукста), Аляксандр Музыкантаў (клас З.Качарскай). І яшчэ лічбы: у выкананні гэтага піяніста прагучаць два творы з дзесяці, уключаных у праграму.

С.Б.

АНОНС

З 14 па 18 лютага Беларускі саюз музычных дзеячаў чацвёрты раз прымае Эльжбету Гаеўску — выдатную выканаўцу на флейце, педагога, прафесара Варшаўскай акадэміі музыкі. Мэта яе візіту, які ажыццяўляецца пры падтрымцы Польскага інстытута ў Мінску, — прадоўжыць заняткі з маладымі беларускімі флейтыстамі. Апроч майстаркласаў, пані Гаеўска правядзе, як заўсёды, свой сольны канцэрт. Іграць наша госця будзе ўвечары 18-га, у камернай зале другога корпуса Беларускай акадэміі музыкі — будынак па вул. Чычэрына.

Беларускі саюз музычных дзеячаў рыхтуе традыцыйную імпрэзу — "Срэбны звон цымбалаў". Яна мае адбыцца ў лістападзе і, як заўсёды, у Маладзечне. Ужо чацвёртая па ліку, гэтая вядомая імпрэза мяняе сёлета свой статус, і замест усебеларускага фестывалю цымбальнага выканальніцтва будзе праводзіцца Першы міжнародны форум. Яго арганізатары запросяць гасцей з-за мяжы, якія возьмуць удзел у Міжнароднай навуковай канферэнцыі па праблемах цымбальнага выканальніцкага мастацтва і педагогікі. Апроч канферэнцыі, плануюцца два гала-канцэрты, конкурс салістаў і ансамбляў з пачатковых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў Беларусі, майстаркласы для маладых музыкантаў ды заняткі лабараторыі тэхналогій вырабу цымбалаў.

Перавод папулярнага фэсту "Срэбны звон цымбалаў" на больш высокі арганізацыйна-творчы ўзровень, у ранг міжнароднага форуму, адбыўся дзякуючы ініцыятыве Міністэрства культуры РБ ды Беларускага саюза музычных дзеячаў.

С.Б.

Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад прафесарска-выкладчыцкага складу:

— загадчыка кафедры інтэр'ера і абсталявання;
— дацэнта кафедры малюнка, жывапісу і скульптуры;
— старшага выкладчыка кафедры малюнка, жывапісу і скульптуры;
— старшага выкладчыка кафедры фізвыхавання.

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.
Заява і дакументы, згодна ўмовам аб конкурсе, падаваць на імя рэктара акадэміі на адрас: 220012, Мінск, пр. Ф. Скарыны, аддзел кадраў, тэл. 2237734

РОДАМ З ДЗВІНСКА

Марка РОТКУ ў энцыклапедыях і даведніках называюць амерыканскім мастаком. Аднак сваім нараджэннем ён абавязаны латышскай зямлі. І гэтага дастаткова, каб у Латвіі маглі ганарыцца таленавітым суайчыннікам і з вялікім гонарам святкаваць яго стогадовы юбілей. Але ж і для Беларусі Марк Ротка зусім не чужынец...

Пэўна, Ротка і не набыў такой гучнай славы, як Пікасо ці Шагал, але, відавочна, стаў ключавой постаццю ў мастацтве XX стагоддзя. У пасляваенным асяроддзі жывапісцаў ЗША ён быў адным з самых актыўных удзельнікаў дыскусій і выступленняў па праблемах мастацтва.

А нарадзіўся Марк Ротка (Markus Rothkowitz) 25 верасня 1903 г. у сям'і фармацэўта Маркуса Роткавіча ў Дзвінску (сёння Daugavpils, Латвія). Яму было 10 гадоў, калі ўся сям'я эмігравала ў Злучаныя Штаты і атабарылася ў Портландзе. Спачатку Марк жадаў набыць прафесію інжынера ці адваката і з гэтай мэтай у 1921-м паступіў у Йельскі універсітэт. Праз два гады перабраўся ў Нью-Йорк, дзе разам з Максам Веберам нейкі час вучыўся ў Мастацкай Лізе Студэнтаў (Arts Students League), хаця больш займаўся самаадукацыяй.

Сярод славутых мастакоў XX ст. Марк Ротка добра вядомы сваімі загадкавымі, медытатыўнымі, нават гіпнатызуючымі палотнамі. Ён адзін з найбольш лірычных прадстаўнікоў абстрактнага экспрэсіянізму, насамрэч адметная постаць у асяроддзі вольных мастакоў, якія ў 1940-я гады занялі ў творчасці дамінуючыя пазіцыі.

Да таго, як знайшоў уласную творчую манеру, М. Ротка, як і большасць мастакоў яго пакалення, працаваў у розных стылістычных напрамках. На працягу 20—30-х гадоў ён стварыў сотні фігуратыўных работ на паперы і палатне, маляваў nudes, партрэты, інтэр'еры, гарадскія і вясковыя пейзажы.

Ён паступова ішоў да радыкальнай трансфармацыі рэалістычных форм. Захапіўшыся сюррэалістычнымі ідэямі, Ротка ў канцы 30-х — пачатку 40-х гг. звярнуўся да грэка-рымскіх міфаў у серыі неакласічных карцін, кампазіцыі якіх нагадвалі рымскія саркафагі і грэчаскія фрызы з выявамі людзей, жывёл, міфічных істот. Адначасова ён цікавіўся прымітыўным мастацтвам, метафізікай, тэорыяй калектыўнага бессвядомага і архетыпаў, распрацаванай швейцарскім псіхіятрам К. Г. Юнгам.

Для ўсведамлення творчых пазіцый М. Роткі вельмі цікавы ліст, напісаны ім разам з А. Готлібам і Б. Ньюмэнам у "New York Times", рэдактару па мастацтве Э. Олдэну. "Для нас мастацтва — гэта падарожжа ў невядомы свет, — адзначаюць творцы. — Гэта свет уяўленняў, фантазійна вольны і жорстка супрацьлеглы ў адносінах да здаровага сэнсу. (...) Мы падтрымліваем простае выяўленне складаных ідэй. Мы — за вялікія формы таму, што яны маюць моцны ўплыў. (...) Мы — за пляскатыя формы таму, што яны знішчаюць ілюзію і адлюстроўваюць праўду. (...) Няма нічога лепшага, чым добры жывапіс ні аб чым. Мы сцвярджаем, што сюжэт важны і дапушчальны, калі ён трагічны і пазачасавы. Менавіта таму мы выказваем духоўную блізкасць з прымітыўным і архаічным мастацтвам". Але М. Ротка зусім не лічыў сябе абстракцыяністам, хаця яго творы, акрэсленыя літаратурнымі назвамі, на той час усё больш напаўняліся фармальнымі элементамі.

У яго творчасці 40-х гадоў адчувальныя ўплывы еўрапейскіх мастакоў, якія эмігравалі ў ЗША з пачаткам другой сусветнай вайны: І. Тангі, Ж. дэ Кірыко, Х. Міро, М. Эрнста. Сведчанне — тагачасныя акварэлі і карціны М. Роткі з раслінамі і птушкамі.

Як адзначаецца ва ўступным артыкуле да выдадзенага ў Латвіі буклета, працы мастака ў 1950-я гады зрабіліся асабліва драматычнымі, а каля 58-га ён адмовіўся ад яркіх колераў на карысць больш цёмнай палітры чырвоных, чорна-карычневых. Вельмі выразна гэта выявілася ў так званых "фрэсках Seagram", выкананых для рэстарана "Чатыры сезоны" ў Нью-Йорку, у фрэсках для Гарвардскага універсітэта і серыі твораў для Капэлы ў Х'юстане (1964—1967), штат Тэхас, якая пасля смерці мастака была названа ў яго гонар. Марк Ротка ў тагачасных творах, паводле яго ўласнага прызнання, "здолеў выйсці за межы самога сябе да такой ступені, якую раней лічыў немагчымай".

Пасля анеўрызмы ў 1968 годзе ён мусіў адмовіцца ад працы на вялікіх палотнах і сканцэнтравацца на больш камерным жывапісе з выкарыстаннем паперы і акрыла, замест алею і палатна. Але праз год вярнуўся да вялікіх фарматаў. Строгая і жорсткая арганізацыя

"НЕ АДМОЎЛЮСЯ НІКОЛІ..."

Святочныя дні былі яшчэ далёка, таму, каб наблізіць іх прадчуванне і прыўзняць настрой, беларускі бард Алесь Камоцкі прапанаваў імпрэзу. Літаратурна-мастацкая гасцёўня "Маладзік" запрасіла ўсіх жадаючых у Палац моладзі на канцэрт. У праграме бралі ўдзел Аляксандр Вашчанка, Сяргей Верамейчык, Васіль Прановіч, Паўла Караткевіч. Запоўненая зала сведчыла пра сапраўдную цікавасць слухачоў да беларускага раманса.

Пасля канцэрта мне давялося пагутарыць з Васілём Прановічам.

—Васіль, калі ты пачаў пісаць песні?

— Мне здаецца, што людзі знаходзяць сябе пасля нейкіх асаблівых жыццёвых падзей. Тады нешта пераварочваецца ўсярэдзіне, і разумееш, што пачуцці могуць выліцца ў верш, у музыку. Для мяне лета 2002 года сталася такім момантам. Захацелася прысвяціць вершы людзям, якія сталі асабліва дарагімі. А з музыкай няма праблем. Я пачаў ёй займацца з першага класа.

— Ты пішаш вершы, тэксты для песень толькі на беларускай мове?

— Так. Гучанне беларускіх мілагучных слоў мне прыносіць большую асалоду. Тым больш, я жыву ў Беларусі, таму лічу, размаўляць трэба на роднай мове.

— Як ты пазнаёміўся з Алесем Камоцкім?

— Гэта адбылося вельмі кур'ёзна ў жніўні 2003 года на канцэрце. І дзякуючы майму бацьку, які ўвогуле мае на мяне вялікі ўплыў. Заняцца гітараю, пісаць на беларускай мове — гэта яго ідэі, за што яму вялікі дзякуй. Дык вось, менавіта ён прапанаваў падысці да Алеся. Мы запрасілі барда на гарбату, потым я даў паслухаць яму свае песні. Так і завязалася наша знаёмства. Алесь — просты, шчыры чалавек. І, на маю думку, гэта самае галоўнае. Безумоўна, музычная тэма нас звязвае. Але ў нас вельмі часта бываюць гутаркі, калі нават і словам не згадваем пра музыку.



апошніх твораў М. Роткі дасягае асаблівага аскетызму ў спалучэнні двух простакутнікаў — чорнага і шэрага. Мабыць, гэта былі знакавыя колеры апошніх гадоў яго жыцця — 25 лютага 1970 г. Марк Ротка скончыў жыццё самагубствам, нібы адгарнуўшы апошнюю старонку творчасці слаўнага пакалення старых майстроў XX стагоддзя, апошнія з якіх завяршылі свой зямны шлях у 1980-я гады.

Летась у Даўгаўпілсе адбылося святкаванне 100-годдзя з дня нараджэння М. Роткі. У падрыхтоўцы і правядзенні юбілейных дзён, акрамя шэрага латвійскіх устаноў, актыўна ўдзельнічалі Нацыянальная Галерэя Мастацтваў у Вашынгтоне, Дзярждэпартамент ЗША, сям'я мастака. Ці не самымі значнымі падзеямі сталіся адкрыццё памятнага знака ў гонар Марка Роткі і правядзенне міжнароднай канферэнцыі "Дзвінск—Даўгаўпілс. Пункт адліку". У яе рабоце бралі ўдзел афіцыйныя прадстаўнікі ўрада Латвіі, госці са Злучаных Штатаў Амерыкі, Францыі, Вялікабрытаніі, Швейцарыі, Расіі, а таксама дзеці мастака — Крыстафер і Кэці Роткі. Пашанцавала трапіць туды і тром віцебскім мастакам — С. Баранкоўскай, Д. Мшару і А. Паўлоўскаму (яму выказваю вялікую падзяку за прадастаўленую інфармацыю і матэрыялы).

Прамовы былі захапляльныя і грунтоўныя. Прынамсі, пошукі вытокаў у развіцці авангарда пачатку XX ст. шмат у чым аб'ядноўвалі выступленні прафесара даўгаўпілскага універсітэта Ф. Фёдарава, загадчыка аддзела сучаснага мастацтва ў Рускім музеі (С.-Пецярбург) А. Бароўскага і гісторыка мастацтва з Нью-Йорка К. Вілкін. У сваім "Эсэ пра Дзвінск" Ф. Фёдараў распавядаў пра гісторыю Дзінабурга—Дзвінска—Даўгаўпілса і мультынацыянальнае грамадства, якое ўзнікла ў так званы расійскі перыяд. У паведамленні К. Вілкін адлюстраваліся тры пакаленні мастакоў, якія нарадзіліся ў Расіі і ў краінах Балтыі, — папярэднікі, сучаснікі і нашчадкі Роткі — людзі, якія пазней стварылі гонар амерыканскаму мастацтву...

Большасць яго твораў не мае кідкіх, эфектных назваў, многія пазначаны проста: "Без назвы". Але дастаткова аднаго погляду, каб адрозніць класічны стыль М. Роткі, адчуць эмацыянальны, не абмежаваны назвамі, уплыў яго работ. "Прагрэс у працы мастака, — сцвярджаў ён, — будзе ў дасягненні даступнасці, у знішчэнні ўсялякіх перашкод паміж жывапісцам і ідэяй і паміж ідэяй і гледачом". Думаецца, што дамагчыся гэтата мастаку ўдалося.

Міхась ЦЫБУЛЬСКІ,
кандыдат мастацтвазнаўства

На здымку: цырымонія адкрыцця памятнага знака ў гонар М. Роткі

— А як вы з Пашам Караткевічам, лепшым тваім сябрам, сталі ўдзельнікамі канцэрта?

— Алесь Камоцкі за паўтара месяца сказаў, што будзе ладзіць сустрэчу і прапанаваў узяць удзел. У мяне на той момант быў не такі багаты рэпертуар, каб можна было выбіраць. На працягу месяца з'явілася яшчэ некалькі песень, якія, на думку Камоцкага, аказаліся някепскімі. Я прапанаваў Пашу разам падрыхтаваць іх. На канцэрце мы выканалі тры песні: "Верш", "Мой горад", "Уладар свечак".

— Якім, на твой погляд, атрымаўся дэбют? Ці збіраецеся з сябрам далей працаваць у музычным рэчышчы?

— Здаецца, мы справіліся з задачай, нягледзячы на тое, што вельмі хваляваліся. Спачатку я нават забыўся на тыя словы, якія падрыхтаваў перад выступленнем, а потым усё пайшло як па масле. Ведаеш, мы ў захапленні. Так спадабалася, што вырашылі паціху напаўняць сваю скарбонку, каб потым запісаць на дыск. Ці збіраемся мы звязаць жыццё з музыкай? Паша марыць стаць вялікім медыкам, я — эканамістам. Зрэшты, не ведаю, што напаткае мяне ў будучым, але для сваёй душэўнай раўнавагі ад музыкі не адмоўлюся ніколі.

Валянціна КАЗЬМІНА

НА ЗДЫМКУ: Васіль ПРАНОВІЧ (справа) ды Паўла КАРАТКЕВІЧ.

Габрыэла РОТМАЕРАВА

У НЕБЯСПЕЧНАЙ ЗОНЕ

Пачатак быў шматабяцальным. Адразу на ўзлессі, у нізкарослым густым сасняку, мы знайшлі першыя грыбы. З вільготнага квітнеючага моху выглядвала цэлая сямейка баравікоў — на моцных ножках, з матавымі цёмна-карычневымі галоўкамі. Ада іх вырывала з моху, абдзьмухвала, абнюхвала, Руда — абразаў карэньчыкі, ачышчаў шапачкі ад ігліцы.

Прадзіраліся праз густы зіхоткі сасняк, расхінаючы перад сабой пругкія галіны, якія нібыта так і стараліся перашкодзіць грыбнікам, залазілі пад адзенне, калоліся. Сярод высокай травы мільгалі яшчаркі. Аднекуль выскачыў спалоханы шарак і кінуўся наўцёк — толькі кусты хісталіся следам.

У промнях асенняга сонца шаўкавіста блішчэлі лёгкія карункі павуцінак, на якіх гойдаліся павучкі. Глыбей у лес раслі высокія сосны — там гаспадарылі вавёркі, спрытна скакалі з галіны на галіну. Усюды панавала гаючая цішыня.

Але вось лес нібы сцяўся: у небе пракаціліся пагрозлівыя грымоты-трэск — як па сухой драўлянай падлозе рассыпаліся выспелыя дубовыя жалуды. Лес быў вайсковым стрэльбішчам, пра што сведчылі папераджальныя дошкі-указальнікі, а таксама раскіданыя ў траве пустыя гільзы, якія блішчэлі ў рэдкім сонечным святле, што прабівалася праз густую хвою. Але гэтыя гільзы іх не турбавалі, не палохалі, хутчэй узрушвалі таемнай нечаканасцю — як нешта неспадзявана-забароненае. Ім яшчэ ніколі не даводзілася шукаць грыбы ў забароненым месцы. Карцела перажыць нязвыклую трывогу ў нязвыклым асяродку. Салдаты сюды прыходзілі ў пэўныя дні і час — так казалі тыя, хто неаднойчы хадзіў на стрэльбішча па грыбы і вяртаўся з лесу з добрымі трафеямі. Грыбы, казалі "парушальнікі", растуць там так густа, нібы іх хто пасеяў.

— А не вельмі гэта небяспечна? — пыталася яшчэ ўчора Ада, і вочы яе ліхаманкава блішчэлі ў прадчуванні радаснай падзеі. Сама для сябе яна даўно ўжо рашыла, што насуперак усяму трапіць у гэты таемны лес. Сяброўка спрабавала адгаварыць яе ад рызыкоўнай вылазкі, бо стрэльбішча ёсць стрэльбішча, дарма, што вучэбнае. Але муж сяброўкі Руда не адгаворваў: падабалася яму Адзіна смеласць, узрушанасць, якія перадаліся і яму.

Стрэлы ўжо чуліся вакол, потым яны аддаліліся, перайшлі ў лагоднае вуркатанне аж пакуль зусім не сціхлі. Недаверлівыя вавёркі яшчэ нейкі час хаваліся на дрэвах, але потым зноў заскакалі сярод галін.

— Як мяркуеш, зноў будуць страляць? — спытала Ада.

Стральба на палігоне павінна была ўзнавіцца надвячоркам. Руда не адказваў. На кончыку яго носа прыліпла мушка з павуцінкай, ды ён не звяртаў увагі, быў вясёлы, прыемна ўзрушаны незвычайнымі перажываннямі.

Іх рукі сустрэліся, калі яны бралі грыбы з аднаго месцейка. Лёгкі ветрык данёс пах валасоў жанчыны і халаднаватай скуры яе рукі, пакрытай мяккім пушком, бы на спелым персіку. Калі яна яшчэ ніжэй схілілася перад ім, яе пругкія грудзі дакрануліся да рукі. І тады Руда сунуў ножык у поўны ўжо кошык і чорнымі ад грыбоў пальцамі пагладзіў яе шыю. І на шыі, і на светла-блакітнай футболцы засталіся бруднаватыя сляды — нібы на карце, акрэсліўшы далейшы шлях дзеянняў. Руда адчуў у галаве страшэнны шум, пад рукамі — падатлівае цела...

— Ну і здорава ў нас атрымалася, — уздыхала Ада, выбіраючы з валасоў павучкоў і хваінкі. Заўважыла, як з ілба Руда сцякаюць салёныя кроплі поту.

У небе зноў прагрымела, і лес застыў у трывожным чаканні. На гэты раз над імі пачуўся прарэзлівы свіст, потым дзесьці недалёка — выбух. Не згаворваючыся, яны ўскочылі з зямлі і пабеглі з небяспечнай зоны, як дагэтуль спуджаны заяц. На ўскраіне лесу, перад папераджальнай дошкай-указальнікам спыніліся перадыхнуць. Ада расшнуравала свае красоўкі і, трымаючыся рукой за Руда, стаяла на адной назе, вытрасала з абутку іголкі і нагадвала сабой моцненькі баравічок.

* * *

Вечар дыхнуў грыбным водарам, супам і дажджом, якім заканчвалася бабіна лета. Дажджыкі пляскалі па крамічных прыступках лесвіцы, якая вяла на тэрасу, дзе сядзелі Руда з жонкай і Адай. Абодва грыбнікі наперабой расказвалі, які гэта быў цудоўны дзень прыгод у забароненым лесе, якія прыгожыя павуцінкі, што серабрыліся паміж сасонкамі, якая небяспечная страляніна ў грыбных мясцінах. Успаміналі сасновы бор, прапахлы жывіцаю, у чароўным сонечным святле. Гаварылі, прыпыняліся, але адзін на аднаго не глядзелі. Дождж сек па калматых лісточках герані, яны дрыжалі і, нібы слязінкі, ранялі дажджавыя кроплі ў кветнік. Дах веранды падцякаў — яго трэба было даўно замяніць. Нейкі струменьчык заблукаў і, не знайшоўшы выхаду, праз дашчатую шчыліну збягаў за каўнер Рудавай кашулі. Другім разам Руда пэўна б незадаволена чмыхаў, цяпер жа толькі моўчкі пацепваў плячыма, калі шкляная халодная кропля трапляла на яго гарачае цела.

Жонка пільна паглядзела на Руда: спакойная рэакцыя мужа яе здзівіла.

— Вунь працякае, — прамовіла яна, каб толькі пацвердзіць, што Руда сапраўды сёння нейкі дзіўны. Звычайна пасля такой жончынай заўвагі ён абавязкова запярэчыў бы, прыняўшы яе за знявагу або за жаданне прынізіць яго. На гэты раз спакойна ўстаў з крэсла, пстрычкай збіў бруд з яе спадніцы і ўсміхнуўся.

— Калі працякае — мушу залатаць... Ці ж не так? — сардэчным тонам, міралюбіва прамовіў ён.

Дождж ішоў, не спыняючыся, лапатаў у кустах бэзу, церабіў па апалым лісці пад яблынямі ў садзе, халоднай вільгаццю дыхаў у расчыненыя вокны веранды.

Зірнуўшы на гадзіннік, жонка накіравалася ў пакой, каб прыгатаваць пасцель сваёй сяброўцы. Руда паспяшаўся за ёй. Памог надзець на старую коўдру падкоўдранік, навалачкі — на падушкі. Жонка паслала на ложак і свежую прасцінку, падклала яе канцы пад матрац, паправіла складкі. Дзесьці ў спецыяльнай літаратуры чытала, што некаторыя мужчыны, схібіўшы ў шлюбным жыцці, сваю віну падсвядома загладжваюць павышанай увагай да жонкі. Заўважыла проста так, наўздагад:

— Паслухай, я знаю, што здарылася...

Сказала і не зводзіла пільных вачэй з мужавага твару. На нейкі момант ён нібы скамянеў, вочы яго звузіліся. Але адразу ж схамянуўся.

— Што?

— Ведаю, што здарылася, але навошта пустыя размовы? — сказала жонка. — Пэўна, так... Падобнае з кожным можа здарыцца... Ды што там! Застаўся ж цэлы.

Руда як праглынуў язык: не ведаў, што і думаць.

— І ўсё ж прашу цябе, што б там ні здарылася, прашу цябе вельмі...

Жонка змоўкла, даючы яму магчымасць прыйсці ў сябе, ачуцца. Праз хвіліну яна ціха адышла ад яго. Разгублена трымаючы ў руках коўдру, ён стаяў, як распяты...

Ада прыпынілася каля герані, адкрытымі далонямі лавіла дажджыкі. Яны адскоквалі ад скуры і пырскалі ў твар, халадзілі яго, на далонях заставаліся лужынкі, якія зноў і зноў разбіваліся новымі кроплямі.

— Так што так, — прамовіла гаспадыня, падышоўшы да яе і, прыхіліўшыся да парэнчаў, перагнулася над кветкамі герані. На яе твары з'явіліся вільготныя праменьчыкі. Ада насцярожылася, напружана чакаючы далейшай размовы. Моцна сціснула пальцы ў кулак і апусціла руку ўздоўж цела.

— Кажаш, прыгожы дзень... — працягвала жонка. — Пражыла прыгожы дзень...

— Пэўна, пэўна, — падхапіла Ада з нейкім захапленнем. — Як прыкра, што ты не была з намі... Будзеш шкадаваць...

— А ці не было б нас замнога ў гэтым небяспечным лесе?

— Што ты маеш на ўвазе? — прамовіла Ада, збянтэжаная нечаканым пытаннем найлепшай сяброўкі.

— Хм... Вы ж былі ў забароненай зоне. А ты ведаеш, якая я страшэнная маралістка.

— Але ж... Што з гэтага вынікае?

— На самай справе... Што з таго, што ты была ў забароненай зоне, калі там стралялі. Нічога страшнага... Але ж ты добра ведаеш, што не пра тое размова, — дадала яна шматзначна.

Ада роспачна пазірала ў вочы сяброўцы.

— Ну, Крысціпана, і мужанёк у цябе! Балбатун, хіба не, Крысціпана? Але павер мне, нічога такога не здарылася. Сур'ёзна... І можаш быць упэўнена — ужо гэтага ніколі не здарыцца болей! Калі б я прадбачыла, што ён такі... — аж заікалася Ада, абураная паводзінамі Руда, гэтага малойчыка, які, мабыць, паспяшаўся пахваліцца жонцы здрадаю з яе найлепшаю сяброўкаю: хам, форменны хам.

Раніцою сяброўкі развіталіся досыць холадна. Ада ішла па размоклай, бруднай сцяжыне і хісталася, як падстрэленая.

Калі Руда з жонкаю засталіся адны, ён сказаў ёй:

— Не злуй на мяне... Не злуй. І прашу цябе — гэтую курыцу болей не запрашай...

Жонка, усміхаючыся, моўчкі падставіла яму свае губы, і ён горача пацалаваў яе — зусім не так, як звычайна цалуе муж.

Усё даруецца, гульня працягваецца.

Пераклаў са славацкай
Яўген КАРШУКОЎ

Фота У. КАГУЦЕНКІ

АНКЕТА

1. Ці з'явіліся, на вашу думку, на парозе трэцяга тысячагоддзя ў сучаснай беларускай літаратуры мастацкія творы (кніжкі, публікацыі, літаратурныя праекты), што сталіся не толькі новымі, але і *знакавымі*. Калі — так, то што гэтаму паспрыяла, калі — не, то што перашкодзіла?

2. Мужчынская і жаночая літаратура... Ці ёсць насамрэч падобнае творчае падзяленне? Што б вы маглі сказаць адносна жаночага і мужчынскага творчага мыслення і вычування, а таксама схільнасці да той ці іншай літаратуры мужчын і жанчын, як патэнцыяльных чытачоў?

3. Маральнасць у творчасці сучасных літаратараў, як яна вамі разумеецца? Наколькі сёння гэтае пытанне з'яўляецца актуальным і як яно ўплывае на чалавечую духоўнасць і нацыянальную культуру?

4. Што вам падабаецца ў штотыднёвіку "ЛіМ", што не? Якія рубрыкі і чые аўтарскія публікацыі вас цікавяць найбольш? Што вы самі прапанавалі б дзеля паляпшэння формы і зместу газеты?

Ці падпісваецеся вы на "ЛіМ" (набываеце ў шапіках) альбо — не (прычына)?

5. Якія крокі насустрач з абодвух бакоў могуць, на ваш погляд, паспрыяць збліжэнню пазіцый раз'яднаных літаратурных груповак дзеля захавання аслаблай нацыянальнай культурнай і духоўнай прасторы (мовы, літаратуры, мастацтва, традыцый) — беларускай дзяржаўнасці агулам?

Яўген Міклашэўскі нарадзіўся ў в. Лыскі на Беласточчыне (Польшча) у 1936 г. (пасля жыў у в. Вясеты ў Нясвіжскім раёне.) Вучыўся ў педвучылішчах Нясвіжа і Пінска, а таксама ў педінстытуце замежных моў. Працаваў рэдактарам у "Маладосці", літкансультантам у СП БССР. Выдаў шмат паэтычных (пад псеўданімам Яўген Верабей) і празаічных кніжак. Перакладае з англійскай і славянскіх моў.

Яўген МІКЛАШЭЎСКІ:

Новая лімаўская анкета цікавая тым, што яна прапануе чытачам штотыднёвіка не толькі пытанні, на якія трэба адказаць, але і завуаліраваныя літаратурныя, ці, можа, літаратуразнаўчыя тэарэмы, якія патрабуюць не адказу, а доказу.

1. Што новае, а можа, нават і знакавае, з'явілася ў нас на парозе трэцяга тысячагоддзя? Зразумела, у літаратуры. І сярод выдавецкіх навінак, і сярод часопісных публікацый — ва ўсіх жанрах. З таго, што я прачытаў, — асабліва вызначыць не магу. А прачытаць усё — практычна немагчыма, каб і хацеў. Патрэбен літаратурны компас — аб'ектыўная прафесійная крытыка, якая ўдзень і ўночы сочыць за творчым працэсам. Па-мойму, яна прачнулася і расплюшчыла вочы. І, як у дзіцяці, у яе пачалі праразацца першыя зубкі.

І ўсё ж, ці з'явілася што-небудзь новае? Калі сур'ёзна, наўрад. На свеце даўно, мяркуючы па ўсім, няма ўжо нічога новага. Ёсць толькі забытае старое (і то забытае не намі, а яшчэ да нас). А што да таго, каб з ходу нешта аб'явіць знакавым, мне замінае і жыццёвы, і гістарычны вопыт, збольшага засвоены чалавецтвам. Колькі знакавых твораў і творцаў прамільгнула толькі на працягу аднаго дваццатага стагоддзя! Цяпер — Бахарэвіч і Кундэра. А калі сур'ёзна, дык вялікае бачыцца на адлегласці, як сказаў рэфарматар-паэт яшчэ на досвітку дваццатага стагоддзя.

Шукаць новае, бясспрэчна, трэба — без пошукаў няма адкрыццяў. Я — за пошукі перш-наперш у змесце, абумоўленым і часам, і грамадскім ладам, а не толькі ў форме, і не на золку туманнага юнацтва, не на пачатку творчага шляху, а ў канцы, калі ты нешта зрабіў ці спрабаваў зрабіць.

Магчыма, такія нігілістычныя адносіны да эксперыментатарскіх "адкрыццяў стагоддзя" з'явіліся ў мяне таму, што я калісьці наеўся "Залатых пладоў" Наталі Сарот, аскома ад якіх засталася ў мяне на ўсё жыццё.

Стваральнікі новых, бессюжэтных раманаў, ці антыраманаў (называць іх імёнаў няма патрэбы) сцвярджалі, што пісьменнік, ствараючы свой свет, павінен ствараць яго з пылу, з нічога, а Бальзака і Талстога называлі "музеем". А гэта — мастацкая платформа сучаснага авангарда.

Я не прыхільнік такога свету, і, чым траціць час на новыя антыраманы, лепш перачытаць тое, што пакінула найбольшы след у душы і з цягам часу ўсё больш і больш вабіць да сябе. Ці, можа, жаданне перачытваць — непазбежная асаблівасць узросту?

Мне вельмі спадабалася ў свой час апавяданне Уладзіміра Караткевіча "Былі ў мяне мядзведзі". Перачытаў. Уражанне не змянілася. Гэтую цудоўную рэч можна параўнаць толькі з творамі Сетана Томпсана ці Джэйса Кервуда. А што да апавядання Івана Пташнікава "Пагоня", дык, чытаючы яго, міжволі ўспамінаеш аповесць Эрнеста Хэмінгуэя "Стары і мора" і апавяданні Джэка Лондана пра змаганне жывёл за сваё жыццё.

Бясспрэчна, без пошукаў новага нічога не бывае, але шукаць павінен талент, а не пашкоджаны розум.

2. Афіцыйнага, узаконенага падзелу на мужчынскую і жаночую літаратуру, наколькі я ведаю, няма. І ён у тэорыі пакуль не зафіксаваны. Але такі падзел маецца на ўвазе і трымаецца ў памяці. І выклікана гэта біялагічна-фізіялагічнымі асаблівасцямі прыгожай паловы чалавецтва, усё тое, што звязана перш-наперш з мацярынствам, з роллю жанчыны ў захаванні сям'і і выхаванні дзяцей, якую ёй, не змаўляючыся, аднагалосна адвялі мужчыны. А што да таленту, дык талент адзін, і асобных талентаў (адзін для мужчыны, а другі для жанчыны) не існуе. Ці ёсць прыкметная розніца, скажам, паміж раманамі Жорж Санд і Эміля Заля?

3. Храм чалавечай маралі цяпер ляжыць у руінах (гэта эпізадычна паўтаралася на працягу ўсёй гісторыі чалавецтва), і, калі яго ізноў не аднавіць, магчыма і прыйдзе другое прышэсце Хрыста.

Мараль, як святы дух, таемная і шматаблічная, і значэнне яе, як на сацыяльным і дзяржаўным узроўні, так і ў адносінах паміж людзьмі ўвогуле, пераацаніць немажліва.

Чаго стане варты літаратурны працэс, калі ён будзе ажыццяўляцца Беспрынцыповасцю і некампетэнтнасцю? А як вынік, здабытыя з іх падтрымкай усе літаратурныя тытулы і ўзнагароды?

4. У апошні час у "ЛіМе" зазеляненелі доўгачаканыя парасткі. І ёсць надзея, што не толькі зборнікі і зборнічкі як паэзіі, так і малой прозы, а і больш-менш буйныя творы — раманы, прынамсі, пералічаныя ў інтэрв'ю Таісы Бондар ("ЛіМ" за 9 студзеня г.г.) атрымаюць па магчымасці аб'ектыўную і добразычлівую ацэнку. Аднак і рэцэнзіі, як і мастацкія творы, павінны быць не толькі прафесійныя, але і цікавыя, інакш патэнцыяльны чытач сучаснай прозы, прачытаўшы нецікавую рэцэнзію, можа падумаць, што і раман ці аповесць, на якую яна напісана, такія ж нудныя і нецікавыя, як і сама рэцэнзія.

Добра было б, каб рэдакцыя "ЛіМа" змагла паведамляць і пра выхад кніг мастацкай літаратуры (як у дзяржаўных, так і ў прыватных выдавецтвах), якія рэцэнзаваць няма ніякай патрэбы. Навошта знішчаць кніжкі, тым больш маладых аўтараў, выдадзеныя з неверагоднымі фінансавымі цяжкасцямі? У рэшце рэшт і графаманы — творцы, і яны не вінаватыя ў тым, што прырода жорстка абышлася з імі і надзяліла іх жаданнем тварыць, не даўшы ніякага таленту. І калі такія аўтары не бяруць за горла і не патрабуюць ад рэцэнзента хвалебных рэцэнзій, навошта жорсткаю крытыкай пазбаўляць іх, можа, апошняй жыццёвай радасці — радасці ад выхаду сваёй кнігі?

А што да маладых, дык ім неабходна памагаць, нават і тады, калі гэтага яны не хочуць, але маюць бясспрэчны талент. Большасць маладых блудзяць не ў трох, а ў двух соснах — паміж інтуітыўнай цягай да традыцыі і спакусай пастаяць на галаве ў стойле авангарда.

Упершыню я выпісаў "ЛіМ" у 1949 годзе, калі жыў у вёсцы Кміты і вучыўся ў Сычоўскай пачатковай школе. Мне асабліва запомніўся адзін ліпеньскі вечар. Я прыехаў з поля, дзе пасвіў на ўзмежку кабылу Машку, і ўбачыў, што на прызбе сядзіць тата і чытае газету. Гэта быў першы нумар "Літаратуры і мастацтва", на якую я падпісаўся. З таго часу (з большымі ці меншымі перапынкамі) і пасёння падпісваюся на гэтую газету. Аднак узаемнасці ад "ЛіМа" ніколі не атрымліваў.

5. Якія крокі могуць паспрыяць збліжэнню пазіцый раз'яднаных літаратурных груповак? Да аб'яднання заклікаў у "Калонцы галоўнага рэдактара" і Анатоль Казлоў ("ЛіМ" за 21 лістапада 2003 года): "У рэшце рэшт (і гэта трэба ўсім! — **Я. М.**) пазбавіцца міжасабовых "войнаў" і час ужо зразумець, што ўсе мы, як "правыя", так і "левыя", "нашы" і "вашы" — робім адну агульную справу — Нацыянальную літаратуру!"

Зразумець сапраўды час, але па-сапраўднаму мы ўсё зразумеем толькі тады, калі тытанік беларускай літаратуры наскочыць на фінансавы айзберг і пойдзе на дно.

Асноўных груповак дзве (астатнія рассыплюцца, як "Бум-бам-літ") і збліжаць іх пазіцыі не трэба. Гэтыя пазіцыі стаяць на платформах розных менталітэтаў, а гэта значыць і светапоглядаў (ідэалогій), і эстэтычна-інтэлектуальных асаблівасцей, і мастацкіх густаў, і шмат чаго іншага. Другая прычына раз'яднання — групавы зямляцкі эгаізм.

Беларусь — шматнацыянальная краіна, і ў ёй нямала змяшаных шлюбаў, і ў выніку дзеці, якія нараджаюцца ад такіх шлюбаў, вылучаюцца не толькі біялагічнымі асаблівасцямі, але і з'яўляюцца спадкаемцамі камбінаваных нацыянальных традыцый. Адны — больш эмацыянальныя, другія — менш, і, у залежнасці ад гэтага, па-рознаму ўспрымаюць жыццё і, вядома ж, мастацтва і літаратуру. І асабліва яскрава гэта адбіваецца на адносінах да паэзіі і эстэтыкі слова.

Вясна, вясна жаданая,
Ты прыйдзеш зноў, ты вернешся!

Гэта паэзія ці не? "Паэзія", — скажуць адны. "Не зусім..." — адкажуць другія.

Прыхільнікам традыцый трэба памятаць, што паэзія павінна кранаць, хваляваць, узрушаць. Інакш — гэта графаманія. Як і авангард.

І Маякоўскі са сваёй здабычай радзія, і Максім Багдановіч са сваім сцвярджэннем: "Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш..." мелі на ўвазе адно: эстэтычна-інтэлектуальнае ўздзеянне "каштоўнага слова", якое здабываецца "из артезианских глубин" людскіх сэрцаў (Маякоўскі). Адным словам, верш павінен звінець, як звон, і толькі тады з халодных каменняў, на якія падобныя сэрцы, пырснуць іскры (Багдановіч). У сувязі з гэтым сцвярджэннем нашага класіка дарэчы прыгадаць і Лермантава. Як і тое, што Маякоўскі быў найвялікшым рэфарматарам традыцыйнай паэтычнай формы, аднак гаворыць не пра слоўныя вынаходкі розуму, а пра артэзіянскія глыбіні чалавечых сэрцаў.

Прыхільнікам літаратурнага мадэрну (і перш-наперш паэтычнага) патрэбна першароднае прызначэнне паэзіі. Інтэлектуальная эквілібрыстыка павінна таксама свяціцца, інакш яна ад тысяч тон слоўнай руды будзе адрозніваць толькі тым, што бясформенныя груды, якія прайшлі праз лабараторыі розуму, будуць нагадваць абстрактныя скульптуры невядомых дагістарычных істот. Прытым не трэба выпускаць з-пад увагі і тое, што традыцыя і авангард знаходзяцца на розных полюсах.

Ну і што, да якіх высноў мы прыходзім? Нам жа трэба аб'яднаць разрозненыя літаратурныя групоўкі. Дык з чаго пачынаць? З каморы. Неабходна тэрмінова знайсці стары і, напэўна ж, запылены літаратурны лозунг: "Болей паэтаў — добрых і розных!" і развесіць іх на фасадах рэдакцый і выдавецтваў.

Ідэальна было б сталічны літквартал разбіць на два сектары — традыцыйны і авангардны, даць кожнаму па часопісу ці два, зразумела, за кошт дзяржавы. І хай па законах канкурэнцыі і найноўшай дэмакратыі змагаюцца за сваіх чытачоў. Пад кіраўніцтвам холдынга.

Юрась НЕРАТОК нарадзіўся ў 1961 годзе. Працуе начальнікам канструктарскага аддзела.. Выдаў некалькі рускамоўных кніжак і кніжку вершаў "Фотаальбом".

Юрась НЕРАТОК:

1. Пра кніжкі і публікацыі пакуль рана гаварыць. Усё ж трэба адысціся на большую адлегласць, даць вытрымку часам. Тады і ўбачым іх знакавасць. З праектаў — стварэнне "Літаратурнага квартала". Відавочна, што гэта станоўчы факт. Нацыянальную культуру ўзбагачаюць творы, якія ў ёй застаюцца (становяцца папулярнымі ці (і) выходзяць за межы нацыі).

2. Несумненна, падзяленне ёсць, але яно чамусьці не залежыць ад полу аўтара. Напрыклад, проза Рублеўскай мне здаецца мужчынскай, а проза Наварыча — жаночай. Ну, а каму што падабаецца — справа асабістая. Я з задавальненнем успрымаю і тое, і другое.

3. Залішняя запатрабаванасць ад маральнасці абмяжоўвае творчасць. Белае на фоне чорнага ўспрымаецца святлей, чым, скажам, на фоне шэрага. А чалавечая духоўнасць — устойлівая субстанцыя і слаба паддаецца ўплыву. Твор можа з'яўляцца толькі меркай да духоўнасці канкрэтнага чалавека.

4. На "ЛіМ" падпісваюся, бо лічу яго сваёй газетай. І задавальняе практычна ўсё. Нават рубрыкі, якія пазначаю сабе малачытэльнымі, для некага могуць быць цікавымі. Веру ў прафесіяналізм і адчуванне меры рэдакцыйнай рады. Заўсёды з цікавасцю чытаю "ЛеГалІЗАЦЫЮ". Збліжае з газетай "Калонка галоўнага рэдактара" (ці надоўга хопіць?). Само сабой — паэтычныя і празаічныя творы. Адно б хацелася (і гэта тычыцца ўсіх выданняў холдынга): каб часам праскаквалі скандальныя і спрэчныя матэрыялы. Набіла аскоміну талерантнасць.

5. Асаблівага раз'яднання літаратурных груповак не назіраю, ва ўсякім разе — антаганізмаў і асаблівай варожасці няма, значыць, падзел умоўны. Культурную і духоўную прастору лічу не аслаблай, а звужанай. А расшырыць яе можа і павінна дзяржава: маю на ўвазе рассылку выданняў, а, магчыма, і кніг у школы, бібліятэкі і г.д. А ад пісьменнікаў патрабуецца адно: менш эксперыментаваць з мовай, якім бы спакуслівым гэта не здавалася. Бо цяжка патлумачыць людзям, якія ў свой час нядрэнна ведалі мову ў школе, чаму яна становіцца ўсё менш зразумелай.

Нажахкі скарынаўскай справы-2

У першай палове артыкула ("ЛІМ", 23.01.04) гаворка ішла пра дзейнасць прыватных выдавецтваў на пачатку 90-х гадоў. Зараз — аб праблемах выжывання на рынку тых, што засталіся, пра мажлівасць выдання імі беларускіх мастацкіх твораў.

На сённяшні дзень больш тысячы фірмаў маюць ліцэнзіі на выдавецкую дзейнасць. З іх сяк-так шавеляцца каля сотні — гэта тыя, што выдаюць з дзесятак кніжак у год. Ну, а больш-менш паспяхова існуюць — дзесяць-пятнаццаць, не болей! Сярод іх — "Тэхналогія", "Сучаснае слова", "Кніжны дом", "Кавалер паблішэрс", "Харвест", "Сэрвіт", "Амалфея", "Чатыры чвэрці", "Белпрынт", "Парадокс" ды "Беларускі кнігазбор".

"ПАРАДОКС"

У 1989 годзе былы журналіст-белтавец Уладзімір ШАРПІЛА адкрыў адну з першых у Беларусі прыватную газету "Парадокс". Потым разам з Анатолем Кудраўцавым — выдавецтва "Дайджэст", але неўзабаве двум мядзведзям у адным берлагу зрабілася цесна, і ў 1993 годзе Шарпіла заснаваў прыватнае выдавецтва "Парадокс". Папярэдняя выдавецкая дзейнасць дала яму магчымасць адчуць павевы на кнігагандлёвым рынку — што, колькі, якім коштам — і зарабіць першыя грошы. Шарпіла заклаў уласную кватэру і дачу, і на час выдання "Парадоксам" першай кніжкі меў пазыкаў на 50 тыс. долараў. Грошы пайшлі на камп'ютэры для рэдактарска-выдавецкага цэнтра, на друкарскую паперу, аплату паліграфічных паслуг, на арэнду памяшкання і да т.п. Толькі праз паўтара-два гады, выдаўшы і прадаўшы шэсць кніжак у камерцыйнай серыі "Прэзент" (дэтэктывы ды любоўныя раманы) агульным накладам у 300 тыс. асобнікаў, Шарпіла здолеў разлічыцца з пазыкамі і атрымаць першыя прыбыткі. Але хутка адчуў, што дэтэктывамі і любоўнымі раманамі чытач-пакупнік, што гаворыцца, наеўся. Тады Шарпіла распачаў выданне серыі дзелавой літаратуры "Поле цудаў: бізнес".

Уладзімір ШАРПІЛА, дырэктар выдавецтва "Парадокс":

— Але з 95-га года ва ўсёй краіне гэтаму бізнесу пачало пачувацца ўсё горш і горш. Асабліва з-за прагрэсіўных падаткаў на прыбытак і дададзеную вартасць — нядобрым словам памянёны "НДС"! На парадак скарацілася колькасць прыватных прадпрымальнікаў і ўтрая колькасць фірмаў — людзі сталі менш зарабляць, а значыць і менш купляць. Раней кожны з нас мог купіць любую ўпадабаную кніжку і паставіць на паліцу — будзе час, прачытаю. То з паніжэннем пакупніцкай здольнасці спажывец бярэ толькі самую неабходную кнігу. Падаў попыт — падалі тыражы. Ёсць такі выдавецкі паказчык — колькасць аркушаў-адбіткаў. Дык вось, у 1998 годзе "Парадокс" выдаў 10 млн. гэтых аркушаў-адбіткаў, а праз два гады — толькі 4 мільёны!

Пачаўся этап выжывання. Я ўжо не грэбаваў брашурамі ды дзіцячымі маляванкамі. Асабліва падтрымалі нас заказныя выданні за кошт аўтараў. Наклады іх, праўда, невялікія, асабліва не заробіш, а вось замова фірмы, прадпрыемства ці ўстановы... Напрыклад, кітайская амбасада замовіла 1,5 тысячы асобнікаў кнігі Міхася Шыманскага "Кітай з адкрытым сэрцам" — гэта ўжо быў добры прыварак! Ці тая замова Міністэрства спорту на 1000 асобнікаў даведніка беларускай каманды на Алімпійскіх гульнях у Сідні і Лэйк-Плэсідзе?!

Арганізаваў у "Парадоксе" аддзел рэкламы — на форзацах, адваротах, свабодных старонках сваіх выданняў размяшчаем рэкламу прадпрыемстваў, фірм, ну і, вядома, рэкламуем свае кнігі. Маем гандлёвы аддзел: каб не карыстацца паслугамі пасрэднікаў-аптавікоў, здаём сваю прадукцыю на рэалізацыю напрасткі ў кнігагандаль.

Дасціпныя камерцыйныя знаходкі Шарпілы асабліва яскравыя на прыкладзе фірмовага перакіднога "Календара дзелавога чалавека", што выходзіць накладам 80—100 тыс. асобнікаў. Мала таго, што на кожнай старонцы стаіць лагатып фірмы-фундатара выдання, тут можна сустрэць і такія, напрыклад, радкі: "30 студзеня. Нарадзіўся П. П. Шарыкаў, начальнік пададдзела ачысткі гарадской гаспадаркі". Ну хочацца падначаленым зрабіць прыемнае свайму шэфу на дзень нараджэння, збяруць у складкі 50 тыс. рублёў і маюць такі вось радок у календары! А ў тым календары — 365 старонак! Калі аддзел рэкламы парупіцца, то — памнажайце і лічыце!

— Гэта ж чысты прыбытак і ніякіх выдаткаў! Якая вам розніца, калі на вокладцы нашай кнігі стаіць маляўнічая рэклама, напрыклад, маскоўскага часопіса "Дзелавыя людзі", які ў абмен дае плошчу на сваіх старонках, дзе я рэкламую выданні "Парадокса" ці прадаю гэтую рэкламную плошчу іншым беларускім прадпрыемствам?

Вось так, па капейчыне, па капейчыне — і маем офіс на 240 кв. метраў, кнігасховішча на 600, свой транспарт. Трыццаць чалавек працуе ў "Парадоксе". Дзяржаве, каб стварыць адно рабочае месца неабходна затраціць 2 тысячы долараў! Каб яно хаця б напалову аддзячыла за маіх трыццаць, я б не праеў гэтыя грошы, не паклаў у кішэню, а набыў бы больш дасканалыя камп'ютэры і новы грузавік...

На стале ў Шарпілы ляжыць арыгінал-макет "Слоўніка лексічных формаў" — сінонімаў, антонімаў, амонімаў, паронімаў у беларускай мове. Ён неўзабаве з'явіцца на паліцах кнігарань трохтысячным накладам. Яшчэ раней "Парадокс" выдаў шэраг беларускіх слоўнікаў і даведні- каў — тлумачальны слоўнік, арфаграфічны, беларуска-рускі і руска-беларускі, даведнік "Пішам без памылак" і да т.п. Вядома, ёсць больш поўныя і грунтоўныя акадэмічныя выданні такога зместу, але ўсе яны даўно раскуплены спецыялістамі. А для паўсядзённага, масавага ўжытку добра мець пад рукой скарочаныя выданні "Парадокса".

— Калі дзяржава замовіць "Парадоксу" выданне мастацкага твора (няхай, праўда, нейкая камісія пры Саюзе пісьменнікаў, ці пры Міністэрстве інфармацыі вызначыць гэтыя вартыя выдання творы), я згодны канкурыраваць з дзяржаўнымі выдавецтвамі і, думаю, паспяхова канкурыраваць. Мае выдаткі на выданне кнігі будуць значна меншыя, чым у іх. Пры маім невялікім прыбытку дзяржаве танней абыдзецца гэтая кніга. З пяток малапрыбытковых кніжак у год наш "Парадокс", думаю, у стане адолець. І такіх прыватных выдавецтваў, заклапочаных становішчам у беларускай літаратуры і гатовых надрукаваць дватры мастацкія творы, з дзесятак набярэцца. А гэта — 20—25 беларускіх кніжак у год! Каб зацікавіць нас, рычагоў хапае — гэта, у першую чаргу, падаткі. Сёння і камерцыйнае выданне і беларуская кніжка абкладаюцца аднолькавымі падаткамі. Думаю, гэта неправільна...

"БЕЛПРЫНТ"

Прыватнае выдавецтва "Белпрынт", якое працуе на кніжным рынку больш дзесяці гадоў, распачынала сваю дзейнасць нетыпова. У пачатку 90-х яно друкавала шмат рэлігійнай літаратуры (у асноўным "Біблію") на замежных мовах па заказах з Францыі, Галандыі, Партугаліі і г.д. Таму за бюджэтныя выданні не змагалася і крызісу 95-га года амаль не адчула.

Аляксандр ХАМІЦКІ, намеснік дырэктара "Белпрынта":

— Пазалетась у Беларусі па Указу № 312 на працягу года для ўсіх выдаўцоў і на ўсе выданні, акрамя рэкламных, была нулявая стаўка "НДС". Мы ўздыхнулі з палёгкай. Але гэты Указ адмянілі. Думаю, зрабілі гэта з гарачкі не зусім разумна. На беларускамоўныя кніжкі, а яны складаюць зусім невялікую долю ад усіх выданняў, нулявую стаўку падатку "НДС" трэба было пакінуць. Ці хоць бы адчувальна змен- шыць. У той жа Расіі і на Украіне гэтыя падаткі ўдвая мягчэйшыя, чым у нас.

Калі пачаўся выдавецкі крызіс у Беларусі, мы знайшлі сабе нішу — пачалі выдаваць канцылярскую прадукцыю: штодзённікі, фірменныя блакноты, календары і г.д. Усе гэтыя выданні павінны быць палепшанай якасці. Таму ўсю сыравіну мы вымушаны купляць у Еўропе — формныя пласціны, фарбы, паперу. Завозіць яе і вывозіць гатовую прадукцыю. А гэта дадатковыя накладныя выдаткі. Але з-за ўсё таго ж "НДС" наша прадукцыя неканкурэнтная на рынку з вырабамі Расіі і Украіны.

Дарэчы, наколькі ведаю, у Балгарыі, напрыклад, у Славеніі, выданні на роднай мове маюць ільготнае падаткаабкладанне.

Каб прыцягнуць прыватных выдаўцоў да выпуску беларускіх кніжак, трэба іх заахвоціць — тым жа паніжэннем падаткаў.

Што яшчэ іх насцярожвае? Калі выдаючы на рынак камерцыйную кніжку, той жа "Парадокс" ці "Белпрынт" рызыкуюць сваім прыбыткам, і таму разлічваюць яго прыблізна — як кажуць, тут выйграў, тут прайграў... Але сам сабе гаспадар. То ўзяўшыся за бюджэтнае выданне кнігі, яны будуць павінны разлічыцца з дзяржавай капейчына ў капейчыну! Беларускамоўныя выданні, прынамсі, трэба размяжоўваць на дзве катэгорыі — мастацкую літаратуру і падручнікі. Ад бюджэтнага заказа на выданне падручніка толькі дурань адмовіцца! Але такіх замоў прыватныя выдаўцы і не мелі, і не спадзяюцца на іх.

— Тая ж бяда і са спонсарамі-фундатарамі. Яны не маюць ніякіх падатковых ільгот, на укладзеныя грошы ў дабрачынную справу. Некаторыя з іх за гонар палічылі б фундаваць выданне кніжкі таленавітага, вядомага пісьменніка (асабліва земляка!)

У мінулым годзе Міністэрства інфармацыі звярталася ў Саўмін з просьбай зменшыць падаткі на беларускамоўныя кнігі культуралагічнага і навуковага кшталту. Але на ўзроўні міністэрстваў фінансаў і эканомікі той ліст дзесьці запраторыўся і пра зрухі нічога не чуваць...

"БЕЛАРУСКІ КНІГАЗБОР"

Зусім нядаўна выйшла з друку кніга твораў Францішкі Уршулі Радзівіл у серыі "Беларускі кнігазбор". У гэтым шэрагу яна ужо — 26-я! А напачатку — нават не верылася, што справа выгарыць.

Кастусь ЦВІРКА, старшыня Міжнароднага грамадскага аб'яднання "Беларускі кнігазбор":

— А пачалося з таго, што ў 93-м годзе я склаў план-каталог на 200 лепшых кніг усіх часоў тых аўтараў, што мелі хоць якое дачыненне да Беларусі. Пішучы кандыдацкую пра Ул. Сыракомлю, прыйшоў да высновы, што мы маем такую (!) літаратуру XIX стагоддзя і амаль не ведаем яе... З гэтым планам доўга хадзіў па чынавенскіх кабінетах і толькі знайшоў спагаду і разуменне ў тагачаснага намесніка міністра друку С. Нічыпаровіча. Было створана Міжнароднае грамадскае аб'яднанне "Беларускі кнігазбор", дзяржава абяцала дапамогу з фінансамі. На падрыхтоўку арыгінал-макета першага тома "Ян Чачот" патраціў свае грошы, атрыманыя з Фонду Сораса на хрэстаматыю "Літаратура Беларусі. І-я пал. XIX ст.". Сам складаў, перакладаў, рэдагаваў і чытаў карэктуру. І вось у 95-м годзе выйшла першая кніжка "Беларускага кнігазбору". 50 працэнтаў фінансавала Міністэрства друку, 50 — збіралі з шапкаю па фундатарах. Кніга надзіва хутка разышлася, кнігагандаль не затрымаў разлікаў. Мы пачалі працаваць... І вось падрыхтавалі шостую ці сёмую — збор твораў Яна Баршчэўскага, вырашылі фінансава стаць на ногі і замовілі наклад аж у 7 тысяч асобнікаў! І ўсё б было добра. Ды грымнуў жнівень 98-га... Мы зноў аказаліся на бабах! Добра тады Лукашэнка загадаў у дапамогу пісьменнікам стварыць выдавецтва пры Літфондзе. Атрымалі Прэзідэнцкі грант на кніжку Я. Брыля. "Кнігазбор" супольна з Літфондам так-сяк працягваў выдаваць тамы з серыі. Распачалі новую — "Беларускі гістарычны раман" і выдалі чатыры кнігі. У серыі "Мастакі Беларусі" — альбом Я. Драздовіча... Цяпер у "Беллітфондзе" няма грошай і ў "Кнігазбора" таксама. А серыю трэба працягваць! Пойдзем зноў з шапкаю да фундатараў. Надзея ж жыве! У рабоце кніга твораў Аляксандра Ельскага...

* * *

Якія, здавалася б, непадобныя клопаты ў гэтых трох прыватных выдаўцоў? А беды адны і тыя ж! Шмат у якіх краінах выдавецкі бізнес лічыцца высокапрыбытковым, а нашы выдавецтвы ледзьве ногі перастаўляюць. І прыватныя, і дзяржаўныя...

Алесь ГАЎРОН

Ідзе падрыхтоўка II пленума праўлення Беларускага саюза музычных дзеячаў. Ён пройдзе 27 лютага ў Мінску. Апроч арганізацыйных пытанняў, дэлегаты пленума абмяркуюць асноўную, вынесеную на парадак дня, праблему: "Аб ролі Беларускага саюза музычных дзеячаў у працэсах развіцця музычнага мастацтва рэспублікі". Даклад зробіць старшыня праўлення БСМД прафесар Міхась Дрынеўскі.

Секцыя крытыкі і літаратуразнаўства СБП абвяшчаюць конкурс на лепшы твор у галіне літаратурнай крытыкі.

Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца не апублікаваныя дагэтуль творы па наступных жанравых намінацыях:

— аналітычна-аглядны артыкул (аб'ём — да 20 друкаваных старонак);

— літаратурны партрэт (аб'ём — да 15 друкаваных старонак);

— рэцэнзія (аб'ём — да 7 друкаваных старонак).

Матэрыялы прымаюцца ў двух экземплярах толькі ў друкаваным выглядзе (старонка фармату А4, прыкладная колькасць знакаў на старонцы — 1600), з 1 лютага да 31 мая 2004 года па адрасе:

220034, г. Мінск, вул. Фрунзе, д. 5, пакой 203; тэл. 236-03-48.

Па выніках конкурсу мяркуецца правядзенне навукова-творчай канферэнцыі і выданне зборніка лепшых твораў.

"НАПАЧАТКУ БЫЛА ПЕСНЯ..." — пад такой назвай 17 лютага ў вялікай зале Дома літаратара адбудзецца творчая вечарына паэта і барда Эдуарда Акуліна.

У імпрэзе бяруць удзел Ніл Гілевіч, Анатоль Вярцінскі, Вольга Іпатава, Леанід Дранько-Майсюк, Алесь Пашкевіч, Міхась Скобла, Алесь Камоцкі, Кастусь Герашчанка, Лявон Тышкевіч і іншыя вядомыя паэты і барды.

Запрашаюцца ўсе прыхільнікі беларускай паэзіі і песні.

Пачатак вечарыны ў 18-30. Уваход вольны.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры

аб'яўляе конкурс
на замяшчэнне пасад:

— кафедра філасофіі: загадчык кафедры, старшы выкладчык;
— кафедра замежных моў: выкладчык
— кафедра фізвыхавання і спорту: прафесар, дацэнт;
— кафедра культуралогіі: загадчык кафедры;
— кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры: старшы выкладчык;
— кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці: старшы выкладчык;
— кафедра этналогіі і фальклору: загадчык кафедры, прафесар, старшы выкладчык;
— кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: загадчык кафедры;
— кафедра тэатральнай творчасці: дацэнт, старшы выкладчык;
— кафедра рэжысуры абрадаў і святаў: прафесар, старшы выкладчык;
— кафедра харэаграфіі: дацэнт;
— кафедра мастацтва эстрады: загадчык кафедры, дацэнт, старшы выкладчык, выкладчык;
— кафедра духавой музыкі: дацэнт, старшы выкладчык;
— кафедра харавога і вакальнага мастацтва: прафесар, старшы выкладчык, выкладчык;
— кафедра беларускай народна-песеннай творчасці: старшы выкладчык;
— кафедра народна-інструментальнай творчасці: выкладчык;
— кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый: дацэнт.

220001, г.Мінск, вул.Рабкораўская, 17.

Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі

аб'яўляе конкурс
на замяшчэнне пасад
прафесарска-выкладчыцкага складу
(для тых, хто мае мінскую прапіску):

— кафедра канцэртмайстарскага майстэрства *дацэнт 1;*
— кафедра спецыяльнага фартэпіяна *дацэнт 1;*
— кафедра камернага ансамбля *дацэнт 1;*
— кафедра медных духавых і ўдарных інструментаў *дацэнт 0,5; старшы выкладчык 0,5;*
— кафедра баяна і акардэона *прафесар 1.*
— кафедра беларускай музыкі *дацэнт 0,25;*
— кафедра скрыпкі *прафесар 1;*
— кафедра альта, віяланчэлі, кантрабаса *выкладчык 0,5;*
— кафедра струнных народных інструментаў *старшы выкладчык 1;*
— кафедра музычнай педагогікі, гісторыі і тэорыі выканальніцкага мастацтва *дацэнт 1;*
— кафедра аркестравага дырыжыравання *загадчык кафедры 0,5.*

Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання. *Заявы і дакументы накіроўваць на імя рэктара на адрас:* 220030, г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30. *Даведкі па тэлефонах:* 227-49-42; 226-06-70.

ПАМЯЦЬ

"ХАЧУ ЛУНАЦЬ АРЛОМ..."

Да 90-годдзя Валянціна Таўлая

Яго напевам выпаў слаўны лёс:
Набатным звонам прагучаць над краем...
М. Танк. "Памяці тав. Таўлая"

Вядомы беларускі паэт, публіцыст, перакладчык, актыўны дзеяч рэвалюцыйна-вызваленчага руху, антыфашыст і падпольшчык Валянцін Таўлай нарадзіўся 8 лютага 1914 г. у Баранавічах. Першы свой верш ён напісаў яшчэ ў мурах знакамітай Лідскай цытадэлі, дзе месцілася школка, у якой ён навучаўся.

Так сталася, што частка яго паэзіі была звязана з жаўруковымі матывамі — матывамі пакуты, жальбы, тугі:

Капае звонка на сэрца,
на ніву
горкая песня —
сляза жаўрука.

Але часцей уласны лёс, і будучыню свайго народа, яго прагі да волі, свабоды, да разняволення ад рабства самабытны паэт Валянцін Таўлай увасабляў у вобразе арла.

Як адзначыў Фёдар Яфімаў у артыкуле "Насустрач дням і велічным і ясным...", "Калі (...) паглядзець на многія вобразы Таўлая, то простымі іх ніяк не назавеш. Напрыклад, вобраз, які паэт часта выкарыстоўвае, — вобраз чырвонага сцяга ў вершы "Першамайскія сцягі" становіцца не проста сімвалам барацьбы, але і абазначэннем складаных сувязей паміж чалавекам і ідэяй свабоды:

І нас тапталі часта
капыты, —
скажы, таварыш, хто
палічыць паўшых?
А боль, павер, не меншы
быў па тых,
правадырах чырванакрылых
нашых".

Шмат гадоў урыўкамі Валянцін Таўлай працаваў над рукапісам "Аб сябе (спроба глянуць на сваё жыццё)", які так і не паспеў скончыць.

У 1941 годзе ў горадзе Ліда ён піша і друкуе адзін з самых хвалюючых, самых палымяных, самых прарочых вершаў "...Гэта ўсё — знаёмыя шляхі":

Пры юнацтве, што здалёк
звініць,
і арлы садзіліся ахвоча,
часам — каб да лёту
заманіць,
часам — каб выдзёўбваць
вочы.

Але мы, ўлюбіўшыся
насмерць
у шляхі, пракладзеныя
ў заўтра,
навучылі песню разумець,
што ў змаганні і загінуць
варта.

Творчасць Валянціна Таўлая стала важным унёскам у паэтычную скарбонку беларускай літаратуры. Акрамя таго, вершы і паэмы нашага паэта ўвасобіліся ў рускамоўных перакладах Я. Сіманава, Я. Хялемскага, І. Фрэнкеля, П. Сямыніна, Ф. Яфімава, М. Брауна, П. Дружыніна і іншых. А сёння лепшыя творчыя здабыткі В. Таўлая яшчэ чытаюць па-англійску, на армянскай, венгерскай, грузінскай, карэйскай, літоўскай, малдаўскай, польскай, украінскай, французскай мовах.

Міхась МАЛІНОЎСКІ

ЛІМ-АПЫТАННЕ

Нацыянальная дзіцячая літаратура: праблемы і перспектывы...

Уладзімір ЛІПСКІ,
пісьменнік:

— Пакуль жыве чалавецтва, а значыць, будуць жыць і дзеці, будзе жыць і літаратура для дзяцей. Інакш немагчыма ўявіць, як нашы нашчадкі змогуць увайсці ў цывілізаваны свет.

Дзіця не можа паўнакроўна развівацца без кнігі. Гэта даказалі нашы садзікі і школы. І няхай сёння ў іх, дый дома ў некаторых дзяцей з'явіліся электронныя сродкі, кнігу нічым не заменіш. Яна, і толькі яна, можа даць маленькаму чалавеку магчымасць глыбокага пазнання свету, непаўторную асалоду адкрыцця ўсяго новага праз слова. І гэта павінна разумець у першую чаргу дзяржава. Таму я не ўхваляю, а наадварот, перажываю, непакоюся, калі закрываюцца дзяржаўныя дзіцячыя выдавецтвы, часопісы, газеты. Любымі сіламі іх трэба было б утрымаць...

Уладзімір ШАРПІЛА,
дырэктар выдавецтва "Парадокс":

— Беларускія дзіцячыя кніжкі выходзяць, хоць і якасна зробленыя, аднак невялікімі тыражамі. І на вялікі жаль, я, як выдавец, нічога не магу ні вырашыць ні паправіць у гэтай сітуацыі. Пры тым, што ўсе падрыхтоўчыя працэсы, калькуляцыя і каляровы друк што для рускамоўных, што для беларускамоўных кніжак аднолькавы. Аднак жа апошнія атрымліваюцца ў 1,5 разы даражэй, чым кніжачкі на рускай мове. А ўсё таму, што наклад, які рэальна можна прадаць, адносна невялікі. Гэта 5, а часцей 3 тысячы экземпляраў. Тады як рускія — і 10 тысяч, і 100 тысяч.

Так што ў развіцці нацыянальнай дзіцячай літаратуры вялікую ролю адыгрывае эканамічны бок справы. Пры тым, што ў нас сапраўды добрыя паэты, празаікі, якія пішуць цудоўныя казкі, дзіцячыя апавяданні, а выдатныя мастакі шыкоўна афармляюць іхнія кнігі, мы не можам плаціць ні аўтарам ні мастакам ганарараў, якія атрымліваюць іх калегі, што падрыхтавалі ў друк рускую кнігу для дзяцей.

А тое, што мы на Беларусі сёння не можам выдаць танную дзіцячую кнігу — гэта праблема, якая хвалюе і выдаўцоў.

Марыся ВІТКОЎСКАЯ,
гандлярка кніжнага латка:

—Як бачыце, у нас тут розныя кніжкі: і на рускай, і на беларускай мовах. І тыя, і тыя добрыя, прыемна ў рукі браць. Часам падыходзяць старыя і калі купляюць якую кніжку для ўнукаў, дык кажуць, што ў іхнім дзяцінстве такіх прыгожых кніг не было. Аднак якасць выдання значна ўплывае на кошт, да таго ж кнігі — тавар не першай неабходнасці. Але, згадзіцеся, кнігі для дзяцей прасцей прадаць, чым "дарослыя". Ёсць і тоненькія танныя кніжачкі, і кніжкі-расфарбоўкі, — гэтыя заўсёды карысталіся папулярнасцю ў народзе. Але вось беларускіх кніжачак такіх практычна няма, каб там былі вершыкі для самых-самых маленькіх, малюначкі яркія ды каб старонак у той кніжцы 10-12. Самы хадавы тавар, і слова роднае апынулася б у кожнай хаце. Ды, думаю, што дорага выдавецтвам такія выпускаць, а не таму, што няма каму пісаць тыя вясёлыя карацелькі.

Мікалай МІРОНЧЫК,
студэнт:

— Стан дзіцячай літаратуры шмат у чым прадвызначае стан літаратуры агульнацыянальнай. У наш час аб якімсьці пазітыве тут не можа быць і гаворкі — і гэта праблема не толькі Беларусі.

Са з'яўленнем новых забавак — камп'ютэраў, а значыць і камп'ютэрных гульняў, і Інтэрнету — часу на "папяровыя" забаўкі дзіця адводзіць усё менш. Але не існуе невырашальных праблем. І феномен Гары Потэра ёсць таму доказам. Як не пафасна гэта можа гучаць, але ў век татальнай глабалізацыі сваю адметнасць нацыянальнай літаратуры захаваць цяжка. Людзі з самых розных краін вандруюць, сябруюць і ведаюць культуру і традыцыі адно аднаго так добра, як ніколі дагэтуль. Моладзь і дзеці — у першую чаргу.

Як мне падаецца, беларускай дзіцячай літаратуры сёння патрэбны новыя: а) сюжэты, б) героі, в) ідэалы, — ды каб усё гэта было сучасным і адпавядала існуючым у свеце тэндэнцыям. Нешта мы пры гэтым, безумоўна, згубім, але, на маю думку, гэта выдатны шанц прывабіць дзяцей XXI стагоддзя да роднага слова.

Яўген ЛЕЦКА,
пісьменнік:

— Беларуская дзіцячая літаратура — гэта той грунт, без якога ўявіць развіццё мастацкай літаратуры проста немагчыма. Аднак грунт стаў надта хісткім. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова параўнаць выдавецкія тэматычныя планы, скажам, з 1984 па 1994 і пасля. І па назвах, і па тыражах у апошняе дзесяцігоддзе ўсё ідзе ў бок змяншэння. Што ў выніку можа прывесці да катастрофы бездухоўнасці.

Думаю, на сённяшні дзень ніхто грунтоўна не займаецца станам беларускай дзіцячай літаратуры. Даўным-даўно сталі ўжо бібліяграфічнай рэдкасцю кнігі Эсфір Гурэвіч і Маргарыты Яфімавай, прысвечаныя падсумаванню здабыткаў і асэнсаванню тэндэнцый развіцця дзіцячай літаратуры. На жаль, і крытыка кніжак дзіцячай тэматыкі знікла зусім... Ды што казаць, калі "залаты век" беларускай літаратуры, і выдавецтваў у прыватнасці, прамінуў. У свой час працаваў я ў "Мастацкай літаратуры", з гэтага выдавецтва, як дзіця з матчынага ўлоння, аддзяліліся "Юнацтва", і тады выданне дзіцячай і юнацкай літаратуры набыло профільнасць, большую прадуманасць, як у падборы, так і ў прапагандзе дзіцячых кніг. А што мы маем цяпер? Няма ўжо "Юнацтва"; часопіс "Бярозка" на мяжы закрыцця, бібліятэкі не маюць магчымасці рабіць новыя набыткі. І так наша літаратура сохне, як дрэва, падсечанае пад корань...

Падрыхтавала
Вольга МЕШЧАРАКОВА

На Беларусі няма аўтабанаў ці іншых звышхуткасных трас, таму любы шлях пралягае праз маленькія населеныя пункты. Зараз гэта – гарады, пасёлкі гарадскога тыпу ды вёскі. Як і ў кожнай з суседніх краін. Але яшчэ нядаўна сотні такіх паселішчаў выдзяляліся ў асобную, ні да чаго не падобную, катэгорыю населеных пунктаў. То былі старажытныя, толькі Беларусі ўласцівыя мястэчкі.

Паводле "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", мястэчка – гэта "населены пункт, які адрозніваўся ад горада меншай колькасцю насельніцтва, адсутнасцю абарончых збудаванняў, аграрнымі рысамі, ад сяла і вёскі – наяўнасцю гандлю і рамяства як сталых заняткаў часткі жыхароў". І сапраўды, крэпасцяў і замкаў у мястэчках спачатку не было. Але найбольшая адметнасць гэтых паселішчаў у тым, што яны былі менавіта тымі найважнейшымі цэнтрамі, у якіх праходзіла станаўленне беларускага гандлю.

ЛЕГЕНДЫ СІВОЙ ДАЎНІНЫ

Гістарычны "пафас"

На Беларусі мястэчкі актыўна ўзнікаюць з XIV ст. каля месцаў традыцыйных кірмашоў, на бойкіх гандлёвых скрыжаваннях. У XV—XVI стст. на тэрыторыі Беларусі было больш за 200 мястэчкаў.

Пэўны час падаткі ад местачковага гандлю ішлі выключна на карысць казны. Феадалам забаранялася ствараць таргі без дазволу караля ці вялікага князя, праводзіць прыватнаўласніцкія кірмашы бліжэй чым за 3 мілі ад каралеўскіх мястэчкаў. У 1588 г. шляхта дамаглася скасавання абмежаванняў і забароны на будаўніцтва прыватнаўласніцкіх таргоў і мястэчак. І тут пачалося тое, што без перабольшванняў можна назваць беларускай гандлёвай рэвалюцыяй. Жыхары, якія вырашылі сяліцца ў мястэчках, вызваляліся на некалькі гадоў ад натуральных і грашовых падаткаў.

Некаторыя мястэчкі будаваліся каля замкаў ці разам з імі. Многія ўзнікалі каля кляштараў і буйных прыходаў. Як грыбы раслі яны на буйных шляхах і скрыжаваннях дарог, каля перапраў і прыстаней. У абавязкі местачкоўцаў уваходзілі нагляд за дарогамі, будаўніцтва корчмаў і заезных дамоў.

Дарэчы, аб корчмах. Як сведчыць гісторыя, гэтыя ўстановы заўсёды карысталіся вялікім попытам сярод жыхароў беларускіх мястэчак. Напрыклад, у XVI ст. у Крэве на 200 жыхароў было 10 (!) корчмаў. І што цікава, ніводная з іх не пуставала.

У XVI—XVIII стст. у Беларусі было ўжо каля 400 мястэчкаў. Падзяляліся яны паводле прыналежнасці (дзяржаўныя, прыватнаўласніцкія, царкоўныя), ландшафтнай прывязкі... Магнаты і заможныя паны стваралі мястэчкі побач з замкамі, палацамі, сядзібамі. Ва ўзнікненні мястэчкаў пэўную ролю адыгрывала наяўнасць прамысловых і іншых аб'ектаў. Планіровачнай асновай іх забудовы была гандлёвая плошча, якая ўтваралася пашырэннем вуліцы, выкарыстаннем часткі вольнай прасторы паміж паралельнымі вуліцамі, ці на скрыжаванні вуліц, дзе плошча магла фарміравацца рознай формы. На пачатку XIX ст. для шэрагу беларускіх мястэчкаў былі распрацаваны "ўзорныя" архітэктурныя планы. У канцы XIX ст. у мястэчках жылі каля 150 тысяч чалавек.

Аднак, на жаль, лёс мястэчкаў у тыя гады быў незайздросны. У 1920-1939 гадах многія мястэчкі Беларусі пераўтвораны ў гарады і гарадскія пасёлкі, астатнія — у вёскі. У Заходняй Беларусі яны праіснавалі да 1939 г.

У знак падзякі Богу

Першы наш прыпынак робім у такім вось невялічкім мястэчку каля Маладзечна. Здаецца, Беніцы так і засталіся б непрыкметным пунктам на нашым шляху, каб не манументальны будынак, які заўважаеш адразу, набліжаючыся да мястэчка.

Спыніліся. Выходзячы з аўтобуса, дзіву даешся, якім чынам узнік у такой маленькай вёсачцы гэтакі велічэзны храм. Колькі дзён пасля мы пераканаліся ў тым, што такая з'ява на Беларусі звышнатуральная.

Архітэктурны манумент з'яўляецца каталіцкім касцёлам, які ўпершыню быў пабудаваны драўляным яшчэ ў XVI ст. Аднак у 1600-я гады ён згарэў ушчэнт. Гісторыя яго аднаўлення — напалову праўда, напалову легенда. Толькі адна з легенд, якімі багатымі былі беларускія мястэчкі.

...У 1708 годзе кашталян царквы ў Троках (сучасны Тракай на тэрыторыі Літвы) Казімір Коціл са сваёй малой дачкой праязджаў на конях праз гэтыя мясціны. Аднак раптам коні, моцна спалохаўшыся нечага, ірванулі наперад. Нягледзячы на ўсе намаганні, спыніць іх не атрымлівалася. Кашталяна і яго дачку чакала лютая смерць. І тады беднаму святару нічога больш не заставалася, як горача маліцца Богу. Менавіта тады адбыўся цуд — на тым самым месцы, дзе некалі стаяў касцёл, коні спыніліся як укопаныя.

Тады Казімір Коціл вырашыў нанава адбудаваць касцёл у знак падзякі Богу, які выратаваў яго ў смяротны час. Цяпер гістарычны будынак уяўляе сабой крыжападобны храм. (Падмурак храма збудаваны ў форме крыжа). Гонкі касцёл белага колеру абнесены мурам з прыгожай фігурнай брамай.

А праз дарогу, насупраць велізарнага касцёла, знаходзіцца праваслаўная царква сярэдзіны XIX ст. Збудаваная з чырвонага каменя ў стылі позняга ампіру, яна выклікае ўражанне цацкі: быццам дзеля таго, каб падкрэсліць памеры касцёла, царква зусім мініяцюрная.

Добра вучыцца — не забаронена

Баруны — прыгожая і нават трохі паганская назва вельмі цікавага сваімі гістарычнымі помнікамі мястэчка. Дакладна невядома, адкуль гэтая назва пайшла. У народзе кажуць, што ад слова "бор", які некалі густа акаляў мястэчка. Баруны і ёсць наш наступны прыпынак у вандроўцы.

Мы знаходзімся перад комплексам базыльянскай царквы і базыльянскага кляштара. Ён заснаваны ў сярэдзіне XVII ст., а калі дакладней, то ў 1669 годзе, спачатку як драўляны комплекс. І толькі з сярэдзіны XVIII ст. быў перабудаваны як мураваны.

Прыцягвае позірк царква — такая высокая, што шапка з галавы звальваецца. Складаецца яна з асноўнага будынка і фланкіруючай вежы. Выдзяляецца ж царква менавіта тым, што вежа толькі адна, прычым пабудавана яна ў стылі ракако. Чым гэты стыль прыкметны ў вежы? Тым, што яна павернута да вуліцы не фасадам, а менавіта сваёй рабрынай: гэта характэрна для стылю ракако.

На фасадзе ж увесь комплекс замыкаецца вежай-званіцай. Яна была дабудавана толькі ў пачатку XIX ст., таму мае яўныя рысы класіцызму, што надае ёй таямнічы выгляд строгасці.

Дарэчы, у царквы пакутлівая, доўгая гісторыя. Пасля скасавання уніі ў 1839 годзе кляштар быў аддадзены прадстаўнікам праваслаўнай царквы. А ў 1922 годзе польскія ўлады яго перадалі рыма-каталікам.

...Цудоўныя словы напісаў у свой час Францішак Багушэвіч: "Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!" Дык вось, комплекс знакаміты тым, што з 1979 года да 1990 тут служыў ксёндз Ян Матусевіч — ледзь не першы святар на Беларусі, які за савецкім часам, з канца 70-х гадоў пачаў праводзіць службы на беларускай мове.

А ў глыбіні двара знаходзіцца масіўны "Г"-падобны будынак кляштара. Калісьці там быў кляштар базылян. У 1920 годзе ў ім заснавалі беларускую гімназію, якая дзейнічала да 1924 года. Потым з'явіўся інтэрнат мясцовай школы. А праз некаторы час будынак кляштара застаўся зусім безгаспадарчым.

У наш час прыхаджане хочуць забраць комплекс для сябе і зрабіць тут рэабілітацыйны цэнтр для цяжкіх падлеткаў, якіх на Беларусі нямала.

Але самы цікавы помнік мінулых стагоддзяў мястэчка Баруны — каплічка, пабудаваная ў канцы XVIII ст. і асвечаная ў гонар святога Дамініка. Мураваны будыначак зусім маленькі і цесны. Каб патрапіць у каплічку, трэба спусціцца па стромкай лесвіцы амаль пад зямлю. Але ад гэтага будынак не губляе сваёй утульнасці. У свой час ён карыстаўся вялікай папулярнасцю. Ды гэта і не дзіва, калі ўзгадаць, хто такі быў святы Дамінік. А святар гэты з'яўляўся не больш не менш, як апекуном студэнцкай моладзі.

Паўтара стагоддзя таму праз Баруны ішоў шлях з іншых рэгіёнаў Беларусі да Вільні. У XVIII ст., а таксама ў першай палове XIX ст., калі квітнеў Віленскі універсітэт, бясконцая плынь студэнтаў праходзіла праз мястэчка, і кожны з іх па існуючай традыцыі заходзіў у каплічку: студэнты, пасля вакацый трымаўшыя шлях ва універсітэт, заўсёды маліліся, каб Бог дапамагаў ім у далейшай вучобе.

Зусім нядрэнная традыцыя, дазвольце адзначыць! І няма нічога незвычайнага ў тым, што нават і цяпер, у наш час, студэнты завітваюць у цудоўную каплічку. А як жа? Усім, вядома, хочацца вучыцца добра.

Сяргей МУРАЎСКІ,
Мікалай АНІШЧАНКА

ФОТА АЎТАРАЎ

Рыгор СЕМАШКЕВІЧ:

"Каханне — паняцце перш за ўсё маральнае. Сама сутнасць людзей у многім выяўляецца і па адносінах да кахання.

Калі пра яго сказана ярка і арыгінальна, межы падзелу вершаў на грамадзянскія і інтымныя робяцца штучнымі. Гэта проста добрыя вершы."

Ніл ГІЛЕВІЧ. *"...І плямы на табе няма"* (лірычны раман; Мінск, выд-ва "Тэхналогія", 2003г., рэдактар А.Зьмітровіч, 300 паас., 30 стар., кошт 1640).

Во, кажу сябру, накаркаў я! Не паспела й фарба друкарская на тым "ЛіМе" абсохнуць, дзе я на **адлуп** *напрошваўся*, як з-за вугла *памяркоўныя* людзі і ўдарылі. Што ж, спачувае сябра: на ўсё воля Божая. Для каго Божая, кажу яму, а для мяне — *Воля Народная*...

З іншага боку трэба толькі па-дзякаваць рэдактару апазіцыйнай газеты, што "герої" ЛеГалІЗАЦЫІ нарэшце знайшлі адпаведную сабе грамадскую трыбуну для актыўнай літаратурнай дзейнасці, заадно пашыраючы розгалас і пра маю сціплую працу.

Вельмі перапрашаю ў Ніла Сымонавіча за такое змушанае адступленне... ад тэмы. Таму ад *"вычварнага"* пяройдзем да *прыгожага*. Заўтра — дзень святога Валянціна, дзень усіх закаханых. Хто б мог падумаць, што каханне пачнецца з манаства... Зрэшты, а чаму — не? Менавіта ж гэтае пачуццё найбольш інтымнае, асабістае і патаемнае.

Любоў — трохі іншае, *большае (і цяжэйшае)*, аднаму непасільнае...

Паэт Ніл Гілевіч сваёй манументальнай постаццю на першы погляд выглядае на верхавода, ваяра ці трыбуна. Ды бывае ў такіх *грамадных* людзей якраз і выяўляецца светлая душа і сентыментальнае сэрца...

Любоў да Айчыны і яе мацярынскай мовы пачалася ў яго з любові да бацькоў, да беларускіх людзей агулам, а пасля і да канкрэтнага, адзінага чалавека. Каханне ж сталася паэзіяй, што паўсюль суправаджала тую любоў... Наогул, усе лепшыя творы Ніла Гілевіча заснаваныя менавіта на фундаменце "любові да бліжняга". Гэта я і меў на ўвазе, калі аднойчы пісаў у "ЛіМе", што *"асабіста для мяне значнасць творчага плёну Ніла Гілевіча ляжыць у іншай плоскасці яго таленту"*.

Смутак гонячы прэч,
Веру з новаю сілай:
Хлыне ў сэрца вясна,
Смутак гонячы прэч!
І што тысяча стрэч
За гады не зрабіла —
Зробіць ростань адна
Пасля тысячы стрэч.

Яна яшчэ заспела наноў *перачытаць* гэты яго "лірычны раман", хоць вызнала яго прызнанні ў любові задоўга да таго, як яны былі зарыфмаваныя. Думаю, што многія грахі за такую любоў Богам прабачаюцца. Бо, як вядома з Бібліі, і Сам Бог "ёсць любоў". Зборнік уражвае той мужчынскай шчырасцю і *душэўнай жарсцю*, на якую нашы паэты (і маладыя ў тым ліку) рэдка адважваюцца, бо не заўсёды маюць *права голасу*. Звыш на падобныя *адкрыцці*. Сапраўдную Любоў трэба заслужыць, выкарміўшы Яе ўласнай крывёю...

На вялікі жаль, гэтая "кніжка небольшая" стала не толькі падарункам **Ёй**, але і своеасаблівым *вянком* на **Яе** магілу...

Толькі Чалавек (Мужчына) вялікай душы і высакароднага сэрца мог напісаць напрыканцы *прызнання* такія радкі:

Вось і ў табе ўжо
Бачу адно дабрыню,
Ціхасць і стому.
Як моцна цяпер ты мне
Напамінаеш маму!

Што можа Паэт дадаць да **гэтага**, апроч як сябе самога...

Соф'я ШАХ. *"На ўсё дабро ў адказ"* (вянкі санетаў; Мінск, выд-ва "Мастацкая літаратура", 2003г., рэдактар К.Жук, 1000 экз., 140 стар., кошт 5040).

Ізяслаў КАТЛЯРОЎ. *"Земля простит, но не прощает небо"* (вянок вянкоў санетаў; Мінск, выд-ва "Беларускі кнігазбор", 2001г., у аўтарскай рэдакцыі, 750 экз., кошт 520).

А вось паэты, муж з жонкаю Ізяслаў Катляроў і Соф'я Шах, дзякаваць Богу, жывуць сабе разам, пажываюць і, спадзяюся, дабро нажываюць. Не рыфмамі, не імі сёння дабро нажываецца. Хоць, хто ведае, *"как наше слово отзовется"*...

Праўда, жывуць нашы паэты ў Светлагорску (па чутках, не самым цудоў-ным горадзе краіны). Ды, відаць, талент іх таму там і запатрабаваны, каб ураўнаважыць хісткасць Дабра і Зла. Творчасць Соф'і Шах я ведаю даўно і да пэўнага часу шчыра захапляўся яе паэзіяй. Ізяслава Катлярова таксама чытаў. Як на маю думку, гэта адзін з лепшых нашых рускамоўных паэтаў. Не ведаю, што *найшло* ў постперабудоўчую пару на гэтую цудоўную літаратурную пару... Захапіліся яны форматворчасцю. Прычым захапіліся свядома і, як мне здаецца, нават мэтаскіравана. Форматворчасць жа запатрабавала ад паэтаў арыфметычнага мыслення і геаметрычных уяўленняў. Форма стала кіраваць зместам. Тады як змест павінен выяўляцца ў адпаведнай *яму* форме. Чалавек стварае мастацкі твор, а той ужо *ставіць* яго перад фактам формы, у якой ён можа найлепш захоўвацца альбо інтрыгаваць і цешыць чытацкае вока ці пашыраць яго асацыятыўнае ўяўленне. (Скажам, у форме таго ж санета.)

У горшым варыянце паэт сам даводзіць створанае да абранай ім формы. А калі чалавек адразу ж *задаецца мэтай напісаць* менавіта санет, то найчасцей у выніку аказваецца перад фактам пасрэднага верша... Бываюць, вядома, і *"божественные"* выключэнні, скажам, як у Пятраркі...

Адным словам, напісалі паэты са Светлагорска цэлыя кніжкі санетаў і нават вянкі вянкоў санетаў. Памятаю, як калісьці захапляўся на радзе СП нябожчык С.Грахоўскі, калі даведаўся, што Змітрок Марозаў напісаў *вянок вянкоў санетаў!* Самы першы ў Беларусі, а мо і ў Еўропе! Што ж, тут мы можам быць наперадзе не толькі Еўропы, але і Амерыкі, бо навошта ім столькі вянкоў вянкоў санетаў?! Хопіць і аднаго, але адмысловага...

Гэтым я абсалютна не хачу сказаць, што санеты І.Катлярова ці С.Шах *зробленыя* непрафесійна. Якраз наадварот. Але ў тым і палягае творчая бяда паэтаў. Спадзяюся, часовая.

У гэтым доўг, удзячнасць і раскоша,
раскоша Вас вянкамі акружыць, —

настойліва даводзіць мне С.Шах. А я прашу: досыць. Вунь якое высокае цаліннае поле Паэзіі ў нас над галавой, дзе "не адзін паэт сканаў" і *ўвекавечыўся*...

А раздумаешся, дык абсалютна праў І.Катляроў, напісаўшы напрыканцы сваёй кніжкі — *"Не дай, Господь, прожить мне жизнь чужую// и собственною смертью умереть!"* — словы, што папярэднічаюць працытаваным:

Покажется — нет смысла говорить
словами и сегодня дорогими.
И некого, и не за что винить, —
все сказано давным-давно другими.

Што ж, давайце тады шукаць новыя (*нядругасныя*) словы, ажыўляць іх сваім сённяшнім жыццёвым зместам і чалавечным вопытам, якія ў сваю чаргу запатрабуюць ад нас адпаведных часу выразных і адэкватных яму формаў.

Але, каб дарэшты не парушаць святочнасці дня Валянціна, не магу не працытаваць радкі, што ўшаноўваюць Любоў з санетаў С.Шах, звернутыя, вядома ж, да свайго Каханага:

"Вы"... "Ваша"... "Вам"... Імкне да гуку гук
адказна, пранікнёна, без прынук —
і ўжо гучаць ім дзесьці й за вякамі.
Скажу, што ўжо казала, і не раз:
як ні даймае час, а каля Вас
сябе я адчуваю нібы ў храме.
Дай Божа і надалей...

Наталля КУЧМЕЛЬ. *"Літаратурны квартал"* (нізка лірычных вершаў у калектыўным зборніку; Мінск, РВУ "Літаратура і мастацтва", 2003г., рэдактар В.Шніп, 1000 экз., 130 стар.)

Наталля Кучмель ужо мае сваё паэтычнае імя, хоць і не мае пакуль ніводнай уласнай кніжкі. Што зробіш: адным *даюцца* кніжкі, другім — толькі *талент*... Пражыць з такім талентам сорак гадоў у творчай адзіноце і не аказацца на ўзбочыне жыцця не кожнаму ўдаецца. Ёй удалося. Тактоўна прамаўчу, якіх высілкаў чалавечай (і жаночай) волі *тое* каштавала...

Толькі глухі сэрцам не адчуе мужнай скрухі ў голасе жанчыны, чытаючы гэтыя радкі Н.Кучмель з яе "Песні", са старажытным прыдыханнем вышаптанай з аднаго канца зямнога часу ў другі:

Каханы мой вячэраў у доме маім, у сціплым і бедным пакоі; і не зайздросціла я гаспадыні маёй у пышных яе палацах.

Валасы твае пахнуць ветрам, цела тваё пахне хлебам, семя тваё пахне горкай травой палявой.
Сонца ўзыходзіць — залоціць шаты соснаў ды кіпарысаў; сонца сыходзіць — ты са мной застаешся.
Валасы твае пахнуць ветрам, цела тваё пахне хлебам, семя тваё пахне горкай травой палявой.

Моцная класічна-хрэстаматыйная манера, мужчынскі цвёрды стыль пісьма і непераказальнае ўнутранае жаночае таемства — вось асновы паэтыкі Н.Кучмель. Багдановічава цнатлівасць "чыстай красы", ахматаўскія яснасць і самапавага ды валошынскі элінізм фармавалі і скіроўвалі яе ўласны адмысловы талент: *"Так рэчаіснасць пакутліва ловіцца ў вершы: жыццё там б'ецца..."* Скажыце, ці часта вам даводзілася чытаць у сучаснай беларускай паэзіі і мужчынскай у тым ліку такое?

Зямля, дзе мяжуюць глыжы і бадылле
З крыжамі;
Дзе ржавыя косткі змяшаны з жалезам
Іржавым;
І ўсё гэта сплёты здзічэлых малінаў
Хаваюць ад свету...
Калі Бог і праўда зляпіў мяне з гліны —
То з гэтай.

І гэта — непадробная мастацкая праўда. За якой — сам Паэт. Наталля Кучмель. Каб у чытачоў не склалася аднабаковага ўяўлення пра *суровасць* творчай манеры Н.Кучмель, працытую і вось гэтыя радкі з яе цудоўнага *паэтычнага ткацтва*:

Стосам блытаных ліній,
Быццам ніці з асновы, —
Залатое на сінім
Голле ў вечар вясновы.
І ў дрыготкіх глыбінях
Шэрых воч тваіх — тое:
Залатое на сінім.
Залатое на сінім.
Залатое...

Шаноўныя чытачы, усе гэтыя кніжкі вы можаце набыць у "КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА", (Мінск, вул.Казлова, 2).

ЛіМ

Выходзіць з 1932 ГОДА
У 1982 годзе ўзнагароджаны ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:

Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Леанід ГАЛУБОВІЧ,
Віктар КАВАЛЁЎ,
Вольга КУРТАНІЧ,
Віктар ПАТАПЕНКА — намеснік галоўнага рэдактара,
Віктар ШНІП — адказны сакратар.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19
ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-6673
намеснік галоўнага рэдактара — 284-4404
адказны сакратар — 284-6673

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-7965
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-7965
літаратурнага жыцця — 284-7965
крытыкі і бібліяграфіі — 284-7965
паэзіі і прозы — 284-7965
музыкі — 284-8153
тэатра, кіно — 284-8153
выяўленчага мастацтва — 284-8153
карэктарская — 284-8091
бухгалтэрыя — 284-6672
Тэл./факс — 284-84-61

Электронны адрас:
e-mail: minsk@lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 1650
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 11.02.2004 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715

Заказ 253
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12